ГАЛЕРЭЯ

Ігар Бабкоў

ХВІЛІНКА

ДРУГАЯ КНІГА

Логвінаў

ISBN 978-609-8147-92-6

ФРАНЦІШАК:
СЛОВЫ ЗА ВАКНОМ

1.

Як дзіўна, што ў тэатры свету так многа актораў, — падумаў Францішак прачнуўшыся.

Напэўна, было б дастаткова аднаго-адзінага, з вар'яцкім маналогам пра нелагічнасць і незразумеласць усяго, што ёсць. Чалавека, які б паміраў і зноў нараджаўся на сцэне, выходзіў у чарговай дзеі, не памятаючы пра мінулае. У новай вопратцы, з новым тварам і нават у новай эпосе.

Публіка складалася б выключна з Багоў і Герояў.

Багі, адказныя за ўсё, старыя і неўміручыя, стомленыя, прысуджаныя *Кімсьці* глядзець штодня гэты бясконцы і бессэнсоўны спектакль, уваходзяць у залу і займаюць цэнтральныя мейсцы.

Горды Тод, злобны і помслівы Яхвэ, аброслы тванню, з балотным пахам Велес. Кецалькоатль з налітымі крывёю вачыма. Хітры і абачлівы Гермес. Рэшта.

Героям дастаецца галёрка: Гільгамеш, Хрыстос, Крыве-Крывейтэ, прынц Гаўтама.

Актор выходзіць на сцэну, аглядаецца. Напачатку ў радасным здзіўленні, потым у разгубленасці.

Спрабуе ўцячы назад, але дзверы зачыненыя.

Толькі сцэна, асветленая, пустая. Бязлітасна пустая.

Трэба граць у спектаклі, сэнс якога ад цябе схаваны. Назва, праўда, аддрукаваная на праграмцы вялікімі літарамі, і дублёраў, як гразі.

Багі сядзяць важна і маўкліва.

Іншая рэч — героі.

Яны махаюць рукамі, падказваюць, амаль крычаць. Кожны штосьці ведае. Пра жыццё. Пра абсалют. Пра свядомасць. Пра ўваходы і выхады. Пра любоў, да блізкага і далёкага. Пра эйдасы.

І кожны хоча пакінуць гэта як падарунак, *для ўсіх*.

Шкада, што актор заўсёды глухаваты, запісаў Францішак звычайным сінім колерам.

Хаця ягоная глухата яго і ратуе.

Цяжка сабе ўявіць, што было б, калі б мы сапраўды *ўсё гэта пачулі*.

* * *

З такімі думкамі пачынаць дзень у Вільні было небяспечна. Можна канчаткова адарвацца ад рэчаіснасці.

З іншага боку, Францішак і любіў Вільню за магчымасць адарвацца. За адлегласці.

Тут сніліся *іншыя сны*. Яны існавалі самі па сабе, так, нібыта іх сніў хтосьці іншы. Альбо яны самі сябе снілі, а ён толькі прысутнічаў побач, як сведка. З другога жыцця.

І яшчэ адно.

Ён адчуваў у снах штосьці важнае, зусім блізка.

Як быццам там была таямніца. Якую ён мусіў прыняць. У якую мусіў паверыць.

І ўсё, што адбываецца, — толькі пачатак расповеду. Выпрабаванне. Як у чарадзейнай казцы, калі галоўны

герой адпраўляецца ў падарожжа, дзе павінна знайсціся тое, што надасць сэнс яго гісторыі.

Там, у снах, ён быў блізка, здавалася, яшчэ крыху — і пазл складзецца. Яшчэ адзін крок, яшчэ адзін паварот лёсу.

З жалем — звычайна з жалем — напрыканцы ён пакідаў гэтыя намаганні і прачынаўся.

Пасля абуджэння заставалася пачуццё незавершанасці і жаданне паспрабаваць яшчэ раз. Пакуль душ канчаткова не вяртаў яго ў гэтую рэальнасць.

* * *

Далей мусіў быць звыклы рытуал, адшліфаваны гадамі. Кава, ранішняя медытацыя. Чытанне, праца з тэкстамі, дзённік.

Трэба было дапісаць эсэ ў зборнік *Пра меланхолію канца свету*: ён паабяцаў Лаяшу ў іх апошнюю сустрэчу. Да дэдлайну заставалася некалькі тыдняў, а ў яго была толькі жменька фрагментаў, кожны з якіх ішоў у сваім кірунку.

Канешне, можна было ўзяць штосьці са старога: усе тэксты нядаўняга часу так альбо інакш пасавалі, былі *меланхалічнымі*. Але ён прадчуваў новыя павароты і новую эмоцыю. Якая магла сабраць усё ў адно.

Да таго ж з’явілася назва: *Словы на вакне* — і ўжо не адпускала. Ейтс напісаў п’есу з такой назвай: пра смерць Свіфта, вяртанне духаў і каханне Стэлы. Там былі словы верша, выдрапаныя на ваконнай шыбе. Верш пра барвовы плашч, у які можна захінуцца, каб схавацца ад скраю.

Адсюль можна пачынаць і ісці далей сваім рытмам. Сваёй музыкай. Ён крыху хваляваўся, каб не су-

рочыць, не нашаманіць чагосьці *нятога*. Усім вядома: як запісана, так і адбудзецца, трэба вельмі асцярожна выбіраць словы і метафары.

Зрэшты, гэта словы і метафары яго выбіралі. І тут ужо нічога не зробіш. Можна было толькі ўслухоўвацца і даваць дарогу. Ён перагледзеў апошнія абзацы, што занатаваліся ўчора ў сутонні, непадалёк ад базыльянаў.

Пра пустату нябёсаў, бытнае вакол нас. Пра сэрца, якое вядзе наперад, праз лабірынты і аблокі.

Словы былі занадта высокія. І безадказныя. Яны мелі сэнс толькі там, у сутонні, сярод маўклівых старых камянёў.

А ягоны канец свету мусіў быць просты і пяшчотны, як перагорнутая бачына кнігі. Як быццам недзе тут, зусім блізка, ёсць дзверы. І за гэтымі дзвярыма пачынаецца зусім іншае. Не прарокі і не настаўнікі, а сам свет сведчыць і падыходзіць да свайго скраю. Туды, дзе ўжо не свет, але ўсё яшчэ святло. Гаючае святло — і музыка.

* * *

Скрухі было зашмат апошнім часам. Перасыхалі крыніцы. Наваколле станавілася ўсё больш плыткім, больш бессэнсоўным. Час павялічваў тэмп, пераўтвараўся ў віхуру. Засмоктваў, бязлітасна і незваротна.

А яшчэ благія весткі з Усходу: яны там пажыралі апошнія крыхі кармы. Яны відавочна рыхтаваліся да вайны, *подлай вайны*. Няясна было толькі, адкуль усё пачнецца. І чым скончыцца.

Трэба было спяшацца. Быць пільным. І ўважлівым.

Углядацца, унутр і навонкі. Паляваць на сэнсы. Верыць, што скрай — не толькі страх і трывога, але і спадзеў.

Зрэшты, усё складалася як трэба. Ужо прадчувалася разуменне. Намацвала свае сцежкі вера. І Вільня была ўласцівым мейсцам, каб усё ўбачыць.

Заставалася зусім няшмат. Дачакацца, калі раптоўна, на празрыстым шкле (свядомасці?! свету?!) пачнуць праяўляцца словы.

Ён ужо не быў такім наіўным, каб лічыць, што гэта ён іх прыдумаў.

* * *

Ён ніколі не пісаў па плане: не было анічога больш чужога і далёкага, чым распрацоўка тэмы, пошук ідэяў і метафараў, рытарычных фігураў і лагічных паваротаў.

Усё пачыналася з незразумелай трывогі, непакою. Які паўставаў у глыбіні ягонай істоты. І пачынаў шукаць дарогу навонкі.

Потым прыходзілі словы. Самі, як быццам зніадкуль. Часам з няўцямным рытмам. Трэба было ўважліва слухаць, каб зразумець, што і куды непакоіцца. Адпусціць свой розум, сцішыцца, даць мейсца.

І далей проста сачыць за тым, як яны складаюцца і што гавораць. Спыняцца, заціхаць разам з імі, на тыдні і месяцы. Пакуль не пачнуць складацца ўзоры.

Тады, на самым пачатку, ён пастанавіў для сябе не спяшацца. Некаторыя ўрыўкі чакалі свайго часу гадамі. Нават дзесяцігоддзямі.

Фрагменты думак, пачаткі эсэ, радочкі вершаў. І, дзіўная рэч, іх незавершанасць не лякала і не раздражняла. Яна была важнай.

Не толькі таму, што вяла наперад, патрабавала будучыні. Яна трымала адкрытай і мінуўшчыну. Як засечкі на дрэвах, па якіх можна было прыгадаць маршрут, вярнуцца ў пражытую эпоху.

Не прастора, а час ёсць нашым сапраўдным домам, — запісаў ён калісьці даўно, за стойкай аднаго менскага бістро. Час, у якім мы былі і адбыліся. Мілы прытулак, пяшчотны і эфемерны.

Тады, праўда, усё было наперадзе.

* * *

Словы на ваконнай шыбе: яны паўставалі напрыканцы п’есы пра напаўзвар’яцелага Свіфта. Самотнага і разбітага, без суразмоўцы ў сваёй эпосе. З дзвюма закаханымі ў яго кабетамі. Ванэсай і Стэлай.

Гэта Ванэсе ён чытаў Плутарха, каб выбудаваць Рым у яе галаве. І блукаць па ягоных вулках. Штодня, восем год. Ванэса ўцякла першая. Разам з Рымам.

Стэла паабяцала быць да канца. І пакрыць яго прыгожым пурпуровым плашчом героя. Яна стрымала слова. Была да канца. Да сваёй смерці — яна сышла першая, і плашч героя застаўся вісець у шафе.

Ейтс расказвае гэтую гісторыю голасам самога Свіфта.

Шэсць удзельнікаў на спірытычным сеансе ў старой ірландскай сядзібе. Медыум. Неспакойны дух, які ўсіх перапыняе, каб дагаварыць, сказаць самае важнае.

І верш, выдрапаны на сэрцы.

* * *

Што за духі бяруць слова за нас, нашымі галасамі? — запісаў ён у нататніку. Хто гаварыў голасам Ейтса? Рыльке? Іншых шаманаў?

І хто мы насамрэч: словы, што застаюцца на ваконнай шыбе, ці празрыстае шкло, праз якое хтосьці глядзіць на зменлівы калейдаскоп свету?

Сupераджывае, часам падказвае. Цешыцца, як дзіця, калі мы патрапляем. Калі мы верныя плану, як напісала сястра Эмілі.

Калі паўстае Рым у нашых галовах.

Рым. Альбо Вільня. Альбо Новы Свержань.

2.

Ён памятаў, з чаго ўсё пачалося.

Гэта было вельмі даўно. Ён выправіўся на вучобу. У старую сталіцу. Былой імперыі. Змрочную, занядбаную, але ўсё яшчэ прывабную. Выйшаў з цягніка проста ў дождж, у халодны і шэры горад, раптоўна зразумеў, што няма куды прыйсці, што ніхто нікога не чакае, і адразу перапалохаўся, пабег званіць дадому, проста каб пачуць знаёмыя галасы.

Але далей усё наладзілася. Далі інтэрнат зусім недалёка ад цэнтру. Бацькі на ўсялякі выпадак дамовіліся пра пакойчык у добрых знаёмых.

Пачаліся лекцыі, з’явіліся новыя сябры. Урэшце ён запісаўся ў бібліятэку. Гэта было тое, пра што ён марыў, што прадчуваў. Залы са старымі кнігамі ў прыгожых шурпатых вокладках. Мудрасць мусіла быць недзе тут, на гэтых старонках. Мудрасць, і сэнс, і ідэі.

Здавалася, гэта цалкам магчыма. Столькі людзей пражылі свае жыцці і пакінулі сляды. Сведчанні, апісанні маршрутаў. Для тых, хто прыйдзе пасля, і здзівіцца, і будзе шукаць.

Ён паабяцаў сабе, што вернецца дадому, толькі калі штосьці знойдзе. Быў адзін з лепшых: і ў школе, і на курсе. Залаты медаль, першыя сесіі на «выдатна».

Дадатковыя заняткі па каліграфіі, гадзіны і гадзіны ў лінгафонным.

А яшчэ філасофія, якую ён для сябе адкрыў, і літаратура.

Усё тады давалася лёгка, без напругі. Як быццам ён ведаў гэта раней і цяпер толькі прыгадваў. Яго першая курсавая выклікала фурор, па чутках, сам прафесар Лісовіч ім зацікавіўся.

Узорны пачатак.

А потым усё змянілася. І ён вярнуўся. У маленькую хатку пад Менскам, што засталася ад бабулі. Непадалёк ад чыгункі, сярод рэдкага сасонніку. І далей адно ўрастаў у гэты сасоннік, пускаў карані, не дазваляючы сабе адыходзіць надта далёка ў часе і прасторы.

Тады яму здавалася, што ён вярнуўся да сябе. Але цяпер, праз амаль дваццаць гадоў, ён ужо не быў такі ўпэўнены.

* * *

Усё тады складалася занадта хутка. І правільна. І ён спужаўся. Што свет праглыне яго. Знойдзе яму мейсца, пакарыстаецца. І далей проста пакіне, як адпрацаваны матэрыял, на сметніцы часу.

Ён адчуў раптоўную стому і расчараванне. Яму здавалася, што ён ужо амаль усё разумее. І самога сябе, і тое, што навокал. І галоўнае — будучыню, якая адкрылася і яго чакала.

А тут ён нібыта прачнуўся. Убачыў усё *з таго боку*.

* * *

Было, канешне, і іншае: першае каханне, што здарылася раптоўна, перад сесіяй.

Яны пазнаёміліся ў бібліятэцы, у рэдкай кнізе. Яна папрасіла Ніцшэ, дарэвалюцыйнае выданне. Ёй адмовілі, сказалі, што патрэбны ліст з факультэта.

А ён толькі-толькі атрымаў ад сяброў зачытаны ксеракс *Заратустры*.

Яго папярэдзілі і пра антысавецкую прапаганду, і пра незнаёмых. Але ж светлыя кудзеркі, пастава, а яшчэ акуляры, якія яна надзявала, калі хацела здавацца сур'ёзнай, яны ёй страшна пасавалі і выклікалі давер і жаданне быць побач.

І ён рашыўся. Падышоў і проста сказаў, што з радасцю дапаможа. І каб яна не думала, што ён да яе клеіцца.

Клейся на здароўе, дурненькі, сказала яна. Працягнуўшы руку для знаёмства.

* * *

Л. была дачкой аднаго з важных, якую даслалі вучыцца ў старую сталіцу, далей ад спакусаў.

Дарэмна. Яна сама была спакушальніцай, і пра гэта ведала. Яна была ў яго першай. І гэта яна яго выбрала.

Л. жыла ў самым цэнтры, у сваякоў, ездзіла па горадзе на старэнькай *Пабедзе*. Пафарбаванай у жоўты колер, з ружовымі сардэчкамі.

Здымала з сяброўкай двухпакаёўку, для заняткаў, як яна сказала, калі яны толькі пазнаёміліся. Што за заняткі, не ўдакладнялася, але бутэлькі з-пад шампанскага, што стаялі на кухні, гаварылі самі за сябе.

Калі ён упершыню зазірнуў да яе на гарбатку, яму здалося, што ён патрапіў у іншы свет. Кружэлкі, якіх не было ў крамах, кнігі, пра якія ён толькі чуў. Часопісы з фотаздымкамі, вопратка, як у замежных фільмах.

Але не гэта было галоўным.

У яе пакоі быў ложак. А сяброўка насамрэч прыходзіла раз на тыдзень, па суботах.

Першы раз вяла рэй яна, атрымоўваючы асалоду ад яго радасці і здзіўлення, але ўжо з трэцяга ён узяў ініцыятыву ў свае рукі.

Ён тады амаль на месяц выпаў з рэальнасці, сядзеў на парах не слухаючы і не канспектуючы, увесь у салодкіх мроях пра яе цела.

Яна відавочна з ім гулялася, і ён раўнаваў, упершыню ў жыцці. Пра яе хадзілі розныя чуткі, знаёмыя аказваліся былымі каханкамі, але яна прасіла быць цярплівым і нікому не верыць. Да таго ж сказала, што зусім не збіраецца быць ягонай жонкай, гэтага няма ў праграме.

Сказала таксама, што ён занадта складаны для *героя нашага часу*.

* * *

Яшчэ яго пачалі вербаваць, і гэта было зусім прыкра. Выклікалі ў першы аддзел, пачалі з кампліментаў. Сказалі пра здольнасці, пра перспектывы. Намякнулі, што ўсё ведаюць пра ягоны раман з Л., пра ксераксы, і што, калі ён будзе сябе паводзіць правільна, перад ім адкрыецца вялікая і светлая будучыня.

Магчыма, пасля абароны дыплома яму прапануюць працягнуць навучанне на іх курсах. Ім патрэбныя такія спецыялісты. Але пакуль трэба пачынаць з больш сціплых формаў работы.

Ён быў тады ў разгубленасці і паскардзіўся Л. Сказаў, што не чакаў, што рэчаіснасць будзе ацэньваць яго так нізка. І што зусім не збіраецца быць стукачом. Якія б выгоды ў будучыні гэта ні абяцала.

Але тая толькі пасмяялася. Дурань, сказала яна, стукачы працуюць на велазаводзе, а табе прапануюць стаць часткай эліты. Якой можна ўсё. Нават парушаць правілы.

Усе так пачынаюць. Гэта проста гульня. Пагаджайся.

* * *

Тады ён упершыню пачуў гэты голас. Недзе зусім блізка. Поруч. Ён назваў гэта для сябе шэптам даймона.

Ён паехаў дадому, здаваць у бібліятэку Блэйка, амаль хворы.

Штосьці балела ўнутры, у цягніку яму сніліся кашмары, ён плакаў і крычаў ува сне.

Ён ведаў, што ўжо не вернецца. Гэта быў не ягоны лёс. Не ягонае жыццё.

А яшчэ Блэйк.

Чамусьці менавіта развітанне са старой кнігай было для яго найбольш балючым. Ён знайшоў яе ў абласной бібліятэцы, яшчэ ў школе. Вучыў па ёй ангельскую мову.

Ён лічыў, што пра яе забылі, і калі прыгадаюць, можна будзе сказаць, што яна згубілася, і прапанаваць замену.

Але бібліятэка заўпарцілася, пагражала судом, і гэта яго дабіла канчаткова. Была спакуса кінуць усё і паехаць туды, дзе цябе ніхто не ведае. І распачаць там іншае жыццё.

Ісці супроць было самагубствам. І ўсё ж ён вырашыў не здавацца.

* * *

Псіхатэрапеўт з дыспансера даў яму даведку пра *переутомление от учёбы*. Доктар быў добрым знаёмым бацькоў і сам прыдумаў легенду. Так, каб было бяспечна і дазваляла цягнуць час.

Назад ён ужо не вярнуўся.

Дакладней, вярнуўся праз год, каб забраць дакументы.

Па факультэце хадзілі чуткі. Пра нешчаслівае каханне, пра дыспансер. Усё спісалі на Л., дзяўчына давяла хлопца да вар'яцтва, вось вам навука, дурні, будзьце абачлівыя.

Яго шкадавалі і абяцалі дапамогу.

Зрэшты, гэта не было хлуснёй. Ён сапраўды адчуваў страшэнную стому. Але не ад вучобы. І не ад разбітага кахання.

Гэта была стома ад рэальнасці.

* * *

На паўгода ён завіс у няпэўнасці. Жыў у сяброў, спрабаваў знайсці сабе працу. Потым паехаў да бацькоў, у жахлівай дэпрэсіі, якая ўзмацнялася з кожным тыднем.

Свяціла два гады войска, з якім яму было *не па дарозе*. Зноў звярнуліся да старога знаёмага. Гэта было значна больш сур'ёзна. Разглядалі розныя варыянты. Урэшце ён лёг на *абследаванне*. Ужо не ў дыспансер, а ў бальніцу. У дурку. Выйшаў праз два месяцы з даведкай. І ў яшчэ большай разгубленасці.

Маці плакала і гаварыла, што ён хавае сябе пры жыцці. Сваякі шукалі магчымасці, каб выправіць сітуацыю.

Тады, нечакана для ўсіх, ён з’ехаў яшчэ раз. У вясковую хатку пад Менскам, што засталася ад бабулі і паціху занепадала.

Першыя месяцы пасля пераезду было адчуванне неверагоднага шчасця. Як у дзяцінстве. Калі ты схаваўся, занурыўшыся ў далёкі-далёкі куточак, і ўсе пра цябе нібыта забылі. І толькі ты разумееш: я ёсць, я тут, знайдзіце мяне, калі ласка!

Яму было патрэбна крыху дзіцячага шчасця пасля ўсіх дэпрэсіяў і развітанняў. Ён тады адляжаўся, адхэкаўся. І пайшоў далей, іншай сцежкай.

Уладкаваўся на палову стаўкі ў краязнаўчы музей у суседнім мястэчку. Даздаў некаторыя прадметы, перавёўся на трэці курс філасофіі, завочнае аддзяленне.

* * *

Пад канец года сітуацыя сапраўды выправілася. Толькі не так, як усе чакалі.

Ён зразумеў, што адбылося, значна пазней.

Тады ж ён стаміўся ўсім усё тлумачыць і ад усіх адбівацца. Зрэшты, стаміўся ад сябе самога. І вырашыў павесяліцца.

Запрасіў сяброў на ўлазіны. Склаў спіс, пераваніў, адправіў паштоўкі. Набыў скрыню агдама. Усё памыў, пачысціў. Зрабіў лаўкі, паставіў вялікі стол проста сярод сасонніку.

Падрыхтаваўся, адным словам.

І з першым жа келіхам абвясціў, што гэта зусім не ўлазіны. А яго ўласнае пахаванне, якое мусіць прайсці

максімальна весела. І што палохацца зусім не варта, бо ў гэтай краіне менавіта мёртвыя *жывей за ўсіх жывых*.

Усе напружыліся. Большасць ужо ведала пра бальніцу. А тост пра мёртвых цягнуў яшчэ і на антысавецкую агітацыю. Калі так будзе працягвацца, канец мусіў быць у навінках альбо ў міліцэйскім пастарунку.

Але Францішак не працягнуў тэму. Ён быў вясёлы і пазітыўны. Да таго ж агдам хутка зрабіў сваю справу, і праз паўгадзіны ў салодкім хмелі ўсе расслабіліся. Смяяліся, жартавалі, думалі, каго будзем хаваць наступным.

* * *

Ён тады сапраўды пахаваў сябе. І нарадзіўся зноў. Другі раз.

Той, хто быў раней, быў толькі адбіткам. Залежным ад усяго. Без уласнай сутнасці.

Ад самага дзяцінства той рабіў так, як трэба. І яму нават падабалася. Зрэшты, гэта было нескладана, свет не патрабаваў надта многа, быў ясным і зразумелым.

А тут усё ўскладнілася. Свет ашчэрыўся жахлівай пачварынкай. І закрыў сабой будучыню. Яго будучыню.

Ісці па плыні, разам з усімі, было немагчыма. Можна было пайсці насуперак. Насустрач плыні. Альбо ўвогуле спыніцца. Адысці ўбок.

Урэшце ён адважыўся. Спыніцца. Паставіць крыж. Памерці і нарадзіцца зноў, на ўскраіне вёскі. У паўзгнілай хатцы сярод рэдкага сасонніку. Гэта было няпроста.

Першыя месяцы ён быў заняты выжываннем. І знаёмствам. Печка, гародчык, драўляныя сцены, цішыня ўнутры і навонкі — усё гэта было новым і нечаканым.

Але час ішоў, ён пачаў абрастаць гэтым мейсцам, а таксама ідэямі, улюбёнымі эмоцыямі, суразмоўцамі. Усё стала цёплым і блізкім, як быццам ён тут нарадзіўся альбо жыў у адным з мінулых жыццяў.

Час тут увогуле ішоў па-іншаму. Ён плыў, як рака, павольна, няспешна, неадчувальна.

Першы год ён чытаў самотніцу Эмілі, думаў пра яе *боскую большасць*. І брата Восіпа, канечне.

Потым натрапіў на Сэлінджэра, позняга, амаль невядомага. Ён тады выехаў у Менск, прайсціся па букіністах. І ў адным з іх пабачыў дзве танюткія зачытаныя кніжыцы. Шэра-фіялетавую пра Фрэні і Зуі. І аранжавую пра Сімора.

* * *

А потым ён адкрыў для сябе Усход, яшчэ раз. Як лекі і як практычную задачу.

Вырашыў давучыць кітайскую, паехаў да Лісовіча. Расказаў усё. Пра каханне, пра першы аддзел, пра стому ад рэальнасці.

Той зусім не здзівіўся. Усе ягоныя аспіранты, сказаў ён, даюць падпіску. І потым пішуць справаздачы, штомесяц. Лепшыя адразу прызнаюцца. І нават раяцца, пра што адпісаць гэтым разам.

Ён быў першым, хто ім адмовіў. І пакуль адзіным. Таму шанцаў узнавіцца ў яго вельмі мала. Хіба ён усё ж такі пагодзіцца.

Лісовіч склаў праграму. Даў кніг. Параіў вучыць вэньян дадаткова, бо гэта ключ да традыцыі.

Урэшце расказаў пра сябе.

Ягоны бацька быў вядомым беларускім мовазнаўцам, які ў трыццатыя перабраўся на ўсход. За некалькі

дзён да меркаванага арышту. У сям'і было шмат беларускіх кніг. І сапраўдны культ радзімы, куды абавязкова трэба вярнуцца. Вершы Дубоўкі, расповеды Улашчыка — усё гэта было поруч з дзяцінства.

Сказаў, што, калі штосьці зменіцца альбо проста забудуць, ён будзе рады бачыць яго ў сябе на кафедры *суіскальнікам*.

Францішак тады прыехаў натхнёны і крыху прысаромлены. Імёны, якія прамаўляў Лісовіч, яму нічога не казалі. І ён пачынаў разумець, што адкрываць для сябе ён мусіць не толькі ўсход.

Таксама разумеў, што яму больш непатрэбныя кафедры і суіскальніцтвы.

Ён быў самадастатковы.

* * *

Прайшло шмат часу пасля яго пахавання.

Ён вырашыў паглядзець, што адбываецца навонкі. Даведацца, што там за стагоддзе. І ці ёсць шанцы на змену кальпы. Альбо хаця б эона.

Адвесіў фіранкі. Адчыніў ваканіцы. Высунуў галаву.

Вакол была непраглядная цемра.

Усяго адно радыё і тры газеты. Па вуліцах хадзілі піянеры, на ўсходзе штодня ўставала сонца і бадзёра рапартавала: московскоевремя шестьчасов двемінуты.

Усё разам гэта называлася эпохай. І з яе не было выйсця.

Напоўніцу можна адкрыцца толькі ў будучыню альбо ў мінулае, — вырашыў тады ён. Там жывуць чытачы і суразмоўцы.

Тут, у гэтай рэальнасці, застаецца няшмат. Закладаць схроны. Размаўляць з памерлымі.

Памерлыя не здрадзяць, яны заўсёды на варце, пільнуюць. З імі можна было гаварыць, як з жывымі. Нават яшчэ лепш, бо застаецца толькі сутнаснае. Не толькі праз кнігі, у якіх усё яшчэ гучаць іх галасы. Здараецца і больш рэдкае. Можна гаварыць з духамі. Вядома, калі тыя пагодзяцца. І калі мы здольныя прайсці праз мяжу.

Камусьці трэба не спаць, паўтараў ён словы аднаго з улюбёных самотнікаў, спачатку ў дзіцячым садочку, куды ён перайшоў са свайго музея ў вартаўнікі. Потым у ЖРЭА Маскоўскага раёна.

Калі яму прапанавалі новае мейсца, ён насцярожыўся. Вялікі будынак на ўскраіне. Дзіўная назва, сам будынак адпавядаў ёй напоўніцу. Левіяфан, які прагнуў праглынуць чарговую ахвяру. Праўда, усярэдзіне было цёпла і ўтульна. Там быў пакойчык з пісьмовым сталом, на якім важна ляжаў сшытак уліку. І друкарка ў суседнім кабінеце.

Ён завіс там на гады, час ішоў незаўважна, ён зусім заціх, як быццам на парозе адсутнасці. У паўсне. Яшчэ крыху — і можна будзе зусім забыцца. У самотнай начной нірване.

Але сэрца! Неразумнае сэрца. Яно не слухалася.

Яно патрабавала музыкі.

Штосьці нашэптвала, папярэджвала, падавала сігналы…

* * *

Ён усё яшчэ быў у падарожжы. Праўда, цяпер мэта аддалілася.

З усмешкай прыгадваў пачатак шляху. Дзіцячую наіўнасць першага года, калі ён вырашыў штурмаваць вышыні. Ісці да канца. Асягнуць прасвятлення.

Так, прасвятлення! Не больш, але і не менш. Самадхі. А можа, нават і саторы. Толькі гэтая мэта штосьці значыла. Гадзіны і тыдні медытацый. У прыцемненым пакоі. Сам-насам з уласнай свядомасцю.

Ён тады прачытаў гісторыю пра прыручэнне буйвала. Гэта была будыйская алегорыя пра ўнутраны шлях, пра дасканаленне.

Так, гэта тое, што ён шукаў.

Медытацыя, аскеза, вера.

Але буйвал быў наравісты, упарціўся. І ён зрываўся.

Прыходзіла стома. І адчай.

Ратавала фраза, якую ён знайшоў у аднаго са сваіх улюбёных кітайцаў: у пустэчы сэрца збіраюцца людзі і духі.

* * *

Ён стаміўся сябе трымаць. Штосьці было не так у гэтых спробах гарантавана прарвацца ў вечнае.

Ды й сэрца было супраць. Вяло зусім у іншым кірунку.

Тады з ім і здарылася паэзія.

Першы верш быў пра звычайны шэры дзень, які прамінае занадта хутка. Згарае на вогнішчы часу невядомым жаўнерам. І які мусіць быць ушанаваны і адзначаны.

Нічога асаблівага. Але за ім пацягнуліся іншыя. Як быццам прарвала плаціну і ўсё паплыло.

З’явілася лёгкасць і нязмушанасць. Ягоная хатка перастала быць кляштарам, а засталася проста мілым

прытулкам. Ён расслабіўся. Адпусціў волю. Забыў пра сябе. Перастаў сябе скіроўваць. Ішоў праз формы весела і ўжо не думаў пра мэту альбо пра свядомасць.

Вышыні і прадонні, прасвятленні і непраглядная цемра — усё здаралася і прамінала, каб адкрыць новыя павароты.

Цяпер ён ведаў, што, толькі калі не шукаеш, яно знаходзіцца. І цябе знаходзіць.

Трэба проста быць чуйным. Калі мудрасць недзе ёсць, яна сама знойдзе яго, адкрыецца.

Будучыня яго чакала і свяціла магчымасцямі.

Наперадзе былі важныя рэчы.

Ён будзе жыць у розных гарадах і розных краінах. Навучыцца разумець мовы. І не толькі чалавечыя — камянёў і дрэваў таксама. Прачытае важныя кнігі. Зрэшты, напоўніцца. Прасторай, часам, будучыняй.

Гэта было даўно, больш за дваццаць год таму.

Шмат з таго, што тады чакала наперадзе, ужо адбылося.

* * *

Эпохі праплывалі як сон. Звінелі званочкамі, ладзілі відовішчы. Кружлялі вакол, як матылі. Абяцалі зашмат, знікалі без развітання. Але і дарылі сябе таксама.

У адной з іх ён стаў паэтам.

Пра яго вершы пачалі гаварыць у пэўных колах. У яго былі чытачы. І прыхільнікі. Ён прыгадваў тыя часы як самы важны сакрэт.

Ён знайшоў для сябе мейсца — невялікую кавярню на самым узбоччы. Прыходзіў рэгулярна. Замаўляў кубачак кавы, сядаў у далёкі кут. Услухоўваўся, углядаўся.

Трэба было знайсці тон і настроіць сэрца. Разгайдаць рэчаіснасць. Выпасці з яе. Патрапіць. У цёмныя калідоры сэнсу, што вялі на скрай бытнага.

І тады быццам бы адкрываліся старыя раны, усё знікала, раптоўна, балюча і незваротна, а потым вярталася, прыходзіла як цуд і як музыка. Словы прачыналіся і вялі за сабой. Патрабавалі веры. І вернасці.

Менавіта тады ён адчуў, што мова жывая.

Словы, метафары, ідэі — з імі можна было сябраваць, як з жывымі істотамі. Знаёміць адно з адным, спалучаць.

Ён пачаў вучыць старагрэцкую, проста каб адчуць сцежкі. Зразумець, з чаго ўсё пачалося.

Мова, падумаў тады ён, — усяго толькі сутнасныя адхіленні, вібрацыі сэнсаў. Дзеянне адхіляецца ў часе, імя — у прасторы. Разам яны звязваюць усё з усім. Мова ёсць гэтым звязам, спляценнем. Мова сплятае свет у адно. Мова і ёсць светам.

Мова была мейсцам. Прытулкам. Домам быцця.

Ён быў вартаўніком гэтага прытулку. Словы слухаліся яго, а ён іх. Але гэта было толькі тут, у прыцемках. У катакомбах.

* * *

Там, звонку, словы падманвалі. Танчылі хіжыя танцы. Гублялі прытомнасць. Штосьці адбывалася з імі, страшнае, незразумелае.

Там было ўсё тое ж, але змёрзлае і халоднае, пакалечанае, голас адразу губляў тэмбр, думка — яснасць.

І ўсё ж адтуль тачылася спакуса. Выйсці. Запаліць эмоцыю, як ліхтар. Сагрэць і павесці тых, хто адгукнецца.

Але каго тых? і ці будуць яны гатовыя ісці?

І ці самі сэнсы адкрыюцца ім у сваёй поўніцы?

Каб зразумець гэта, трэба было памяняць маскі. Адважыцца. Паспрабаваць. Згуляць другую гульню.

* * *

Пакуль ён разважаў і вагаўся, усё развалілася. Спектакль адмянілі, публіцы вярнулі квіткі і адправілі дадому.

Тое, што здавалася амаль вечным, аказалася бурбалкай, ілюзіяй. Імперыя знікла, расплылася ў тумане.

Напачатку, канешне, палёгка і выдых, але і крыху шкадавання.

Тут, унутры, усё было па-іншаму.

Пагананне ў ноч было балючым, але сутнасным і паэтычным. Шэпты і крыкі закатаваных. Галасы шаманаў. Словы ў катакомбах, што захоўваліся тысячагоддзямі. Яны чакалі Бадхідхарму, які ішоў з Захаду, і — святая ўпэўненасць — даўно быў бы тут, каб не патрулі на дарогах.

Ён перачытваў тыя словы зноў і зноў: лепшае было ў інтанацыі, у трапяткім і далікатным прадчуванні магчымага.

Потым час разамкнуўся і ўсе выйшлі на паверхню.

Усё стала занадта блізка. Цяпер не было алібі, не было спадзеву. Трэба было абуджацца на мейсцы, знаходзіць скарбы тут і цяпер.

І, самае галоўнае, больш не было ніякіх далячыняў, адкуль маглі б свяціць далёкія зоркі.

* * *

У яго выйшла кніга паэзіі, было многа рэцэнзіяў, яго запрашалі на сустрэчы. З'явіліся новыя сябры, знаёмых стала зашмат. І ён захваляваўся. Свет зноў яго лавіў, прапаноўваў мейсца.

Паэзія, праўда, сцішылася і адышла кудысьці ўбок.

Яна больш не нагадвала пра сябе непакоем. Сляпым болем зранку, у мейсцы крыху вышэй за сэрца, як ён напісаў у адным з вершаў. Гэта яго хвалявала, але і цешыла таксама. У прамінулую эпоху болю было зашмат, год ішоў за пяць, а то і за дзесяць. Ён, безумоўна, заслужыў гэты перапынак.

І яшчэ. Калі ўсё разляцелася, канцэнтрацыя стала амаль немагчымай. Раней ён патрапляў у сябе амаль адразу. Нягледзячы на знешняе. Альбо наадварот: дзякуючы яму. Яго літаральна выштурхоўвала да сябе самога.

А тут праходзілі дні і месяцы ў прыемным сузіранні вонкавага. Яго размазала па паверхні эпохі. Тонкім слоем.

Мітуслівыя часы.

Зрэшты, там было многа радасці: дурнаватай, п'янкой. У якой забываеш пра ўсё, пра эга і пра когіта.

* * *

Трэба было шукаць сябе і абуджацца менавіта там, сярод радасці. Гэта было значна складаней, чым чакаць у катакомбах.

Ён паспрабаваў тады быць звычайным, разам з усімі. Заснаваў часопіс, штосьці перакладаў, выдаваў кнігі.

Але і гэта здарылася, прайшло, скончылася.

І ён нечакана і раптоўна вярнуўся. У самоту. Да сябе. Поўны, як яйка, прасторай і часам.

Эпохі звісалі з яго лахманамі. Ён шмат пра што ведаў і многа бачыў. Свету ён ужо не баяўся. Навучыўся ісці праз формы наскрозь, не супадаючы да канца, без крыўды.

Усе гэтыя скокі, гэты спектакль. Наіўныя спробы зачапіць, пасадзіць на ланцуг. Ён мог бы быць кімсьці ў гэтым спектаклі, у яго былі здольнасці, ён умеў.

Але маскі не супадалі, адслойваліся, ролі былі не ягоныя.

Сябры і знаёмыя дасылалі паштоўкі — з Бостана, Мілана, Берліна. Некаторыя, з кім ён пачынаў, ужо загадвалі кафедрамі. Іншыя былі вядомымі альбо займалі пасады.

А ён так і не выбраў для сябе анічога.

Не стаў кімсьці. Тут, на гэтым баку.

Не знайшоў сваю маску, якая б сабрала ўсё ў адно.

Ці па-іншаму: ягоная маска ўсё яшчэ яго шукала.

* * *

Тады ён і вырашыў пайсці яшчэ далей. Падысці да самага скраю. Слухаць галасы і шэпты. Адтуль.

Гэта было зусім блізка. У суседнім пакоі. Сны, ідэі, прамінулыя эпохі. Багі і настаўнікі. Там, за сцяной, Крышна ўсё яшчэ гаварыў з Арджунам. Лао Цзы з Канфуцыем. Ешуа са Сваім Богам.

Калі падысці да скраю, чуваць іх галасы. Не адразу. І зусім не проста. Трэба было настройваць слых, каб адчуваць і адрозніваць. Была патрэбная магія.

Раней яму было дастаткова слядоў. Таго, што засталося ў кнігах. Ён сабраў вялікую бібліятэку. Са сведчаннямі.

Але рэальнасць была таксама кнігай. Адной з кнігаў.

І яна таксама поўнілася знакамі і слядамі.

* * *

Ён быў паляўнічым. Словы вярнуліся і зноў слухаліся яго, але па-іншаму. Свет быў цяпер галоўнай кнігай, магічнай, адкрытай для кожнага. Ён поўніўся знакамі — для тых, хто ўмее быць пільным. Чакаць і бачыць.

Тое, што застаецца, усталёўваюць паэты. Ён памятаў гэтыя словы са старога нямецкага верша.

Але што застаецца? і дзе? і хіба гэта не занадта нахабна — хацець застацца? Чаму не прамінуць разам з усім? і з усімі.

Прайсці свет наскрозь, як браму. Выйсці з таго боку.

“Кушада бад ба давлат хаміша ін даргах” — напісаў ён на ўваходзе словы аднаго персідскага чараўніка.

Гэта было пра адчыненую браму да шчасця. У якую не так проста ўвайсці. Бо трэба ведаць мову птушак.

Там, з таго боку, яго чакала залатая маска. У якой разумееш цэлае. І якую не трэба шукаць, бо гэта яна нас знаходзіць.

* * *

Гэтым разам ён запісаў чырвонай асадкай:

Кітай. Тры школы, якія былі побач, якія перапляліся, сталі адным у трох.

Будызм хоча, каб чалавек стаў духам, выйшаў за межы наяўнага свету, за межы чалавечага як такога. Выйшаў і больш сюды не вяртаўся. Годна і арыстакратычна.

Даосы імкнуцца патрапіць назад, у дачалавечае. У свет, яшчэ не сапсаваны свядомасцю, да птушак, драконаў і чарапахаў. Яны прагнуць несмяротнасці. Дай Бог ім здароўя.

Абедзве сцежкі маюць на мэце пэўную нязгоду з рэальнасцю, ідэю, што нам трэба выбірацца адсюль як мага хутчэй. Пытанне толькі — куды, у які бок бегчы.

І толькі Канфуцый прапануе застацца і напоўніцу зведаць тутэйшую долю. Пражыць сваё жыццё. Самому.

Самая загадкавая школа.

Ён не стварае тэорыю, а расказвае пра досвед. Пра тое, што з ім адбывалася. У пятнаццаць, у трыццаць, у семдзесят год.

Ён называе гэта вучэннем. Вялікім вучэннем.

Чалавеку трэба вучыцца быць чалавекам.

* * *

Ён падумаў крыху і дапісаў зялёным колерам:

Хрысціянства — мінімалізм. Яно гаворыць — пашкадуйце нас, дурняў, мы не ў стане самастойна ані вырвацца з формы, ані супасці з ёй напоўніцу. Так, каб прайсці яе наскрозь і выйсці з другога боку. Адзінае, што нам застаецца — тут і цяпер, — пакорліва любіць нашую ўласную недасканаласць.

І спадзявацца, што *там* за яе нам прабачаць.

* * *

Там. Там-тарам.

3.

Крывіцкая Мекка сустрэла яго шэрай восеньскай імжой, аўтамабільнымі коркамі і рэкламай *Švyturys 1784*, якая чамусьці сустракалася найчасцей. Прастора адразу разламалася на дзве часткі, на Горад і Зарэчча, у якім можна было хавацца, калі Горад станавіўся занадта матэрыяльны, патрабаваў да сябе шмат увагі.

Былі іншыя прадмесці: Антокаль і Звярынец, і дзве рэчкі — Вялля і Вялейка. І, вядома, Кальварыйская, вуліца, што пачыналася амаль адразу за зялёным мостам і цягнулася далёка-далёка, да самых азёраў.

А яшчэ пагоркі, славутыя віленскія пагоркі. Зарослыя лесам, аблепленыя крывымі хаткамі, а часам зусім самотныя, пустыя, яны былі паўсюль, і ўзвышаліся над усім, і былі сведкамі.

Недзе за чыгункай, на поўдзень, хаваліся могілкі, старыя і славутыя, але да іх чамусьці не знаходзілася часу дабрацца.

* * *

Некалькі год таму яму прапанавалі выкладанне, і ён спакусіўся.

Курс называўся "Антрапалогія цывілізацый". Індыя. Кітай. Егіпет. Ацтэкі і Мая. Можна было гаварыць

пра ўсё самае важнае. Канешне, мусілі быць і праграма і план заняткаў, але ж планы патрэбныя дзеля таго, каб з асалодай іх парушаць.

Ён памятаў першы дзень ва ўсіх падрабязнасцях.

Прыехаў зранку, забраў ключы ад кватэры, занёс рэчы. Заняткі пачыналіся праз пару дзён, і ў яго быў час уладкавацца, агледзецца. Прайсціся старымі маршрутамі.

Ён вярнуўся на вакзал, адтуль пайшоў да Базыльянскіх муроў, пахадзіў па дворыку, пасядзеў на камянёх.

Усё як і раней. Нічога не змянілася. У гэтым дворыку жыла цішыня… апошнія пару стагоддзяў.

Напэўна, недзе тут, у сутарэннях, захоўвалася й *салодкіх тайн пітво*, пра якое напісаў Жылка.

* * *

Калісьці ўсё гэта было ўпершыню. Ранішні цягнік Менск — Вільня, дызель, паход ад вакзала, праз Вострую Браму ўніз, да Святой Ганны.

Гарачыя сасіскі ў кулінарыі на вуліцы Горкага. І кава, славутая віленская кава, яна была надзіва добрая ва ўсіх мейсцах, ад апошніх забягалавак да кавярні “Нерынга” на праспекце Гедыміна. А яшчэ трасянка прадавачак, у якой адбіліся тутэйшыя гаворкі.

Памятаў лес за чыгункай, куды яны прабіраліся з усёй магчымай канспірацыяй. Нахілёную хатку, дзядзька Лявон вяртаецца ў гасцёўню: так, яна прачнулася, можаце ўваходзіць.

Яны заходзілі ціха й асцярожна. Старая ляжала на ложку. Яна ўжо нічога не гаварыла. Але памятала ўсё. Яны адчувалі гэта без словаў, унутраным пачуццём.

Дзядзька Лявон прадстаўляў іх па чарзе.

І далей яны проста ціха стаялі, гледзячы на сухі старэчы твар, услухоўваючыся ў яе ўспаміны.

Яны амаль бачылі тое ж, што і яна.

Менскую конку. Вагончык, які спускаўся з гары. Б. з хворымі вачыма перад ад’ездам у Ялту. Вестку пра ягоную смерць там.

Потым Вільня. Гімназія. Універсітэт. Вайна. Хатка, амаль у лесе, дзе так зручна было хавацца ад усіх, чакаць.

Ён хацеў бы пабачыць яе вачыма шмат што. Яе Вільню.

Сумную сталіцу, якая заўсёды абяцае так многа.

* * *

Тады Вільня была забытай магчымасцю. Цёплай, але і зусім чужой, далёкай. Прыгожай дэкарацыяй з незразумелымі надпісамі непрыгаданага часу.

Ад яе, зрэшты, засталося няшмат.

Паўсюль былі новыя крамкі, чыстыя і бязлюдныя. Яны абляпілі старыя вулкі, паўтараліся, перацякалі з завулка на завулак, падбіраліся да самой Вострай Брамы. *Mexx, Mango, Hugo Boss* — усё гэта нагадвала незразумелую, утульную і прыгожую пошасць, хваробу, якая бярэ Горад у свае абдоймы. Пяшчотнае задушэнне, ад якога нікуды не падзецца.

Зрэшты, калі халодна, добра схавацца ў якую галерэю альбо кавярню. Ці нават проста ў краму па дарозе.

На шкляных тэрасах каля гатэляў сядзелі важныя людзі. Яны гарталі меню, размаўлялі і, здаецца, нікуды не спяшаліся.

Магчыма, гэта зусім і не людзі. Так сказаў аднойчы Далюс, калі яны прагульваліся пасля семінара. А яму можна было верыць, ён жыў тут ужо сямнаццаць год.

Але калі не людзі, дык хто? Духі? Эльфы? Іншапланетная цывілізацыя?

* * *

Напачатку была эйфарыя. Але праз пару месяцаў Францішак зразумеў, што не так проста ўвайсці ў віленскія лабірынты.

Спачатку ён думаў, што праблема ў мове, і падвучыў літоўскую, але праз гэта ўбачыў, што гаспадары горада няёмка ў ім пачуваюцца. І з радасцю ўцякаюць на суботу-нядзелю куды-небудзь у Марыямпаль альбо ў Друскенікі. Альбо нават проста на азёры за горад.

Ён жыў ужо не першы месяц, але адзіным месцам, што прымала яго як свайго, заставалася невялічкае бістро на аўтавакзале. Аднойчы ён занадта доўга выбіраў мову, на якой звярнуцца да касіркі, і раптам запытаўся на тутэйшай трасянцы *прашам ёду кава з цукрэм калі ласка* і атрымаў у адказ *прошэ бардзо дзякуй* — і далей касірка ўжо шчабятала, не выбіраючы словы, і ставілася да яго як да свайго.

Часам ён заходзіў туды проста пасядзець. Побач ад'язджалі аўтобусы на Менск, і Францішак зразумеў, што гэта яго хвалюе.

Менск з кожным днём станавіўся ўсё менш рэальным.

* * *

Вакзал і ўсё, што вакол, было асобнай цывілізацыяй.

Некалькі вулак, што ішлі ўніз, спляталіся і распляталіся, на скрыжаваннях стаялі хасіды, трымаючы ў руках кнігі. Яны чыталі й мерна пагойдваліся ў такт адно ім чутнай музыцы.

А можа й не хасіды, а наадварот, артадоксы, ён пакуль не разабраўся. Гэта было іх месца, іх частка горада, намоленая стагоддзямі.

Часам ён спыняўся і заводзіў гаворку з адным з іх, хударлявым, гадоў шасцідзесяці. Больш падобным да прадаўца печыва. І кожны раз у яго было дзіўнае адчуванне, што ён размаўляе з ценем альбо прывідам.

Апошнія дні той відавочна быў заклапочаны, як быццам штосьці мусіла здарыцца. Штосьці важнае, страшнае і прыгожае адначасова. Такое, што мы мусім сустрэць сярод сваіх, у бяспечным прытулку.

Сярод сваіх. Бяспечны прытулак. Словы былі цёплыя і духмяныя, як кашэрныя булачкі, і абяцалі многа.

Але цёплыя і духмяныя булачкі — ці яны дапамогуць?

* * *

Лекцыі яму падабаліся, хаця й забіралі шмат сілаў. Асабліва напачатку, калі ён рыхтаваў курс і знаёміўся з групай.

Потым стала лягчэй. Ён уцягнуўся і захапіўся, і тое, што напачатку выглядала як абавязак, ператварылася ў прыгоду і падарожжа.

Ён прыходзіў у аўдыторыю за некалькі хвілінаў, раскладаў тэчкі і паперы, канцэнтраваўся.

Усё было ў яго галаве: эпохі і цывілізацыі, формы жыцця і культуры, ідэі, эмоцыі, тып асобы. З Індыяй і Кітаем было проста, ён аднекуль пра гэта ведаў, і сло-

вы знаходзіліся амаль адразу. З астатнімі горш: прыходзілася ісці ў бібліятэку, гартаць кнігі, карыстацца чужым досведам.

Зрэшты, чужым досвед заставаўся ненадоўга.

* * *

Вечары ў Вільні былі асаблівыя.

Сутонне адкрывала шлюзы, і горад напаўняўся галасамі і шэптамі.

Ён амаль фізічна адчуваў, як усё звінела і зіхацела, там, за сценамі. Ён гатаваў гарбату, сядаў з пледам на канапу, сцішваўся, спусташаўся. Так праміналі гадзіны.

Часам ён пераломваў сябе і выбіраўся ў горад. Альбо званіў Далюсу, і яны ішлі на барбакан *глядзець на ўсё зверху*.

Ці проста блукалі па начной Вільні ў пошуках прыгодаў.

А прыгоды з імі здараліся рэгулярна. Асабліва калі далучалася Ірэна, якая ведала мейсцы.

Напрыклад, уначы, на далёкіх пагорках, з бутэлькай *трох дзявятак*, дзе яны пілі і размаўлялі з *ужо адсутнымі*.

Альбо ў прывакзальных вулках, дзе яны вывучалі віленскае дно, распытваючы пра начное жыццё горада таксістаў, прастытутак і прадстаўнікоў мясцовай гапаты.

* * *

Торба і парасон былі ягонымі спадарожнікамі.

Парасон быў вялікі і масіўны, больш падобны на кій альбо крывуліну. Ён браў яго з сабой, нават калі надвор’е не абяцала аніякай вільгаці.

У торбе ляжалі магічныя прылады.

Сшытак, у якім ён запісваў словы, што прыходзілі да яго звонку. Асадкі розных колераў, якія дазвалялі адрозніваць адценні эмоцыяў, пазначаць тоны й інтэрвалы. Укладаць усё ў музыку.

Да сшытка былі пэўныя патрабаванні. Ён мусіў быць у цвёрдай вокладцы, у лінейку і заўсёды пад рукой.

Гэта быў адзіны спосаб не прапусціць ілюмінацыі. Калі штосьці з'яўлялася ў яго свядомасці, успыхвала і знікала. На момант.

* * *

Яны блукалі па Росах, з Далюсам, у лістападзе. З дрэваў ападалі апошнія лісты. Далюс расказваў пра свае вандроўкі па Мінску. Ён быў захоплены шырокімі праспектамі, маштабам і амбіцыямі.

Што ён тут робіць, у Вільні? і чаму ён прыехаў менавіта цяпер, а не раней, калі пачуцці былі свежымі, а ўтопіі вабілі і абяцалі? і што там цікавага ў Мінску?

Вырашыў пагаварыць з духамі, сказаў Францішак. У Мінску духаў амаль няма. Гэта новы горад, заўсёды новы.

Горад-карабель. Які смела плыве ў будучыню. Хоча заўсёды быць першым. Першы вадаправод. Першая электрастанцыя. Першая конка.

Горад-які-ніколі-не-азіраецца-ў-мінулае.

Далюс ведаў усё пра архівы і бібліятэкі. Яны пазнаёміліся ва Універсітэцкай. Францішак зайшоў папрацаваць, сеў за столік і адключыўся, забыўшы замовіць кнігі. Думаў пра штосьці сваё. І ў пэўны момант адчуў уважлівы позірк. Потым яны разам выйшлі.

Калі ён першы раз зайшоў да Далюса ў кватэрку, яго ахапіла пачуццё абсурднай радасці.

Усё было амаль некранута. З тых часоў.

Няясна, праўда, якіх, але пэўна далёкіх, дзевятнаццатае стагоддзе ці крыху раней, ляпніна на сценах і на столі ледзь трымалася, расколіны былі самыя сапраўдныя, іх ніхто не замазваў вельмі-вельмі доўга.

Ванна стаяла на кухні, гарачая вада была з калонкі. Не было ацяплення — замест яго ў кожным пакоі сталі грубкі са старой кафляй. Гаўбец быў пляцоўкай, высунутай у іншы свет.

Хаця ён і выглядаў так, нібы збіраецца вось-вось абваліцца на галовы мінакоў, насамрэч ён завіс у паветры, і ніякая сіла прыцягнення не змагла б прымусіць яго ўпасці.

Гэта быў горды капітанскі масток, на якім, праўда, не было ніякага капітана.

Але і без капітана жагляр ішоў у патрэбным кірунку.

* * *

Далюс пазнаёміў яго з Ірэнай і з Відасам.

Відас быў вандроўным філосафам. Падпрацоўваў назіральнікам на выбарах, па кантракце. Калі здаралася штосьці далёкае і небяспечнае, яго выклікалі. Афрыка, Паўднёвая Амерыка. Усход.

Ён вяртаўся з чарговага падарожжа — і пачыналася феерыя. На пару месяцаў. Далей ён упадаў у спячку, абуджаўся, шукаў новае падарожжа, і кола замыкалася.

Ірэна не працавала нідзе.

Яна тлумачыла знакі. Карты Таро. Гаданне па руцэ і кававай гушчы. Гараскопы. І Цзын. Зорнае неба.

Надзіва, гэта добра аплачвалася. І што важна — рэгулярна, у адрозненне ад Відаса.

Яны сядзелі на кухні: яна, Далюс, Францішак. Відас быў на далёкіх выспах, мусіў неўзабаве вярнуцца з падарункамі. Ён заўсёды прывозіў сувеніры. Засечкі на памяць. Ягоная французская была дасканалай.

Я раскажу вам адну гісторыю, сказала Ірэна. Пра маіх знаёмых. Вялікая сям'я: муж, жонка, бацькі, дзеці. Пасля вайны атрымалі кватэрку на першым паверсе старога дома, два пакоі. І ніякіх перспектываў на пашырэнне.

Муж вырашае пашырыцца ўніз. Разбірае падлогу на кухні. Капае вялікую яму, абкладае яе старымі камянямі, як сапраўднае сутарэнне. Робіць усё павольна, але грунтоўна. На стагоддзі.

Пакуль ён гэтым займаецца, змяняецца некалькі эпохаў. І праект запавольваецца. А потым спыняецца. На кухні застаецца лаз, прыкрыты драўляным вечкам. А далей адбываецца дзіўная рэч: у гэты лаз пачынаюць падаць іхнія госці. Адзін за адным. Ломяць рукі і ногі. Потым расказваюць, што іх літаральна зацягвала ўніз. І што цягнула нечалавечая сіла.

Важна дадаць — падалі заўсёды цвярозыя.

Мараль гэтай гісторыі надзвычай важная і карысная, асабліва для гасцей нашага горада. З глыбінёй у Вільні трэба асцярожна. Гэта ў Менску можна рабіць з яе культ. Бясконца заглыбляцца.

А тут у нас проста многа дзірак. У якія праваліваешся і назад не выходзіш.

* * *

Расколіны ішлі праз столь і сыходзіліся на правай сцяне. Яны ўтваралі складаны малюнак, сузіранне якога,

пэўна, мусіла адкрыць некаторыя тайны, калі б гэтаму сузіранню аддавацца дастаткова рэгулярна, хаця б раз на тыдзень.

Драўляныя паліцы і шафы былі паўсюль, кнігі стаялі шчыльна і нерэгулярна. У перадпакоі акрамя дзвярэй на кухню і прыбіральню былі яшчэ адны. Масіўныя, падобныя да дзвярэй у кватэру.

Гэта суседзі, сказаў Далюс. Ніхто не разумее, як гэта атрымалася, але мая кватэра прахадная. Суседзям, каб увайсці да сябе, трэба спачатку ўвайсці да мяне, у гэты калідорчык.

І прыбіральня ў нас агульная. Праўда, я ніколі не бачыў, каб яны ёй карысталіся. Праўду кажучы, я іх саміх не бачыў ужо год пяць. Толькі гукі. Уначы альбо позна ўвечары. Прабіраюцца ў сваю кватэру ціха і незаўважна, каб не патрывожыць.

Іх не трэба баяцца, яны добрыя, дадаў Далюс. Хутчэй за ўсё, беларусы.

* * *

А яшчэ два разы на год нам грукаюць у сценку на кухні, сказаў Далюс. Там, дзе цяпер стаіць ванна. Калісьці там таксама былі дзверы. Выхад у дворык. Яны даўно закладзеныя. Сам выхад таксама закладзены. І таксама даўно. Але разы два на год у дзверы хтосьці грукае. Доўга і страшна.

Часам лаецца. Па-польску. На тутэйшай крэсовай.

Гэта адбываецца позна ўвечары ці нават уначы.

Здаецца, хтосьці важны заблукаў у часе, госць, які абавязкова мусіць сюды патрапіць.

Страшна. І хочацца адчыніць.

У цябе было калі-небудзь такое адчуванне, запытаўся Далюс. Калі адтуль грукаюць і трэба адчыняць, а ты не ведаеш, дзе дзверы. Альбо нават ведаеш дзе і гатовы адчыніць, але яны закладзеныя?

Я ўсё жыццё жыву з такім адчуваннем, сказаў Францішак.

* * *

Канец свету — але якога менавіта свету? — запісаў Францішак сінім колерам.

Свету Геракліта, з вечна жывым агнём-логасам, што распальваецца і затухае, ці свету Чжуан-цзы, які ёсць толькі няпэўным — і няпоўным — адбіткам Сну пра Сон у зрэнках Вялікага Матыля?

Канец эона. Канец Калі-Югі.

Ці канец свету, што прыдумаў адмыслова для нас Томас Стэрнз Эліят: *not with a bang but a whisper.*

4.

Двойка была амаль пустая. Гэтым разам ён вырашыў ехаць праз Антокаль. Лекцыя пачыналася а 15.20, часу заставалася акурат столькі, каб нікуды не спяшацца.

Ён сеў у крэсла ў самым канцы салона. Можна адпусціць свядомасць, забыць, хто і куды едзе. І навошта. Паўгадзіны расцягваліся ў амаль вечнасць.

Менавіта ў гэтай часовай тралейбуснай вечнасці ён бачыў формы ясна і дасканала.

Ідэі. Эпохі. Свае і чужыя жыцці. Зусім не так, як бачыцца адсюль, знізу. З іншай перспектывы. Як кон. Як прызначэнне. Як тое, што было пра яго аднойчы задумана. І не толькі пра яго.

Кім задумана? Гэта было неістотна.

Галоўнае, што ён гэта бачыў. І разумеў.

Ён дастаў сшытак і асадку, на ўсялякі выпадак. Калі штосьці праявіцца, яны будуць пад рукой. Прытуліўся да шкла. І адразу праваліўся. У светлыя глыбіні часу. У тое, што калісьці было і засталося.

* * *

Мусіў быць фотаздымак. Стары, яшчэ чорна-белы.

Ён не быў упэўнены, што той захаваўся. Папраўдзе, ён не быў упэўнены, што той увогуле існаваў. Так, нейкая цьмяная прыгадка.

У свядомасці было штосьці такое: старая картка, чорна-белы здымак кепскай якасці.

Але хто мог іх фатаграфаваць тады? Хто быў разам з імі?

Яны стаялі ў кавярні, у чарзе. Утрох. Багдан быў тут упершыню, трымаўся крыху насцярожана. А Эва Дамініка не, яна адразу адчула сябе дома.

Ён іх запрасіў, нечакана для сябе самога. Ён бярог гэтае мейсца для работы, гэта была яго майстэрня. Лабараторыя.

Звычайна прыходзіў яшчэ да адкрыцця, каб заняць мейсца. Сядаў у самы кут, каля вакна. Замаўляў падвойную. Раскрываў сшытак. Альбо кнігу. Сцішваўся. Засяроджваўся.

І тады з ім гэта здаралася. Прыходзілі словы і пачыналі сведчыць. Складацца апрычонымі ўзорамі. Ён ледзьве паспяваў занатоўваць.

А тут ён проста стаяў з сябрамі і размаўляў. Жартаваў, гаварыў розныя глупствы. Расказваў пра Леа, пра майстэрню Мамонічаў. Пра пераклад Лао-цзы на старабеларускую, ён збіраўся яго зрабіць, каб потым надрукаваць як помнік эпохі.

* * *

Перад гэтым была летняя ноч з мадэрай і салодкімі вуснамі. Якімі ён трызніў яшчэ доўга.

Ён ішоў па інтэрнаце, п’яны, распачынаўся апошні год вучобы. У паветры ўжо адчувалася штосьці новае. Другая будучыня, якая шукала сабе дарогу.

Ён вярнуўся з Феадосіі, прапалены сонцам і прыгодамі.

Гэта быў яго першы раз, пасля дзіцячых паездак з бацькамі. Халодны і дажджысты чэрвень, ліпень таксама амаль без сонца. Адпачынак рызыкаваў пераўтварыцца ў сядзенне на тэрасе з кнігай, разбаўленае меланхалічным корпаннем у гародчыку. І ён раптоўна сарваўся, набыў квіток у адзін бок і праз суткі выйшаў у цёплы світанак старой Кафы.

Ён ужо забыў, якім пяшчотным можа быць мора. І якім блізкім — неба. І калі вярнуўся, перад самай восеньскай сесіяй, усё было не так, як раней. Раптоўна па-іншаму адчулася само жыццё, якое пульсуе маленькай жылкай на скроні. Хвалюецца, перапаўняе, б'е і лашчыць.

* * *

Грала італьянская музыка, кружэлка аніяк не магла скончыцца. Спынялася, заціхала на хвіліну, а потым пачынала зноў — як быццам штосьці не дагаварыла, штосьці важнае, што нельга пакінуць на потым.

Эва Дамініка была зусім блізка, ён адчуваў яе цела як сваё, кожную клетачку, кожны лапік. Дурман валасоў, узлёт веяў, крыху пульхныя вусны, дзёрзкія выгіны і пагоркі.

Яны пазнаёміліся некалькі гадзінаў таму. Ён ішоў па калідоры інтэрната, вясёлы і самотны, гатовы, як Шыва, разбіць свет на кавалкі.

Яму хацелася падзяліцца нечаканай радасцю, сонцам унутры, якое ён прывёз з сабой з Кафы. Таму, калі пабачыў дзявочую постаць у канцы калідора, не вагаўся. Побач, у куце, стаяў хлопец, але яны не былі парай, гэта было зразумела па адлегласці і па тым, як яны размаўлялі.

І вось цяпер, праз некалькі гадзінаў, ён ведаў пра Эву Дамініку амаль усё. Яны цалаваліся і былі гатовыя да большага.

Нягледзячы на адсутнасць ложка, амаль восеньскую прахалоду ў пакоі і партрэт Леаніда Ільіча Брэжнева на ўсю сцяну.

Быў, праўда, дыванок на падлозе. Але на ім спаў Багдан, са спакойным, шчаслівым выразам на твары.

І яшчэ хтосьці рэгулярна біў у дзверы і пагражаў прывесці вахцёра.

* * *

Калі б яму сказалі, што ён будзе разам з іншымі і будзе верным, ён бы моцна здзівіўся. І не паверыў.

Але так адбылося. Ён адчуў пакаленне. Тых, хто разам з табой ідуць праз эпоху.

Яны збіраліся, як у ашрам, кожны паасобку і кожны варты цэлага войска. Праявіліся ў часе, сыдуць у часе.

С., тонкая і нечаканая, ён пабачыў яе на літаратурным семінары і адразу ўсё зразумеў, падышоў знаёміцца. Яна і сышла нечакана — на заснежанай начной дарозе, па якой яна вярталася. У сваю Вільню. Ён плакаў на пахаванні.

Д., засяроджаная і ўзнёслая, у мярэжы словаў. Згубленая і знойдзеная. Заўсёды там, сярод музыкі.

А. І Г., якія вечна сварыліся, былі заўсёды ў нязгодзе, але якраз праз гэта трымалі свой сусвет жывым і нясконченым.

Яны тады былі супраць усіх. У пераможным паходзе. Тысячарукі Шыва, які ідзе па лабірынце свету. Узрывае ўсё на сваёй дарозе. Анікому няма літасці, і не спадзявайцеся.

Толькі сэнс, які тады тачыўся адусюль. І пяшчота.

* * *

А потым усё замёрла. Як быццам не засталося больш ніякіх мэтаў. Ніякіх задачаў. І ніякіх сур'ёзных пытанняў.

Буйных выжыла няшмат, і яны сядзелі па далёкіх кутах, пад наглядам.

Побач з Мінскам жыць стала немагчыма. Паўсюль будоўлі, вялікія важныя катэджы займалі пакрысе ўсё наваколле. І платы. Якія адцінталі ўсё больш і больш.

Ён прадаў хатку, ад'ехаў далей, у мястэчка С. на бераг Нёмана. Чытаў Басё. Запаўняў старонкі дзённіка амаль выпадковымі словамі.

Раз-пораз прыязджаў у сталіцу, да бацькоў. Пахадзіць па вулках, прынюхацца. Пасядзець у бібліятэцы.

Колькі так прамінула? Пяць, дзесяць год?

Вялізны архіў запісаў, амаль штодзённых. Пераклады. Пачатак рамана. Незразумела, каму ўсё гэта было прызначана.

Ён хацеў забыцца на гэтых паплавох і пагорках, супасці з краявідам.

Былі, праўда, лісты ад Эвы Дамінікі. Яна іх пісала з розных гарадоў і нават краінаў.

Яны ляжалі ў асобнай тэчцы на пісьмовым стале, заўсёды пад рукой.

* * *

Быць аднаму. Быць звар'яцелым для свету. Быць гатовым ісці за словам. Разам з ім. Ратаваць паэтычнае.

Ён тады пачаў прымерваць гэты кон. Прыглядацца, спачатку асцярожна, амаль пужліва.

Гэта спакушала, вяло ў асобнасць і адасобленасць.

Часам ён заходзіў так далёка, што ўжо не думаў пра вяртанне.

Застацца на самым скраі. Там, дзе ўжо не свет, але…

Але прыгожа гэта выглядала ў вершах, сярод словаў, у рэальнасці ж трэба было плаціць за ўсё. Быць гатовым, як Г., прасядзець рэшту жыцця ў клетцы сваёй свядомасці.

Да таго ж свет вакол яго радасна захлынаўся сурагатамі, заўсёды знаходзіліся тыя, хто вырабляў удалыя песенькі і танчыў на сцэне. Хуткапрыгатаваныя, як суп з пакеціка.

Яны білі сябе ў грудзі і зычнымі, добра пастаўленымі акторскімі галасамі крычалі, што гэта яны паэты.

Часам ён сапраўды быў гатовы. Да клеткі. Да невядомасці. Гатовы застацца там назаўсёды. Іншым разам пужаўся пустаты ўнутры і вяртаўся на паплавы і пагоркі.

* * *

Гэта здаралася пад вечар.

Як быццам недзе высока адбылася аварыя і ў свеце адключылі электрычнасць. І ён са здзіўленнем прачынаўся на сярэдзіне дарогі, у шэрым мроіве рэальнага. Без Арыядны, без Мінатаўра, без якога-колечы суразмоўцы. Адзін.

Затухала святло, ён ляжаў і курчыўся ад наплываў пустой бессэнсоўнасці. Яна была цёмная і сляпая, ішла хвалямі аднекуль звонку.

І зусім не дрыжала дзіўным дрыжаннем, як у Рылькавых элегіях, а ціха і падступна высмоктвала.

Напэўна, гэта быў тамас, пра які гаварыў Ван Арджуну.

Цёмная матэрыя свету. Цяжкая чорная вадкасць, цёплая, крыху салодкая.

Не было анічога больш важнага ў гэты момант, як супраціўляцца, шаманіць. Вяртаць усяму сэнс.

Зрэшты, дзеля гэтага ён і вёў дзённік. Можна было зазірнуць, падгледзець, прыгадаць вышыні. Убачыць сябе, як у люстэрку, апазнаць па гэтых выпадковых словах, запісаных у розныя часы, у розных сшытках.

Але гэта здаралася крыху часцей, чым мусіла б. Ён не паспяваў адхэкацца. Адагрэцца.

Да таго ж з кожным разам хвалі былі больш цяжкія. Накрывалі з галавой, білі ў сэрца. Аднойчы можна было не прачнуцца.

Немагчыма было ўвесь час перамагаць у вайне з пустэчай. І з клешамі.

Трэба пагадзіцца, што раз-пораз *яно* прарываецца.

Але як і адкуль? і чаму менавіта цяпер?

Ён крыху баяўся. Скончыць, як бедны Фрэдэрык. Выпасці з сябе назаўсёды. Глядзець на паліцу і пытацца: ці сапраўды гэта я запісаў усе гэтыя прыўкрасныя словы?

* * *

Калі было зусім невыносна, ён даставаў са схронаў бутэльку каньяку і пачынаў весяліцца на самоце. Ён называў гэта *запальваць ліхтары ўнутры*. Надзіва, каньяк дапамагаў найлепей.

Ён наліваў першы келіх і далей цярпліва чакаў, пакуль запаляцца вагні і вагеньчыкі — усярэдзіне, на самым ускрайку свядомасці. Уяўляў, як ён запальваецца разам з імі і далей гарыць чыстым ясным святлом у цёмнай ночы свету. Заціхаў, узвышаўся, прысутнічаў пры тым, што адбывалася.

Гэтая медытацыя на ліхтарах яму падабалася, але спрацоўвала не заўсёды. Да таго ж на наступны дзень прыходзілася плаціць.

Але гэта было не так істотна. Ён паспяваў прыгадаць самае важнае.

* * *

Калі ў гэтым была алхімія, дык іншага кшталту.

Ён быў толькі глінай, замесам Творцы.

А мог стаць золатам.

Каб стаць золатам, трэба было пачаць з першапачаткаў, вярнуцца ў магчымасць.

Выскачыць з лузаў, у якія цябе заганяе свет.

Захлынуцца, патрапіць у няўцямнае.

Дайсці да самага скраю.

* * *

Так, было дзве магчымасці. І два жаданні.

Усё ж такі дайсці да канца. Зазірнуць за скрай. Адчуць, што там. Супакоіцца, абудзіцца. Можа, нават сустрэць мінатаўра. Альбо сфінкса. Апошні бой. Велічны і трагічны. Загінуць. Альбо вярнуцца з ключом, з разуменнем. І нарэшце перастаць залежаць ад выпадковага.

Ці іншае. Выбрацца з катакомбаў. Удыхнуць паветра. Выйсці навонкі і напоўніцу пражыць тутэйшую долю. Здарыцца як выпадковае, але істотнае. Вычарпаць сваю карму.

Прыняць свет як дарунак. Як просты лабірынт з няпростай лініяй лёсу. Як залатую маску.

* * *

А можа быць, ёсць яшчэ нешта трэцяе?

Трэцяя, іншая сцежка, у якой ягоная няпэўнасць, негатоўнасць стаць кімсьці ўсё ж такі мае сэнс. Выглядае не як затрымка, а як форма формаў.

Салодкія вусны, яны тады паабяцалі штосьці большае, чым проста асалоду, уцеласненне.

І не падманулі, хаця адкрылася зусім іншае.

Давер да жыцця, што б'е і ратуе.

Ён тады не паверыў да канца. У тое, што гэта можа быць шляхам, а не адхіленнем.

І што там можна застацца.

* * *

Штукар і алкаголік, паўзвар'яцелы актор, які граў ролю прарока з жарсцю, але зусім без стылю — прарокі не атрымліваюць службовыя кватэры ад СП, — памірае сярод крыві і ванітаў, захлынуўшыся адзінотай на сваёй вышыні, — запісаў Францішак чырвонай асадкай.

І што? Культура раскідае сеткі, спрабуючы пераўтварыць антычную трагедыю ў салодкі і сентыментальны комікс, — ён памёр, таму што так любіў радзіму, альбо таму што так пакутаваў за вас, засранцы, альбо хацеў адляцець у вырай, разам з белаю лебеддзю.

Хто-колечы паспрабаваў зразумець, што адбылося?

Пра гэта можна было б пісаць эпас:

Малады хлопец з вёскі, актор, шукае сваю форму, пачынае пісаць вершы, рвецца наверх, да вядомасці, да таго, што здаецца яму вяршыняй, гэта не так проста, на вяршыні ёсць агляд усяго…

Кіта стоцяле — рэфармату, сказаў голас з дынаміка, дзверы зачыніліся.

* * *

Што ён убачыў там, на вяршыні?

Сябе самога, бяспечную, мёртвую, забальзамаваную чарапаху ў Храме? Што з гэтага было праўдай? Што з гэтага магло б быць праўдай?

Ён думаў, што закліканы да сінтэзу, да прароцтваў, а ягоная доля была ў іншым — усё губляць, заставацца ні з чым. І разумець, што гэтае "нішчым" і ёсць яго паэзія. А не Бацькаўшчына, як ён думаў, і не тэатр аднаго актора…

Кіта стоцяле — сапегос, сказаў мілы жаночы голас з дынаміка.

* * *

Мы цяпер жыхары Восені, запісаў Францішак зялёнай асадкай.

Усё істотнае сышло ў глыбіні. На паверхні засталася пара-тройка штукароў, камедыянтаў, без якіх нам было б вельмі складана пераждаць гэтую Ноч Свету.

Яны цёплыя, душэўныя і выкшталцоныя. Яны ўвесь час перад публікай: дастаюць зайцаў і драконаў, запальваюць феерверкі, расказваюць гісторыі.

Усё гэта дазваляе нам маўчаць у нашых глыбінях.

Кіта стоцяле — нямянчынес плянтас, сказаў голас з дынаміка. На выхад.

5.

Трэба было прайсці ў аўдыторыю, не сутыкнуўшыся з адміністрацыяй.

У яго было адчуванне, што за ім сачылі. І пільнавалі. Нічога канкрэтнага, але кожны раз заставалася пачуццё няёмкасці.

Як быццам пра яго штосьці ведалі. І штосьці мусіла адбыцца. Альбо нават ужо адбылося, а ён пра гэта не здагадваецца.

Увесь час паўставалі нейкія пытанні. Раптоўна высвятлялася, што ў планах нешта не так, справаздачы здадзеныя не ў тэрмін, трэба запаўняць чарговую анкету. Францішак усміхаўся і ветліва хітаў галавой, пагаджаўся. І забываў пра ўсё практычна адразу.

І чым больш балаў выстаўлялі яму студэнты, тым больш непрыхільна глядзелі на яго ў дэканаце.

* * *

Гэта пачалося пасля яго выступлення на семінары. Ён збіраўся адсядзецца, паслухаць іншых. І ясна, не хацеў нікога пакрыўдзіць.

Спрачаліся пра мысленне. Пра тое, што з намі адбываецца, калі мы спрабуем думаць. І ці можна гэтаму навучыць. Адзін за адным выходзілі выступоўцы.

Расказвалі, што пра гэта напісаў А., як гэтаму вучыў Г. Потым запыталі яго, папрасілі выказаць меркаванне.

Акадэмічная філасофія не думае, сказаў ён тады. І не толькі таму, што не ўмее. Альбо не хоча. У яе іншыя задачы.

Яна працуе з мёртвымі ідэямі. Халодныя, вычарпаныя дарэшты, бяспечныя, яны ціха ляжаць на палічках канона.

З імі лёгка. Ходзіш паміж. Перастаўляеш з месца на месца. Здзьмухваеш пыл. Расказваеш наведвальнікам, што дзе знаходзіцца і чаму. Дзесяць год здзьмухвання — і ты ўжо прафесар. Ведаеш, што ляжыць на верхняй паліцы, а што тут, унізе і крыху ўбаку. Што падаюць на сняданак, а што вартае святочнай вячэры пад сухое чырвонае ў кампаніі сяброў-гурманаў.

Жывыя ідэі — зусім іншая рэч. Хіжыя і падступныя. Угрызаюцца і не адпускаюць. Гэта яны цябе выбіраюць. І гэта яны думаюць — з тваёй дапамогай.

Ён не хацеў нікога пакрыўдзіць. Ён проста расказаў пра сябе, пра свой досвед.

* * *

У аўдыторыі сядзела дванаццаць чалавек. Амаль уся група.

Францішак паклаў торбу, падышоў да вакна. Да пачатку заставалася восем хвілінаў, можна яшчэ памроіць. Дрэвы пачыналі восеньскі карагод, вецер разгойдваў шыбы, яны дзынькалі і ледзь чутна звінелі.

У Вільні распачалася восень, ужо даўно. Так, як гэтага хацеў Аляшкевіч. Дзе ягоная кніга? Ці была яна дапісаная? Магчыма, тут, ляжыць у адным з фондаў.

Надзейна пахаваная пад тысячамі папераў: лістоў, дзённікаў, рахункаў.

Ён спрабаваў яе шукаць. Амаль месяц сярод рукапісаў, архіўных справаў. Увесь вольны час, з ранку да вечара. І нават былі зачэпкі. Але потым усё абрывалася на паўдарозе, і ўрэшце, седзячы ва ўтульнай зале, ён пачынаў разумець.

Вось яна, *Кніга восені*. За вокнамі, гартае старонкі дзён.

* * *

Мінулым разам мы з вамі падышлі да важнай тэмы, без якой шмат што ў жыцці — і ў старых цывілізацыях — застаецца незразумелым, сказаў Францішак. Сёння мы паспрабуем асцярожна ў яе ўвайсці.

Мы будзем гаварыць пра *другое нараджэнне*.

З першым усё больш-менш зразумела.

Мы не выбіраем момант свайго з'яўлення на свет. Мы нават не здагадваемся, куды патрапляем.

Але ўсё ж такі нараджаемся. Выпраўляемся ў падарожжа. У той, усё яшчэ хрысціянскай культуры гэта называлі пілігрымкай.

Чалавечае жыццё сплывае ў часе, яго немагчыма затрымаць. Немагчыма ў ім затрымацца. Мы пачынаем гэта разумець у пэўны момант, на пераломе. І тады некаторыя нараджаюцца другі раз: сярод адчаю і жаху, спрабуючы зачапіцца за штосьці трывалае, надзейнае.

Тыя, хто двойчы нарадзіўся, маюць дзве хады: адна ў гэтай рэальнасці, другая ў іншай, нябачнай. І ў той, іншай рэальнасці яны патрапляюць у мейсцы нечаканыя і немагчымыя. Але расказаць, што там здараецца, можна толькі намёкамі.

* * *

Францішак паглядзеў на аўдыторыю. Усе сядзелі ціха. Хлопец на апошнім шэрагу даставаў з торбы сшыткі.

Ён папрасіў не карыстацца ноўтамі і дыктафонамі: тое, што вам патрэбна, — гэта невялікі экранчык унутры вас, сказаў ён на першай сустрэчы.

Калі настройкі не збітыя, на ім адаб'ецца ўсё і ўсё застанецца.

Надзіва, гэта спрацавала, і большасць запісвала ад рукі.

* * *

Яшчэ раз. Пачнем ад самага пачатку.

Чалавечыя істоты выходзяць на святло і зноў хаваюцца ў цемру. Гэты працэс не мае яснага пачатку і не прадугледжвае натуральнага сканчэння.

Падчас свайго часовага перабывання яны праходзяць праз свет у здзіўленні і роспачы, радасці і страху. Пакорлівай пераляканасці і адчайным бунце.

Шмат хто сыходзіць дачасна: самыя нецярплівыя выбіраюць самагубства, іншыя — супадзенне з маскай. Некаторыя паміраюць пры жыцці, частка так і не нараджаецца.

Частка выбірае тутэйшую долю.

Вырашае застацца тут, сярод бытнага.

Угрызаецца ў рэальнасць, як быццам яна дадзена аднойчы і назаўсёды.

Потым прыходзіць разуменне, што гэта ўжо было.

Надыходзяць стома, і адчай, і безвыходнасць.

Разуменне таго, што жыццё ўрэшце ідзе ў камель, што пакаленні адкладаюцца, як гадавыя колцы ў дрэве.

І што свет дадзены, каб кожны раз усё пачынаць нанова.

Бо толькі ў часе *штосьці* можа праявіцца.

Час — тое, што ўсё *высвятляе*.

* * *

Некаторым удаецца вырвацца з пасткі.

Расплюшчыць вочы, закрычаць — ад здзіўлення, пераляканай нязгоды. Не супасці ні з чым. Усвядоміць усё.

Паспрабаваць разгадаць загадку нашага з'яўлення. Ці хаця б проста ў яе патрапіць.

Зразумець штосьці важнае, тут і цяпер, сярод выпадковых дэкарацый эпохі.

Знайсці сябе на мяжы бытнага і нябыту.

У прадчуванні таго, што адкрыецца (непазбежна адкрыецца, мусіць адкрыцца) на тым баку, пасля ўсяго.

* * *

Там, на тым баку, мы патрапляем у пэўныя мейсцы. Можна было б сказаць, мы самі і ёсць пэўнымі мейсцамі.

Там, у іншай рэальнасці, можна быць Садам. У якім будуць жыць птушкі, кветкі, драконы.

Альбо пустэчай з пустэльнікамі. Уявіце сабе: мы патрапляем унутр і разумеем, што там анічога няма. Нягледзячы на тое, што навонкі ўсё віруе і танчыць.

Можна амаль вечнасць прасядзець у лабірынце, думаючы пра небяспеку, пра тое, як адсюль выбірацца. А напрыканцы гэтай *амаль вечнасці* зразумець, што мінатаўр — гэта ты.

* * *

Яго несла, метафары складаліся адна за адной. Як быццам нехта невядомы прачнуўся ўнутры яго і захацеў узяць удзел у размове. З таго боку. Хтосьці гаварыў праз яго, ягоным голасам.

Не, гаварыў ён, ён гэта ведаў і адчуваў, але як толькі словы адрываліся, хтосьці далучаўся. Вёў і падказваў, папраўляў, рабіў заўвагі.

Ён відавочна адхіліўся ад асноўнай тэмы.

Трэба было разарваць распавед, пераключыцца на іншае.

Не факт, што ўвогуле яны разумеюць, пра што ён гаворыць. Тэма была складаная, можа быць, самая складаная з усіх. І шмат таямніц каля брамы.

* * *

Кацярына, што вы пра гэта думаеце? Дзяўчына ў другім шэрагу падняла вочы. І адразу апусціла.

Кацярына была выдатніцай, заўсёды акуратна запісвала, адказвала на ўсе пытанні. Яна яму падабалася.

Нагадвала яго самога ў далёкія часы. Калі хацелася ведаць усё. Прачытаць усе кнігі, разгадаць усе загадкі.

А Бог — таксама месца, у якое мы патрапляем? — голас быў зусім незнаёмы і прагучаў аднекуль здалёк, з апошняга шэрагу.

* * *

Ён прыгадаў сон, што прысніў аднойчы.

Ён блукаў па калідорах кватэры, ногі былі ватныя, галава цяжкая. І ўвогуле нешта ішло не так. Ён адчуваў, пачынаў адчуваць гэта на ўзроўні страўніка.

Як быццам бы рэчаіснасць выпала з яго і недзе згубілася.

І нарэшце здагадка: ён памёр і блукае недзе на памежжах рэальнага.

Стала адразу лягчэй, ён нібы патрапіў у сваю форму, ужо як дух. І адразу ў глыбіні пакою адкрылася вакно.

Ён падышоў і пабачыў: чыстая светлая прастора наперадзе, а ўнізе бязмежны акіян, таксама светлы і неверагодна цёплы.

Вышыня была нерэальная і від адкрываўся эпічны, і тут ён раскінуў рукі, як птушка, і скочыў — паляцеў туды, у бок акіяна, не было нават пытання, ці ён разаб'ецца.

Ён ведаў, чамусьці ведаў ці нават памятаў, як усё будзе, і тады адразу неверагоднае шчасце працінае навылёт, вось яно, тое, што там, у той рэальнасці называлі Богам і ад чаго там застаюцца толькі цьмяныя ашмёткі веры, падумаў ён, але тут сэрца скаланулася ад іншай эмоцыі, ён пакінуў за спінай штосьці важнае, дарагое, ён пакінуў там каханых, і гэта адгукнулася цьмяным болем тут, сярод вечнага.

Напэўна, *Хтосьці* таксама адчуў гэты боль у ім, бо раптоўна, па-за сваёй воляй, ён мяняе кірунак, вочы расплюшчваюцца, і ён бачыць людзей вакол, што схіліліся над ім, ён вярнуўся, гавораць яны і нясуць яго на насілках кудысьці — знаёмыя? лекары? — і тут ён прачынаецца.

Ён адзін у кватэры, гатуе гарбату і думае пра дзіўны сон, у якім ён памёр і абудзіўся, пра дзве эмоцыі, шчасце з'яднання з Адзіным, каханне і боль асобнас-

ці, фантастычна важныя, якія ў ім засталіся і сядзяць, як стрэмка. І пра тое, што гэта не можа быць выпадковым.

І тут ён прачынаецца яшчэ раз.

* * *

Шэсцьдзясят адзін цэнт, сказала прадавачка.

У студэнтаў пачалася наступная пара, ён сядзеў амаль адзін у кавярні. Трэба было б узяць пару сасісак і якую салату: калі яны сустрэнуцца з Далюсам, будзе ўжо не да закусак. Далюс прынясе тры дзявяткі.

Я занадта выпакутаваў, выснів сваё жыццё, каб так проста пагадзіцца з новымі правіламі, так тупа быць умантаваным у новую сістэму — і пры гэтым быць удзячным... — запісаў Францішак сіняй асадкай.

Самае страшнае, што яны патрабуюць удзячнасці. І неяк скурай адчуваюць, калі ты *не да канца з імі*.

* * *

Так, чалавечае жыццё — усяго толькі падарожжа, — запісаў Францішак уяўным алоўкам недзе на палёх свядомасці. — У пошуках *мілага прытулку*. Мейсца, дзе можна было б *застацца*. А можа, нават *быць вечна*.

Некаторыя называюць гэтае месца Богам. Некаторыя Адсутнасцю. А некаторыя, як Леа, проста стаяць за стойкай і гатуюць каву.

* * *

На плато доўга свеціць сонца, але нават там яно вымушана заходзіць, — запісаў Францішак зялёнай асадкай.

Чалавечае жыццё раз-пораз падыходзіць да скраю. Напэўна, проста дзеля цікавасці, каб было ясна, што ўтульная паверхня свету — не назаўсёды.

Магчыма, гэта адбудзецца нават сёння.

Чаму не? Духі будуць удзячныя за ахвяру.

6.

Далюс мусіў чакаць яго каля свайго інстытута, і Францішак пацягнуўся на дзевятнаццаты. Звычайна ён вяртаўся на дзясятцы, праз Кальварыю. Даязджаў да прыпынку Шатрыя і далей ішоў пешкі, пакуль не стамляўся.

Шатрыя гучала загадкава, як імя забытага бога, штосьці са старых індусаў. Але вакол віраваў тыпова віленскі раёнчык, з рынкам і тутэйшай трасянкай.

Сёння яны планавалі зайсці ў рэдкую кнігу і паглядзець магістарскую Рамулевіча. 1617 год, ex universa philosophia. Магчыма, гэта ягоны далёкі сваяк. А магчыма, і ён сам, толькі з іншай маскай, у іншых абставінах.

Потым няспешны віленскі шпацыр. Надвячорак, што незаўважна пераходзіць у сутонне.

І далей змрок, ліхтары, чаканне новай эпохі.

* * *

Далюс быў вясёлы й крыху п’яны, як гэта звычайна бывала пасля семінара.

Планы мяняюцца, сказаў ён замест прывітання.

Званіў Жыльвінас. Па ўсіх ягоных раскладах сёння Дзень Вялікага Літоўскага Змея. Мусіць адбыцца

паміж восьмай і дванаццатай. Пачнецца на Зарэччы, у Доме ВКЛ, і далей распаўсюдзіцца на рэшту свету.

Жыльвінас у нас там накшталт шамана. Альбо жраца. Адказвае за святы і рытуалы. Сочыць за наваколлем. Калі знакі складаюцца, выпускае вужоў і ладзіць феерверкі.

Галоўнае, каб гэта не пачалося зарана. Вужы прыпаўзаюць з усяго раёна, пачынаецца паніка. Прыязджаюць паліцыянты і ўсё псуюць.

На маёй памяці гэта адбывалася два разы. І абодва разы фальстарт.

Так што забіраем Ірэну і Відаса. Ідзем на Зарэчча. Там сёння будзе весела. На разагрэве сучаснае мастацтва: *партрэт Мілаша з фуршэтам*.

* * *

Яны далі нырца ў завулак з Дамініканскай, адтуль патрапілі ў нейкія калідоры.

Ірэна сядзела на ўслончыку ва ўнутраным дворыку.

Будзьце ўважлівымі, сказала яна. Некаторыя дзверы зачыняюцца самі сабой, можна застацца ў якім-небудзь катушку вельмі і вельмі надоўга.

Тут многа неспакойных духаў. А яшчэ васіліск. Я часам прыходжу сюды, і ён выпаўзае. Напачатку палохаўся, цяпер прызвычаіўся, ужо не баіцца.

Усе расповеды пра яго — дзіцячыя страшылкі. Забудзьце пра люстэркі. Васіліск — маленькі цмок, пераляканы і сумны. Каралёк, калі па-нашаму.

Дарэчы, сёння ён быў асабліва чуйны. Але тры дзявяткі яму спадабаліся.

Пра васіліска пазней, сказаў Далюс. Цяпер Відас. Ён зноў у Трэцім камісарыяце. Чацвёрты раз за апош-

ні месяц. Вызваліць яго можа толькі цуд. І мы гэты цуд добра ведаем.

* * *

Кабінет быў апошнім па калідоры.

Камісар сядзеў за сталом. Перад ім ляжаў вялікі нож, падобны да мачэтэ.

Гэта зусім не тое, пра што вы падумалі, сказала Ірэна замест прывітання. Рытуальны пуштунскі нож, падораны на памяць, як талісман, за добрую работу. Ад афганскіх дэхканаў.

Знаёмая штучка, сказаў камісар.

Я бачыў такія. Пад Кандагарам, у 1984. Я патрапіў туды пасля вучэбкі. Стаяў у каравуле, вартаваў склеп з прадуктамі. Старэйшыя далі пакурыць. Не ведаю, што там было. Каноплі, мясцовыя траўкі, хімія. Я нават не спрабаваў потым высвятляць.

Забрала практычна адразу. Напачатку радасць, дзікая, амаль жывёльная. Адчуванне магуты. І неўміручасці. А пасля трэцяй зацяжкі з’явіліся яны. Яны ішлі моўчкі, і ў кожнага быў такі нож.

Я дзейнічаў дакладна па статуце, першыя стрэлы ў паветра, потым на паражэнне, але яны адбівалі кулі, як гумовыя мячыкі. Гэта было страшна.

Вярнуўся ў прытомнасць толькі ў вайсковым шпіталі.

Там мне расказалі, што я гераічна ўварваўся ў склеп і расстраляў тры скрыні бляшанак з тушанінай. Усе пахаваліся. Мне яшчэ пашэнціла. Тушанінай аб’ядаліся два тыдні. Калі б хто пацярпеў, усё павярнулася б у іншы бок.

Мне далі медаль, за вайсковую адвагу. Каб замяць справу. Паводле рапарта, я праявіў пільнасць на пасту, своечасова "абнаружыў" напад душманаў.

З медалём мяне прынялі на юрфак без іспытаў. Герой вайны, усё такое. Запрашалі на вечарыны ў школы, прасілі расказаць пра подзвігі. І пасля кожнага выступу прыходзілі яны. Пагражалі нажамі, штосьці гаварылі. Рэзкія, гартанныя гукі. Я не вытрымаў, сышоў на чацвёртым. Перавёўся на фарсі, у інстытут вайсковых перакладчыкаў.

Раз-пораз яны і цяпер з'яўляюцца. У снах. Але ўжо без нажоў. І галоўнае, я ўсё разумею, што яны гавораць.

Нажы ім цяпер не патрэбныя, сказала Ірэна. У іх дэмакратыя. Выбары. Відас быў назіральнікам, дапамагаў ім зрабіць усё правільна.

У іх ёсць Румі і Хафіз, сказаў камісар. Не кажучы пра прарока Мухамада. Навошта ім яшчэ дэмакратыя?

* * *

У мінулы раз быў бумеранг, сказаў камісар. Падарунак ад абарыгенаў Аўстраліі. Таксама за добрую работу. Які ляцеў проста ў паліцэйскі патруль. Яны склалі рапарт.

Не зусім так, сказала Ірэна.

У мінулы раз яго папрасілі дзеці. Яны ніколі не бачылі бумерангаў. Дзеці — кветкі жыцця, як можна ім адмовіць. А патруль з'явіўся нечакана. Выйшаў з-за рога вуліцы. Усяго толькі падбітае вока і пералом мезенца правай рукі. Паліцыянт быў проста шчаслівы: атрымаў грашовую кампенсацыю і пазачарговы адпачынак.

А перад гэтым быў афрыканскі кій, з якім вы напалі на мірных грамадзянаў.

Камісар вагаўся.

Тады патруль у рапарце асабліва падкрэсліў, што вы былі п'яныя і ўяўлялі рэальную небяспеку для гасцей нашага горада.

Мы былі звычайныя, такія, як заўсёды, сказаў Далюс.

Гэта госці былі небяспекай для нас, сказала Ірэна. Яны прыехалі з Усходу, ішлі з сабакамі і спявалі *кацюшу*.

Мы ім зрабілі заўвагу. Ветліва папрасілі. У адказ яны пачалі брудна лаяцца. Тады мы былі вымушаныя паклікаць на дапамогу афрыканскіх духаў. Паверце, гэта было надзвычай эфектыўна.

Камісар усё яшчэ вагаўся.

Мусілі быць дадатковыя аргументы.

Дарэчы, сказаў Францішак, пра бумерангі. Сабакі — гэта найгоршае, што можа цябе напаткаць на Усходзе. Каты там — амаль бадхісатвы, а сабакі — не, адны з найніжэйшых.

У нас усё па іншаму. Сабака — лепшы сябра, мы ведаем са школы. І гэта праблема.

Альбо там сабака ацэнены несправядліва, і на Захадзе разгледзелі штосьці важнае. Альбо Усход мае рацыю, і Захад зрабіў кармічную памылку, якая яму добра яшчэ адгукнецца.

Проста людзі ў нас тут бліжэй да сабакаў, сказаў камісар. У раёне трэцяга камісарыята. Прынамсі значна ніжэй за котак.

Забірайце вашага сябра.

* * *

Каля Святой Ганны стаяў Міцкевіч, узнёслы і задуменны.

Ягоныя вочы былі мяккія і вільготныя, як быццам бы ён ведаў штосьці важнае пра сутнасць часу.

Пра што тады яму спявалі сірэны, запытаўся Францішак. Ціха, амаль нячутна. І дзе цяпер тыя галасы? Эмануэль Ляхніцкі. Граф Грабянка. Прыўкрасны Аляшкевіч.

Як ім патрапіла тады паверыць? і чаму цяпер мы не можам быць як яны? Ідзем праз пустэчу бытнага, нязграбна і бессэнсоўна.

* * *

Мілы балаган, сцэна, спектакль доўжыцца ўжо не адно тысячагоддзе, — запісаў Францішак зялёным колерам.

Штукары ў стракатых вопратках, з эфектнымі фокусамі.

Усе пляскаюць у ладкі, усе задаволеныя.

Час пафасных фэйкаў. Эмацыйнага шантажу. Саладжавага порна духу.

І дэмакратычнага кансэнсусу, як любіць дадаваць гандляр квіточкамі на ўваходзе.

Праблема толькі адна.

На трэцім шэрагу, справа, сядзіць чараўнік. І ў ягоных кішэнях сапраўды поўна галубоў і драконаў.

7.

Будынак вылучаўся з усяго навокал. Ён быў падобны на калядную цацку альбо касмічны карабель з іншапланетнікамі, што зазірнуў на хвілінку, ды так і застаўся сярод тубыльцаў. Старая фарба аблезла, але яшчэ можна было прачытаць словы на фасадзе.

LDK Namai — ДОМ ВКЛ.

Тут было два ўваходы і тры паверхі, калідоры, у якіх можна было заблукаць, і шмат пакояў. Разеткі, надзіва, дзейнічалі, хаця без лічыльніка: незразумела, хто плаціў за электрычнасць. Ваду, праўда, прыходзілася насіць з вуліцы, з калонкі. Была таксама прыбіральня, адна на ўвесь будынак.

* * *

Пасля перамогі было многа пустой прасторы, сказаў Далюс. У жыцці і ў галовах. Калі мы захапілі будынак, ідэя з’явілася сама. Мы нават не абмяркоўвалі іншыя варыянты.

Дом ВКЛ, напісалі мы на сцяне вялікімі літарамі.

Адсюль, сказалі мы сабе, адродзіцца слава старой Літвы. Не будзем паўтараць памылку дваццатых. Маленькая рэспубліка з малочнымі рэкамі ды смятаннымі берагамі. І амаль зусім без мастацтва. Спачатку ніхто не звяртаў на нас увагі.

Мясцовыя раз-пораз прыходзілі. Звычайна ў сутонні. Сядалі ў дворыку і глядзелі.

Потым з'явіліся паліцыянты. Толькі Гедымінас меў здольнасць з імі дамаўляцца. Ён і абвясціў сябе Вялікім князем. Хаця была апазіцыя, гэта праўда. Не ўсе былі згодныя на тэхнічную інтэлігенцыю.

Жыльвінас таксама прэтэндаваў на ўладу. Ён тады быў зусім іншы. Больш вясёлы і піў меней.

Распачаўся карнавал. Гэта быў самы шчаслівы час. Свята было штодня.

Думалі, што ўсё скончыцца разам з намі. Але ўвесь час прыходзяць новыя людзі. Не ведаю, хто яны і чаго тут шукаюць.

Гэта ўжо трэцяе пакаленне. Старых засталася зусім жменька.

* * *

Жыльвінас, вялікі літоўскі шаман. Жыве на паддашку. Нарадзіўся ў Сібіры, у сям'і выгнанцаў. Бацькі памерлі рана, ён выхоўваўся сярод мясцовых. Па-літоўску ўсё разумее, але амаль не гаворыць.

Раз на год абвяшчае Дзень Вялікага Літоўскага Змея. Не заўсёды яму вераць. Часам ён застаецца зусім адзін. Але вужы збіраюцца з усёй акругі, гэта праўда. Не ведаю, чым ён іх бярэ. Гаворыць, што ў яго свірысцёлачка і што яны самі яго шукаюць.

* * *

Гедымінас. Ён лічыцца вялікім князем, хаця бывае тут вельмі рэдка.

Па чутках, у яго камп’ютарная фірма ў Коўне. І вялікі маёнтак.

Ён дае хабар электрыкам і трымае дамову з паліцыянтамі.

Дарэчы, тут ёсць і беларускі пакой.

Хто там толькі ні кантаваўся. Нават месцілася рэдакцыя газеты. *Ваша доля*, здаецца. Ці *Наша воля*. Не памятаю дакладна.

Цяпер там жывуць Ася і Кася, актывісткі з Магілёва. Мілыя дзяўчаты.

Заклеілі Звярынец плакатамі *Дзе Ганчар*.

Шкада, што лесбіянкі.

* * *

Напрыканцы калідора і налева — дзверы. Пані Зося. Яна мясцовая, з-пад Дэвянішак. Гаворыць на трасянцы. Але падчас спірытычных сеансаў па-французску, на лаціне і па-арамейску.

Часам просіць называць яе пані Агатка. Але неяк няўпэўнена, як быццам не пра сябе.

Пасля сеансаў не памятае, што гаварыла. Здаецца, не памятае і як яе завуць.

Навонкі, зрэшты, яе бачаць вельмі рэдка. Такое ўражанне, што яна нікуды не выходзіць. Са свайго пакоя.

Некаторыя лічаць, што яна тыпу прывід. Выпадковая матэрыялізацыя, не ў сваім часе. Ну, ты разумееш.

* * *

Ёсць яшчэ Тэдзі. Свае карціны ён падпісвае *пан Тадэвуш*.

Ён адзіны з тутэйшых, нарадзіўся на Зарэччы.

У дзяцінстве марыў стаць віленскім *аль капонэ*. Але пайшоў у мастацкую школу і цяпер амаль славутасць. Карціны ў прыватных калекцыях па ўсім свеце. Выставы ў Нью-Ёрку, Стакгольме, Рызе, Капенгагене.

Хаця ў душы так і застаўся маленькім бандзітам.

Ягоная майстэрня — наверх і направа па калідоры. Мы, уласна кажучы, туды й ідзем.

* * *

Тэдзі сядзеў у цэнтры пакоя, у вялікім фатэлі.

Справа ад яго стаяў мальберт, прыкрыты тканінай.

Злева і крыху ўглыбіні, прытуліўшыся да сценкі, стаяў дырэктар Французскага інстытута, з сакратаркай. Падобны да палкоўніка ў адстаўцы. Гэта была яго першая імпрэза на новым месцы працы.

Справа, адразу за мальбертам, сціпла хаваліся два сталы з адкаркаванымі бутэлькамі бардо. І канапкамі.

Прысутнічаў таксама журналіст з *Летувос рытас*.

З незалежнай публікі яны былі першыя. Падобна, што і апошнія. Да пачатку прэс-канферэнцыі заставалася дзесяць хвілінаў.

Тэдзі паліў самакрутку і размаўляў сам з сабой.

* * *

Быў час, калі я іх абагаўляў. Быў час, калі ненавідзеў.

Цяпер я іх проста разумею.

Усё жыццё на задворках вялікай традыцыі. Вартаўнікі сэнсу, даглядальнікі канона. Ім не патрэбнае мастацтва прыгожае і нават мастацтва істотнае. Такім у іх завалены ўсе музеі.

Ім патрэбна імгненнае прасвятленне.

Як удар палкай чаньскага майстра. Яны чакаюць гэтага ўдару, што нарэшце перавядзе стрэлкі на нуль і пачнецца новая эра.

Толькі гэта можа выратаваць самотны Захад, а разам з ім і рэшту спакушанага ім свету. Якая глядзіць на яго, як трус на ўдава.

* * *

Тэдзі, гэта Францішак, сказаў Далюс.

Францішак, гэта Тэдзі, сказаў Тэдзі.

* * *

На мінулым тыдні, сказаў Далюс, Тэдзі ўкусіў крытыка Л. На выставе. І гэтым справакаваў новую дыскусію пра мэты і задачы мастацтва ў сучасную эпоху.

Цяпер усе спрачаюцца, ці гэта быў мастацкі ўкус і ён хацеў сказаць гэтым штосьці важнае, альбо чысты акт хуліганства.

І ці быў тут элемент плагіяту. Бо, як падлічыў адзін эксперт, крытыкаў кусалі ў мінулым стагоддзі каля сарака разоў. І гэта толькі вядомыя, дакументальна пацверджаныя выпадкі.

Тэдзі ўсміхнуўся радасна і прыязна. Было бачна, што яму прыемна пра гэта думаць.

Гэта быў не мастацкі ўкус. А ўкус мастацтва!

І ў той жа час акт вялікай постхрысціянскай міласэрнасці для Л. Бо няма анічога больш пустога і бессэнсоўнага для традыцыі, чым вучоны крытык, які ведае, што *ўсё ўжо было*.

І які на кожнае тваё слова здатны прыгадаць тры чужыя, *такія самыя*.

Я проста хацеў вярнуць яму яго самога.

Сказаць, што мастацтва — гэта заўсёды тое, што здараецца з табой асабіста. Усё, што было да таго моманту, неістотна.

Бо, калі гэта здараецца, яно менавіта цябе кусае.

* * *

Зазвінеў стары будзільнік у правым куце. Гук быў пранізлівы і рэзкі. Усе ажывіліся.

Прэс-канферэнцыя можа лічыцца закрытай, сказаў Тэдзі.

Яна была прысвечана важнай постаці, і зусім не выпадкова, што ўсё адбылося ў Вільні, горадзе Вітаўта і Альгерда, паўночным Ерусаліме нашых душаў, прытулку сноў і мрояў, сёння сталіцы незалежнай Літоўскай Рэспублікі. Дзякуй Французскаму інстытуту за шчодрую дапамогу. Калі больш няма пытанняў, можам пераходзіць да віна і канапак.

* * *

Адкрытай, паправіла сакратарка з прыязнай усмешкай. Прэс-канферэнцыя можа лічыцца адкрытай.

Француз галантна і ледзьве заўважна нахіліў галаву. Ён пакуль яшчэ не разумеў па-мясцоваму і таму хітаў галавой раз на некалькі хвілінаў, на ўсялякі выпадак.

Тэдзі ўсміхнуўся ў адказ і працягнуў прамову.

Адкрытай ці закрытай, гэта пытанне перспектывы. З якога боку рэальнасці мы глядзім. Больш важна — на

ёй я збіраўся прадставіць — урбі эт орбі — партрэт Фердынанда Мілаша. Напісаны ў традыцыйнай манеры, алейнымі фарбамі на палатне памерам…

Оскара Мілаша, паправіла сакратарка. Яна ўсё яшчэ ўсміхалася, але ўжо крыху трывожна. Па яе скуры пачыналі поўзаць мурашкі, і гэта відавочна было благім знакам.

Тэдзі паглядзеў на яе яшчэ раз, пяшчотна і бязлітасна.

Так, усе іх блытаюць, сказаў ён. Пра Фердынанда мала хто ведае. Фердынанд мой улюбёны.

Каб вы лепш зразумелі, я раскажу вам казку. Пра трох братоў: Оскара, Чэслава і Фердынанда. Оскар выбірае Літву, нарадзіўшыся ў сэрцы Крыўі. Чэслаў выбірае Польшчу, нарадзіўшыся ў сэрцы Літвы.

Звыклая логіка дзеі патрабуе, каб трэці закальцаваў цыкл: выбраў Крыўю, нарадзіўшыся ў сэрцы Польшчы. Але ўсё больш складана. Фердынанд не выбірае ўвогуле. Ён застаецца сярод магчымасцяў. І проста цярпліва чакае.

Углядаецца ў прастору. Адгукаецца на тое, што яго магло б выбраць. Ніхто не ведае, дзе і калі ён нарадзіўся, дзе і калі памёр. І ці памёр увогуле.

* * *

Тэдзі тэатральным жэстам скінуў покрыва з мальберта.

На вялікім палатне, 160 на 230, была намаляваная сцяна драўлянага дома, асветленая веснавым сонейкам.

Перад ёй сядзеў важны шэры кот. Ён быў намаляваны ў рэалістычнай манеры. Толькі вусы былі крыху задоўгія, і гэта насцярожвала.

Унізе было падпісана: Фердынанд Мілаш, эсквайр.

Партрэт выкананы ў манеры метафізічнага рэалізму, сказаў Тэдзі.

Гэта ягонае мінулае ўвасабленне. Перад тым, як стаць Фердынандам Мілашам, ён быў катом. Ён сам прыгадваў пра гэта ў ненадрукаваным дзённіку.

Калі мне пашанцуе і я патраплю ў адпаведныя Архівы, я напішу пра яго кнігу, сказаў Тэдзі.

Ужо ёсць дамоўленасць з Польскім інстытутам у Рыме.

* * *

Я думаю, што ў Архіве Марэлі абавязкова знойдзецца пра яго вялізная тэчка, сказаў Францішак. Там любяць такіх герояў.

Назва кнігі мусіць быць запамінальная, сказала Ірэна.

Напрыклад: Біяграфія Фердынанда М., напісаная сціпла, без выкрунтасаў.

Гэта вельмі цяжкая задача для Тэдзі, сказаў Далюс. Напісаць яе без выкрунтасаў. Кароткімі простымі сказамі. Не ўжываючы прыметнікаў.

Так, сказаў Францішак, гэта будзе няпроста. І пачынацца яна мусіць з фразы: Фердынанд М. так і не паспеў нарадзіцца ў сваім часе.

* * *

Мэрд, падумаў дырэктар Французскага інстытута. Гэта была яго першая думка за гэты вечар. Ён усё яшчэ не разумеў, што адбываецца. Але пазл у яго галаве пачаў складацца ў цэлае, і гэтае цэлае яму не падабалася.

Сакратарка стаяла збялелая. Гэта яна параіла дырэктару цудоўны праект з адным з найбольш цікавых прадстаўнікоў сучаснага мастацтва.

Затое ў карэспандэнта відавочна было акмэ. Ён ліхаманкава рыхтаваў фотаапарат і чакаў наступных падзеяў.

Досвед падказваў яму, што кульмінацыя ўжо блізка.

* * *

Удар злева быў элегантны і нечаканы.

Удалося адхіліцца направа, але гэта не выратавала. Блок быў прабіты, і кулак праехаўся каля вока, спыніўшыся ў міліметры ад носа.

Усё ж такі прафесіянал, паспеў падумаць Тэдзі. Справа і крыху знізу ішло дадаткам, сківіца прыняла ўдар, зубы гучна шчоўкнулі і занылі.

Пад левым вокам ужо пякло, там рыхтавалася выйсці на свет фіялетавая гематома, па-простаму — фінгал.

Дырэктар Французскага інстытута быў задаволены і гатовы да новых праектаў.

* * *

Удар у адказ быў падступны і не менш прафесійны.

Дырэктар нават не заварушыўся. Было ўражанне, што *там* у яго *каменныя*. Некалькі секундаў. Але потым стала ясна, што ўражанне памылковае. Ён сагнуўся і пачаў апускацца на падлогу, раз-пораз выдаючы цяжкія стогны.

Сакратарка анямела ад жаху і сораму.

Яе працоўны дзень падыходзіў да канца і меў усе шанцы стацца апошнім.

* * *

З левага кута пстрыкаў фотаапарат, у неверагодным тэмпе.

Гэта было нават лепш, чым мастацкі ўкус. Сапраўднае ўпрыгожанне заўтрашняга нумара. А з фотаздымкамі патрапіць і ў нядзельны дадатак пра культуру.

Засталося прыдумаць загаловак.

Дырэктар Французскага інстытута быў збіты на адкрыцці выставы.

Занадта суха. Няясна, хто біў і навошта. І якой выставы. Да таго ж дырэктар пачаў першы, гэта таксама трэба было ўзгадаць, дзеля журналісцкай аб’ектыўнасці.

Удар па яйцах на мастацкай выставе Фердынанда Мілаша.

Жорсткі трэш. Незразумела, чые былі яйцы. Да таго ж можна падумаць, што Мілаш — гэта аўтар выставы.

Фердынанд Мілаш наносіць удар у адказ.

Ужо штосьці. Намёк на класіку поп-культуры. Дадатковыя сэнсы, якія незаўважна кампенсуюць адсутнасць асноўных. І не так крыўдна для пацярпелых, гэта таксама важна.

Трэба было бегчы здаваць матэрыял.

На стале ціха стаялі адкаркаваныя бутэлькі бардо.

На пах пачыналі падцягвацца жыхары Дома.

* * *

Тэдзі шчасліва ўсміхаўся.

Добры чалавек, сказаў ён. Адразу ўсё зразумеў. Павёў сябе адэкватна. І ўдары прафесійныя. Бачная школа. Хутчэй за ўсё, спецназ. У скрайнім выпадку — Замежны легіён.

Яны менавіта такіх сюды дасылаюць. Падымаць культуру.

* * *

Пра ўдары я ведаю амаль усё. Без гэтага на Зарэччы выжыць было б немагчыма.

Каму, як, чым і з якой сілай ударыць — у гэтым была мудрасць, і іерархія, і цэлая філасофія. Цябе б'юць у сківіцу, напрыклад, але ты разумееш, што гэта ад радасці, проста форма вітання. Альбо пстрыкаюць па носе, а ты халадзееш ад жаху, бо ведаеш, што далей можа быць фінка альбо заточка.

А з падсрачнікамі цэлы космас. Не было большай асалоды, чым з лёту, нечакана і пяшчотна, адправіць калегу ў аўт.

І ніхто не крыўдаваў ніколі. Усе ўсё разумелі.

Як той казаў, *страшны жэчы на Зажэчы*.

* * *

Міцкевіч таксама пра гэта ведаў, сказала Ірэна.

Кажуць, напрыканцы жыцця напісаў двухрадкоўе. Па-беларуску.

На страшным судзе
Усім у сраку будзе.

* * *

Сёння людзі ўжо не тыя, сказаў Тэдзі. Практычна паўсюль. Таму, калі мы чытаем Вялікія Заходнія Кнігі, мы плачам.

Гільгамешы і Майсеі. Ахілы і Дон Кіхоты. Гамлеты і Вертэры. Вялі заблытанае чалавецтва наперад, адкрывалі будучыню, стваралі новыя сэнсы.

І ў нас бывалі гераічныя эпохі. Пётр Скарга, Леў Сапега, Мацей Бурачок.

А які раней быў Усход! Такія шыкоўныя гістэрыкі. Спакушэнні хлябамі, інквізітары. Студэнты з сякерамі. Бабулькі-працэнтшчыцы. Я ведаў адну такую тут, на Зарэччы. Але яе так проста не возьмеш. Крэпенькая бабулька. І пільная.

На Усходзе тады былі галюцынацыі, сказаў Францішак. Інтаксікацыя мёртвым богам.

Ёсць яшчэ тры дзявяткі, сказала Ірэна. Нераспачатыя.

* * *

Каб зразумець, што адбылося, мы мусім трымаць у галаве асноўнае запытанне, сказаў Відас.

Хто ён, чалавек? Дзірка сярод бытнага, якую штырыць ад перадазіроўкі рэальнага, ці ўсё ж такі правы мае — на сваю радавую сутнасць, адчужаную ад яго бязлітаснай хадой гісторыі.

Пра першы варыянт сведчыць тысячагадовая традыцыя філасофскага мыслення, якое правальваецца ў гэтую дзірку, бясконца прадукуючы ўсё новыя і новыя карціны свету.

Другі больш аптымістычны і менш старажытны. Налічвае ўсяго некалькі стагоддзяў. Падчас якіх спакушанае чалавецтва села на хвост прыродзе як яе гаспадар і карыстальнік. І пакуль зусім не збіраецца з яго саскокваць.

* * *

Чалавек сёння — гэта вяроўка між малпай і макдональдсам, сказаў Далюс. І дзіркі даўно ўжо няма. Там цяпер кантэйнер для смецця. Вываз кожную пятніцу, з 16.30 да 18.00. Фірма Спайдэрз энд санз.

Хутчэй першы, чым другі, сказала Ірэна. Хаця правы ён, безумоўна, мае. Заваяваў, зайка, у працэсе натуральнага адбору.

Нічога, мы яшчэ пашаманім, сказаў Францішак.

* * *

Жыльвінас стаяў на калідоры і паліў цыгарэту.

Сёння важны дзень, сказаў ён кудысьці ў паветра замест прывітання. Дзень Вялікага Літоўскага Змея. У гэты дзень уся Літва крыху бліжэй да неба.

Гэта вельмі старая гісторыя. З часоў, калі цмокі былі, як людзі. Жылі на горных вышынях, далёкіх і непадступных. Усё разумелі. Апекаваліся нашым светам.

Потым яны зніклі. Але адзін застаўся. У марскім палацы. Ён паабяцаў, калі раптам здарыцца канец нашага свету, ён прыляціць і забярэ з сабой усіх літоўцаў.

Ёсць адмысловыя куфры. Вялікія, цяжкія. У іх складаюць усё самае патрэбнае. У звычайныя дні іх не падняць і чатыром. Але калі надыходзіць Дзень Змея, яны самі ўздымаюцца ў паветра, як касмічныя чаўны.

Кожны літовец можа ўзяць з сабой яшчэ аднаго чалавека.

Выратаваць. Так што не бойся. Мы цябе не пакінем.

Там, за нябёсным шклом — тысяча іншых светаў. У гэты дзень мы можам дакрануцца да іх рукой. Адчуць, як пульсуюць, тахкаюць іх сэрцы…

* * *

Ён да чагосьці рыхтаваўся, унутры сябе.

Калісьці мы думалі, што яны вернуцца. Але яны не вярнуліся.

Можа, мы недастаткова верылі. А можа, у іх не засталося веры. У тое, што мы чагосьці вартыя.

Цяпер наша цывілізацыя — як прытулак для хворых.

* * *

Хто яны, ціха запытаўся Францішак. Пра каго ён гаворыць?

Пра Цмокаў, сказала Ірэна. Ці Багоў. Ці пра ўсіх разам. Большую частку жыцця ён праводзіць там, з імі. Калі вяртаецца, крыху расказвае. Але цяпер ужо значна менш і не ўсім.

* * *

Яны смяюцца, сказаў Жыльвінас. Я адчуваю гэта.

З нас. З нашай пыхі. З нашай дурасці. Глядзяць на нас і смяюцца. Смех усё ўзмацняецца, я гэта чую. І сёння яны лопнуць ад смеху. Гледзячы на наш свет.

Гэта ў яго ломка, сказала Ірэна, ён адчувае недастачу, але насамрэч ідзе перабор.

* * *

Потым яны зноў нараджаюцца. Да канца памерці яны не ў стане. Гэта не ў іх уладзе.

Але, калі там яны паміраюць, тут у нас становіцца асабліва халодна. І сіратліва.

Хтосьці ўсё гэта задумаў менавіта так.

* * *

Вялікі Літоўскі Змей — гэта кароль вужоў, сказала Ірэна.

Пра яго распавядаюць у старэйшых групах дзіцячага садочка.

Ён жыве ў моры, пад хвалямі. І, ясна, чакае, пакуль прыгожая дзяўчына не пачне купацца. Тады ён хапае дзяўчыну і цягне яе ў свой палац. Палац марскі, але самы сапраўдны. І дзяўчына — самая прыгожая.

Усе застаюцца ў плюсе.

Літоўцы вельмі любяць гэтую гісторыю.

* * *

Ціхо вшэндзе, глухо вшэндзе, — сказала пані Зося трагічным шэптам.

У далёкім куце хтосьці засмяяўся.

Яны зайшлі ў пакойчык, калі ўжо ўсё пачалося, фіранкі на вокнах былі шчыльна задзёртыя. Падлога была засланая кілімам, мэбля старая, хутчэй за ўсё, даваенная.

Пасярэдзіне стаяў вялікі стол з прыладамі. Усе сядзелі вакол яго ў паўцемры, узяўшыся за рукі.

Было тры вольныя месцы, як быццам пра іх ведалі. І чакалі.

Францішак не адразу паверыў, што гэта рэальна.

* * *

Пані Зося глядзела кудысьці ўбок, у самы кут пакойчыка, уважліва і пільна. Нейкім іншым, адсутным позіркам.

Першая фраза была ідэальная.

Няясна было толькі, ці гэта яна сама прыдумала, ці хтосьці з духаў весяліцца.

Так, гэта маглі быць духі, якіх забаўлялі нашыя спробы наладзіць з імі кантакт. Але мог быць і пан Адам. Чаму не?

Улюбёны горад, зусім побач кватэрка, у якой ён правёў столькі часу. Да таго ж уласны помнік каля святой Ганны, гэта таксама прыцягвае.

Сапраўды, а як паведаміць адтуль, што гэта менавіта ты? Не скажаш жа наўпрост. З іншага боку, і занадта ўскосныя намёкі маглі не спрацаваць.

* * *

Ён разгубіўся, бо так і не выбраў суразмоўцу.

Можа быць, Аляшкевіч? Запытацца пра рукапіс. Ці бедны Эміліа? Ці Адам М., мілы і сумны вешч? Альбо нават Андрэй Т.

Мусіў быць хтосьці з мясцовых, тых, хто яшчэ памятае гэтыя вулкі. Ён ніяк не мог настроіцца, патрапіць у тон.

А запытацца можна было б шмат пра што.

Пра спектакль. Пра актораў. Чаму ёсць свет, а не Нішто. І што адкрылася, раптоўна, гэтаму *когіта*. Тады, у сямнаццатым стагоддзі. Калі выбралі практычную магію замест метафізікі.

* * *

Ужо хвілінаў пяць ён сядзеў моўчкі.

У галаве круціліся розныя бязглуздыя фразы.

Што там, пасля смерці?

На якой мове вы там гаворыце?

Ці бачылі вы там багоў, альбо іх сапраўды прыстрэліў Борхес у адным са сваіх сноў пры спробе вяртання?

Усё гэта гучала недарэчна. Нейкая вар'яцкая каша.

Раптам ён адчуў прысутнасць. Побач. Як быццам лёгкі ветрык, каля самых скроняў.

Хто тут? — падумаў Францішак. І далей, не чакаючы адказу:

Гэта Вы, Майстра?

* * *

Чыйсьці голас у яго галаве выразна прамовіў:

Тут я зусім не майстра. Тут няма чаго майстраваць. Усё ўжо даўно змайстравана.

І далей, праз некалькі секундаў, ціха, амаль інтымна.

Вакно адчынена. У куточках вуснаў: сунічны страх, жоўтае шчасце.

* * *

Голас быў знаёмы, ён ужо гучаў сёння ў яго свядомасці. Альбо ў рэальнасці, ён пакуль не разабраўся.

Тры дзявяткі часам давалі такі эфект. Відас аднойчы гадзіну размаўляў сам з сабой пра Сакрата. Прымяраючы розныя маскі.

Але тут была асаблівая сітуацыя. Голас прамаўляў аднекуль знутры, з яго галавы.

І яшчэ. Голас быў выразна жаночы.

* * *

Вакно адчынена. Гэта відавочна не пра гэты пакойчык.

Вокны тут былі захінутыя фіранкамі так, што не заставалася аніякіх шчылінаў.

Ён агледзеўся. Пані Зося заціхла і глядзела кудысьці далёка, унутр сябе. Такое ўражанне, што яна проста заснула.

Далюс і Ірэна сядзелі моўчкі і засяроджана. Вочы шырока расплюшчаныя, на тварах — маска. Не было сумневу: у іх галаве таксама быў голас. Няясна, праўда, ці той самы.

Смех у куце не спыніўся, наадварот, ён пачаў нарастаць, станавіўся ўсё больш выразным і больш страшным.

Вочы адаптаваліся да паўцемры, і цяпер ён ясна бачыў, што там нікога няма.

* * *

За вокнамі раздаўся характэрны гук разрыву, усё асвятлілася рознакаляровымі пырскамі.

Гэта Жыльвінас запусціў феерверкі.

Бралася на дванаццатую. Вужы, напэўна, ужо дапаўзаюць. Неўзабаве мусяць прыехаць паліцыянты. Пачаўся Дзень Вялікага Літоўскага Змея, што б гэта ні значыла.

Час шукаць сабе іншы прытулак.

8.

У клубе было суха і цёпла. Ён павітаўся з ахоўнікам, здаў торбу і пачаў прабірацца па калідорчыках наперад. Трэба зрабіць пару правільных паваротаў, каб патрапіць у залу. Было штосьці прыцягальнае ў гэтых сутарэннях. І знаёмае. Як быццам ілюстрацыя з нейкага даўно забытага кіно ці альбома.

Магчыма, ён бываў тут раней, у іншых жыццях, падумаў ён, выбіраючы, куды сесці. Ягоны ўлюбёны фатэль, справа ад сцэны, быў заняты, і ён скіраваўся ў далёкі кут. Адсюль бачна горш, але больш утульна і бяспечна.

* * *

Далюс завёў яго сюды калісьці даўно. Яны былі п’яныя, гаварылі пра Гесэ, і той раптам сказаў, што тут, у Вільні, ёсць мейсца, дзе здараюцца цуды. Амаль магічны тэатр, і толькі для вар’ятаў.

Яны доўга блукалі старымі вулачкамі. Потым спусціліся ў сутарэнні, селі. Грала загадкавая музыка, голас ціха гаварыў па-літоўску. Далюс паказаў на дзверы ў далёкім куце і сказаў, што адтуль мусіць выйсці галоўны маг і тады ўсё пачнецца.

Францішак амаль паверыў. Чакаў, што адбудзецца нешта неверагоднае. Але музыка скончылася, з калідора высыпала гурба дзяўчат у стракатым адзенні, якія пачалі разлятацца па зале.

Магічны тэатр аказаўся начным клубам. Яны пасмяяліся, ён ніколі не бачыў такога ўжывую. Яму спадабалася.

Зайшоў яшчэ раз, без Далюса. Потым яшчэ.

Урэшце ён стаў тут амаль сваім. Яго пазнавалі танцоркі, з некаторымі ён сябраваў. Там, на паверхні.

Ведаў на памяць сцэнар. Ціхая музыка. Голас. Танцы. Хтосьці з дзяўчатаў падсядае, знаёміцца. Прыходзіць афіцыянтка, прапануе замовіць. Лёгкі productактэйль за сто дваццаць літаў. Альбо крыху віскі за дзвесце.

Напачатку ён бянтэжыўся і не ведаў, што адказаць. Тут усе насілі маскі, і адказваць сур'ёзна было б кепскім тонам. Але й проста прыдумляць было няёмка.

Да таго ж чым далей, тым болей ён разумеў, што ёсць нейкі сакрэт у гэтым мейсцы. І што, магчыма, Далюс зусім не жартаваў, калі казаў пра цуды.

* * *

Пасля дванаццаці распачыналася экзотыка. Звычайна Ірыс з сяброўкай гуляла ў лесбійскія гульні. Альбо запрашалася пара, якая ладзіла рамантычнае спатканне проста на сцэне. Раз-пораз прыдумляліся і больш радыкальныя рэчы…

Ён тады пазнаёміўся з Дыянай, танчыла яна рэдка, але з радасцю расказвала гісторыі. Яна хацела стаць антраполагам, працавала ў музеі. Тут у яе была, як яна сказала, этнаграфічная практыка.

Поруч сядзелі трое маладых брытанцаў. Дзень нараджэння як-мага-далей-ад-дома. І хтосьці з іх замовіў шоу. Сада-маза.

Яны думалі, што гэта жартачкі, гульня, але патрапілі ў палон дзвюх раз'ятраных літоўскіх бландзінак з-пад Друскенікаў. І гамон, лягай у акопы. Дзве гадзіны ў кайданках, з кляпамі ў роце, ціха стагналі, прыкутыя да пілона, пакуль іх не вызваліў адміністратар.

Некалькі год бландзінкі працавалі ў Брытаніі, сказала Дыяна. Прыбіральшчыцамі. І цяпер адключыліся напоўніцу. Салодкая і падступная помста гаспадарам свету.

Ангельцы ўсё ж такі надта даверлівыя, сказала яна. Перакананыя, што свет вакол іх мае сэнс і парадак. Прыдуманы і апісаны ў Оксфардзе на кафедры батанікі.

* * *

Немцы сапраўды такія, як усе пра іх думаюць, нават дзіўна.

Шведы многа п'юць і радуюцца чамусьці свайму, вельмі паўночнаму.

Французаў не бачылі тут тысячагоддзямі.

Для літоўцаў гэта экспартны прадукт, яны часам заходзяць, каб праверыць якасць.

Апошнім часам патрапляюць менчукі, снобы, якія строяць з сябе такіх сталічных штучак у прыгарадзе, ха-ха-ха.

* * *

Гэтым разам ён замовіў кавы, хаця й разумеў, што выбіваецца са звыклага рытуалу.

Звычайна замаўлялася піва альбо брэндзі, і далей можна было сядзець гадзінамі, сузіраючы прыгожых матылькоў, што пералятаюць з месца на месца, нідзе не спыняючыся больш за некалькі хвілінаў.

Калі, вядома, не знайсці словы, якія іх затрымаюць.

Словаў было ўсё менш. Зрэшты, ён заходзіў сюды ўсё радзей. Лепшыя танцоркі з'язджалі: у Партугалію, на Кіпр, у Грэцыю. Заставаліся мілыя дзяўчаты, якія хадзілі па сцэне, распраналіся, не патрапляючы ў музыку. Ён не запамінаў іх імёны…

Напэўна, усё ж такі ён чакаў цуду. Падсвядома. Хаця ў гэтым і не прызнаваўся. Нават сабе самому.

Але цуд не адбыўся. З дзвярэй, на якія яму паказаў Далюс, так ніхто і не выйшаў. Было падобна, што сённяшні візіт стане апошнім.

* * *

Я — Марго, сказала дзяўчына.

А ты адкуль? Як цябе завуць?

Пытанні былі звычайныя, як для танцоркі. Але голас, інтанацыя былі іншымі. Больш вясёлымі і даверлівымі. Як быццам яны стаялі на прыпынку і чакалі аўтобус. Ці стаялі на калідоры ўніверсітэта, пасля лекцыі.

А мяне Артур, сказаў Францішак. Так звалі героя адной недапісанай п'есы. Будзе час і жаданне — раскажу больш падрабязна. Там цікавы сюжэт. Ці ягоная адсутнасць, можна і так сказаць.

* * *

Што ты тут робіш?

Чакаю весткі. Адзін добры знаёмы папярэдзіў, што гэта можа здарыцца сёння.

Сёння асаблівы дзень. Дзень Вялікага Літоўскага Змея.

Так што мусім быць гатовыя.

* * *

Гатовыя да чаго?

Гэта залежыць ад розных рэчаў. Простых і не вельмі.

Ад таго, пра што будзе вестка. Якія словы праявяцца раптоўна, на ваконнай шыбе. З таго боку.

І ці паспеем мы захінуцца ў барвовы плашч, пра які пісала Стэла ў сваім апошнім вершы да Свіфта. Калі нам нарэшце стане зусім невыносна, у халоднай пустой бессэнсоўнасці.

Ведаеш, старыя кітайцы лічылі, што наш свет месціцца ўсярэдзіне вялікага гарбуза. Няправільнай формы. Знізу прастакутнік, зверху сфера. Часам мне здаецца, што яны зусім не жартавалі.

* * *

Не думай так многа пра холад.

І пра бессэнсоўнасць.

Тут цёпла, — дзяўчына прытулілася да яго, ненавязліва, амаль цнатліва. Ад яе сыходзілі цёплыя хвалі, як ад маленькай грубкі.

Гэта дзівіла Францішка найбольш — дзяўчаты тут ніколі не мерзлі, хаця хадзілі амаль без вопраткі. І ў голасе была непадробная цікавасць, хаця й крыху тэатральная. Як быццам голас ужо прадчуваў альбо нават ведаў адказы. Яго адказы.

Пагавары са мной. Мой выхад яшчэ далёка.

Раскажы што-небудзь. Пра сябе. Пра сваіх сяброў. Ці проста знаёмых.

* * *

Калісьці тут жыў чалавек, які ведаў.

Ён быў тутэйшы. Нарадзіўся непадалёк. Вучыўся ў гэтым горадзе. Надрукаваў тут першае апавяданне. А потым атрымаў прасвятленне, нечакана. У адным з мясцовых касцёлаў.

Яго называлі Майстар з Літвы. Майстар у сэнсе настаўнік, як у сярэднявечным цэху. Ён вучыў, як адкрыць і настроіць сваё сэрца. Як патрапляць у тон.

Ён казаў, што сэрца — гэта інструмент, на якім мы можам граць самыя розныя мелодыі. Для некаторых рэчаў дастаткова простай вясковай скрыпачкі, а іншыя патрабуюць добра тэмпераванага клавіра.

Як музыка: калі мы знаходзім гармонію — усё ў нас адгукаецца. І тады мы верым і ідзем наперад.

Разумееш, іншыя чыталі пра гэта ў кнігах, а ён проста ведаў. Проста жыў. Праходзіў праз формы, без прыкрасці і шкадавання.

І ніхто не мог зразумець, адкуль гэтая веда. І ён сам не разумеў да канца. Сёння так ужо не ўмеюць.

* * *

А хто ён па гараскопе?

Канец года, як і Міцкевіч. Хутчэй за ўсё, казярожка, хаця не ўпэўнены…

Казярожкі такія. Яны могуць.

* * *

І што ты яму сказаў бы, калі б вы раптам сустрэліся?

Нічога асаблівага. Сказаў бы, што ўсё, што ён рабіў, было не дарма. Калі хаця б аднаму чалавеку гэта патрэбна, значыць, усё было не дарма.

Калісьці, у бібліятэцы, я натрапіў на тры тамы ягоных твораў. Яны былі выдадзеныя пасля смерці ягонымі сябрамі і прыхільнікамі. У адным італьянскім горадзе.

Там было сабранае ўсё. Тэксты, размовы, сны. Выпадковыя нататкі. Як стрэл у будучыню.

І самае страшнае: ува ўсіх трох тамах старонкі былі неразрэзаныя.

* * *

Мне проста цікава, ці засталіся настаўнікі ў гэтым свеце. Тыя, каму можна верыць. Хто мог бы падказаць дарогу, калі зусім цёмна.

Ці яны ёсць, але нам не дадзена гэтага ведаць, і таму мы пражываем жыцці, як быццам іх няма.

Альбо, наадварот, іх няма, даўно няма, але мы трымаемся з усяе моцы, жывем так, як быццам мы разам з імі. Чакаем, спадзяемся.

Канешне, можна ісці самому. Біцца галавой аб сцяну. Але якое трасцы тады яны пакідалі сляды, тарылі сцежкі. Абяцалі.

* * *

Я адзін з тых, хто раптоўна прачнуўся пасярод сну і больш не можа жыць, пакуль не зразумее, што ўсё гэта значыць.

Ведаеш, як гэта бывае. Часам ходзіш кавалкам дрэва, прыдуманай кімсьці лялькай, а потым абуджаешся і патрапляеш у самога сябе.

І ўсё становіцца няпроста.

І выбар насамрэч невялікі. Альбо паспрабаваць яшчэ раз заснуць, альбо пачаць думаць пра выратаванне. Вызваленне. Пра пераход на той бераг.

* * *

Ад чаго ж ты хочаш уратавацца? Ад смерці?

Хутчэй ад жыцця. Як можна аддзяліць жыццё ад смерці? Хіба мы не паміраем штохвіліны?

* * *

Чым жа жыццё так цябе расчаравала?

Наадварот, чым далей, тым больш яно чаруе. Незразумела, што гэта такое. І што з усім гэтым рабіць. Каму падзячыць. Альбо, наадварот, каму падаць скаргу.

* * *

Ён слухаў самога сябе і не верыў: ён гаворыць усё гэта танцорцы ў начным клубе. Такога ніколі не здаралася, сёння сапраўды дзень быў асаблівы.

Марго падсунулася бліжэй, быццам хацела расказаць нешта сакрэтнае.

Стала цёпла і ўтульна, амаль па-хатняму.

* * *

Усё гэта вельмі дзіўна, — сказаў Францішак. Мы з табой нагадваем персанажаў адной п'есы, якія выпадкова заблукалі не ў сваю прастору. Я казаў ужо пра яе. На пачатку.

А пра што п'еса? — запыталася Марго.

Пра рыбак.

Пра рыбак? — перапытала Марго крыху недаверліва

Так, ёсць адна вельмі вядомая п'еса пра рыбак, з яе пачаўся беларускі метафізічны тэатр. Там усяго два персанажы — Артур і Марго. Дзве рыбкі. Яны плаваюць у акварыуме і размаўляюць.

Звычайна рыбкі маўчаць, нават у постмадэрновых п'есах. А тут яны абмяркоўваюць важныя рэчы.

Ніколі не чула, сказала Марго.

* * *

Я бачу, у цябе праблемы, сказала Марго.

З людзьмі і з рыбкамі.

Расслабся. Зараз выйдзе Санта, яна рыхтуе сюрпрыз. Штосьці адмысловае.

Санта з'ехала, сказаў Францішак. На Кіпр. Тры месяцы таму.

Не для ўсіх, сказала Марго. І ўсміхнулася.

* * *

Санта была легендай клуба. Калісьці ён наважыўся з ёй пазнаёміцца. Запрасіў на каву. Там, наверсе. Яны сустрэліся на Гедыміна і прагаварылі некалькі гадзінаў.

Але гэта было даўно. Вельмі даўно.

Марго выйшла на хвіліну і вярнулася.

Зараз будзе яе танец, сказала яна амаль шэптам.

Санта цябе памятае. Яна была ўражаная вашай сустрэчай. І шкадуе, што ты не пазваніў другі раз. Хаця разумее.

А ты? Калі будзе твой танец?

Не спяшайся.

* * *

Загучала мелодыя, тонкая і, відавочна, больш складаная, чым маглі сабе дазволіць тут, у начным клубе.

Усе глядзелі ў далёкі кут, на дзверы.

Тыя, пра якія калісьці казаў Далюс.

Дзверы адчыніліся самі, без нічыёй дапамогі, ціха і бязгучна, нібы ў сне. З іх пачалі з'яўляцца танцоркі, адна за адной.

А вось і Санта. Яна выйшла, цырымонна пакланілася, прайшла пад музыку да асобнага століка каля самага ўваходу.

Танцоркі разляцеліся па зале, потым сабраліся на сцэне. Яны былі ў касцюмах і масках з розных эпохаў. Дзяўчына ў кітайскай масцы яму кагосьці нагадвала. Твар за маскай не праглядаўся, але пастава, рухі, усё гэта было знаёмае аж занадта.

Музыка прыцішылася, і Санта выйшла на подыум.

Усе заціхлі ў чаканні.

* * *

Гэта надзвычай важны вечар для ўсіх нас, сказала яна. І зусім не выпадковыя госці. Сабраліся тыя, хто верыў

і чакаў, што цуды ўрэшце адбудуцца. Што за тонкім покрывам бачнага свету хаваецца іншы, і раней ці пазней ён праявіць сваю ўладу.

Сёння ў нашым маленькім магічным тэатрыку незвычайнае відовішча. У ім бяруць удзел лепшыя артысты, якія сабраліся дзеля гэтага з розных частак кантынента.

Музыка і пастаноўка адмыслова запрошанай дарагой госці, якая пакуль застаецца інкогніта, за маскай танцоркі Гай Сунь.

Санта дала знак — і гукі сталі грамчэй, мелодыя пачала разлівацца навокал, запаўняць, лёгка і незаўважна, усю прастору. Танцоркі зноў разляцеліся па зале і пачалі танец.

* * *

Ён агледзеўся. Усё было так, як і раней, подыум, сцэна ў глыбіні залы. І ўсё ж штосьці няўлоўна змянілася.

Было адчуванне, што ён ужо ў іншым мейсцы. А можа, нават і ў іншым часе. Як быццам патрапіў у мінулае. У даўнюю кавярню, якую сёння прыгадваў. У якой ён напісаў першыя вершы.

Насупроць дзіўная кампанія размаўляла па-нямецку.

Ён ужо бачыў некаторых з іх, зусім нядаўна. На сеансе ў пані Зосі.

* * *

За суседнім столікам сядзеў Далюс з маладой дзяўчынай.

Дзяўчына была падобная да прынцэсы са старой скандынаўскай казкі.

Далюс расказваў мне пра Вас, сказала яна.

Ён сказаў, што вы пішаце раман і што ўсе будуць персанажамі. Вазьміце і мяне таксама. Я буду добра сябе паводзіць.

Ён пажартаваў, сказаў Францішак. Ці пераблытаў.

Гэта раман нас усіх піша.

Далюс усміхнуўся і сказаў: знаёмся, гэта Аста.

* * *

У самым куце сцэны, за пультам, сядзеў Леа. Гэта не мог быць Леа — прайшло ўжо столькі год, а чалавек у куце быў падобны да таго Леа, з даўна прамінулай эпохі.

Францішак яшчэ раз агледзеўся.

Усё яшчэ грала музыка, тая самая.

Але цяпер да яе далучыўся яшчэ і голас. Голас Эвы Дамінікі. Гэта яна была кітайскай танцоркай.

Гэта была яе музыка. І яе танец.

* * *

Далюс не дарма яго тады папярэдзіў. Пра магічны тэатр і пра вар’ятаў. Усё ж такі ён патрапіў сюды, на самы скрай. У месца, дзе ўсё магчыма. Усё невыпадковае. І ўсё застаецца.

Яны былі на паветраным шары, цяпер ён у гэтым не сумняваўся. Падняліся вышэй за аблокі і цяпер уздымаліся яшчэ вышэй, туды, дзе зоркі. Калісьці ён пабяцаў, што гэта адбудзецца.

Эва Дамініка спявала па-гішпанску. Ці па-італьянску. Ён сёння прыгадваў тую ноч у інтэрнаце, калі яны цалаваліся ў ленінскім пакоі пад італьянскую музыку.

На вышынях мусіць быць халодна, падумаў ён і пашкадаваў, што не ўзяў з сабой плед альбо коўдру.

* * *

Аднекуль нараджалася ціхая радасць і пяшчота. І неверагоднае, амаль казачнае адчуванне шчасця.

Побач ляжала, згарнуўшыся ў абаранак, маленькае вужанятка. Раз-пораз яно варушылася і ціха сіпела, тыкаючыся пысачкай яму ў сцягно.

Гэта Жыльвінас даваў знак, што ўсё атрымалася.

Ён паклікаў афіцыянтку і папрасіў прынесці сподак малака. Тая не адразу зразумела, а потым войкнула і пабегла на кухню, збіраючы па дарозе каляжанак.

Мусяць быць яшчэ цуды, падумаў ён. Абавязкова.

* * *

А цяпер мой танец, сказала Марго.

Ён зусім не просты. Падрыхтуйся, калі ласка.

Ён для тых, *хто хацеў бы прачнуцца*.

* * *

І ўбачыць. І ўсё зразумець.

ЭВА ДАМІНІКА:
ЛІНІЯ ФРОНТУ

1.

Ліст аніяк не хацеў канчацца. Ён пераваліў за шасцідзясятую старонку, а канца ўсё яшчэ не было бачна. Звычайна яна пісала сябрам кароткія паэтычныя пасланні, дадаючы потым на палёх каментары. Яна называла іх эцюдамі і пазначала опус, як у музыцы, хаця і не заўсёды адсылала сваім адрасатам.

Ёй важна было адчуваць рытм і гармонію, нават у словах. Часам яна абрывала ліст на сярэдзіне, ставіла шматкроп'е і пакідала няскончаным, проста таму, што катарсіс ужо здарыўся, прамінуў, і далей ішло запаўненне паперы неабавязковымі словамі.

Але тут адбывалася штосьці іншае. Яна не магла паставіць кропку ўжо некалькі тыдняў. Пісала, закрэслівала. Дапрацоўвала. Некаторыя аркушы перапісвала начыста.

Вярталася да ўжо напісанага, расстаўляла знакі на палях: *crescendo, subito pp., sotto voce*.

Пісанне ператварылася ў штодзённы занятак, які незаўважна пасунуў яе ранейшы расклад, стаў часткай новага жыцця.

Што было больш дзіўна, яна звыклася з гэтым заняткам, ёй падабалася, што дзень пачынаўся і заканчваўся пэўным рытуалам, аднолькава.

Зранку, пасля кавы, настройка інструмента, уваходжанне ў танальнасць, пошук ключавых фразаў, што паўставалі ў свядомасці раптоўна і адасоблена, але потым выцягвалі на паверхню тэмы і перыяды, акіяны і архіпелагі.

І вяртанне ў зададзеную форму ўвечары. Насычаная, перапоўненая зместам, яна звязвала ўсё з усім, аркестравала, вызначала тэмп, пераходы, крэсліла і перарабляла.

У пэўны момант яна набыла прыгожую зялёную тэчку і пачала складваць туды нумараваныя аркушы. Самы час пачынаць думаць пра структуру цэлага…

Ліст відавочна быў чымсьці большым, чым сумай розных фрагментаў: магчыма, саната, можа быць, канцэрт — *для самотнага сэрца з аркестрам*, дапісала яна на палёх.

Дапісала — і адразу перакрэсліла. Гэта мусіла заставацца ў падтэксце, нябачным для чужога вока.

Яна села і пачала пераглядаць аркушы, ад самага пачатку.

* * *

Мілы дэрвішу!

Як точыцца тваё жыццё? Ці добра сябе пачувае наша крывіцкая Мекка?

Усё яшчэ блукаеш па віленскіх лабірынтах? Спадзяюся, што так, бо пішу на твой літоўскі адрас. Ад цябе няма вестак ужо некалькі месяцаў, і я пачынаю хваляваца.

Пакуль несур’ёзна, разумеючы, як гэта неабходна ў пэўныя моманты, знікаць і заглыбляцца, рваць канцы, тануць у іншай рэальнасці. Забываць імёны і да-

кладныя адрасы, застаючыся сам-насам з быццём, без аніякага алібі.

Дарэчы, што ты там шукаеш, на старых, зарослых лесам пагорках? Крыве-Крывейтэ? Яшчэ адну інкарнацыю няшчаснай Барбары Р.? Цукровага пеўніка, пра якога так натхнёна праспявала ў нашым дзяцінстве Марыля Радовіч?

Усё яшчэ збіраешся прайсці свет наскрозь?

Ісці праз свет формаў, разумеючы, што нідзе немагчыма затрымацца.

Я дасюль памятаю, як ты прамовіў гэтыя словы, у ленінскім пакоі гістфакаўскага інтэрната, на Свярдлова, 34. Важна, але і зусім бездапаможна, амаль па-дзіцячы.

Я тады адразу табе паверыла. Так, як вераць дзецям і прыродзе — пяшчотна і безумоўна.

* * *

І што — аніякай спакусы? Ну, затрымацца. Хаця б на хвілінку. Нарэшце спыніцца і крыху аддыхацца. На кафедры, сярод аспірантаў і вучаніцаў. Сярод чытачоў і прыхільнікаў. Там, дзе не трэба нічога нікому даводзіць, пераконваць. Абараняцца альбо ісці ў наступ…

Ёсць у гэтым пэўная асалода — аглядаць з высокай вежы плён пражытых гадоў.

Калі так многа ўжо адбылося і ты нарэшце свабодны. Яснай і крыху маркотнай свабодай поўніцы чалавечага жыцця, якое амаль прамінула і цяпер само — сэнс і прытулак.

Зрэшты, і гэта не назаўсёды. Потым непазбежна прыходзяць іншыя часы, другія гісторыі. Калі ўцякаюць у нікуды, рвуць сувязі, ніткі. Падводзяць тлустую

рысу пад усім, што было. Пачынаюць з чыстай старонкі.

У такія моманты блакітныя вочкі ды светлыя кудзеркі могуць здавацца верхам метафізічнай мудрасці. Аазісам у пустэльні. Глытком вады ў спёку.

* * *

Выбачай, даражэнькі. Пішу абы-што.

Нешта я зусім асамотнела, няма з кім пагаварыць у гэтых сквотах і ашрамах, Гайдэльбергах і Шварцвальдах, паўсюль пуста, а фраў Марта разыграла ўсе ролі, акрамя самай галоўнай, пра саму сябе, — і цяпер заціхла ў пустаце далёкіх пакояў, дзе яна хаваецца па вечарох ад прывідаў сваёй маладосці.

Яна пачала гаворку пра тастамент, і мне гэта не падабаецца. Яна хоча перадаць мне свой дамочак, але на такіх дзіўных умовах, што адразу не раскажаш. Да таго ж я не ўпэўненая, што гэта гісторыя пра рэальнасць, а не ўрывак недапісанай п’есы невядомага аўтара. Забытай рэжысёрам на ўскрайку свядомасці старой, паўзвар’яцелай акторкі.

Так, я ўсё яшчэ знаходжуся ў фраў Марты, на беразе возера, на адной з *раскошных вілаў*, як напісалі б у савецкай газеце нашага дзяцінства. У мяне свой пакой, дастаткова вялікі, і я тут проста жыву, якімі б незвычайнымі рытуаламі гэта ні было абстаўлена.

* * *

Як любяць пісаць у такіх выпадках нашыя ўлюбёныя аўтары — *vita Cartesii est simplicissima*. Я прачынаюся рана, адразу пасля сёмай. Гатую сняданак, для ўсіх.

Бяру каву і падымаюся ў пакой, дзе працую да адзінаццатай.

Потым блукаю па беразе, сярод вельмі-вельмі старых дрэваў.

Вяртаюся, прымаю душ, спрабую абудзіцца яшчэ раз, у крыху іншую рэальнасць.

Сняданкі мяне не абцяжарваюць: назваць гатаваннем гэта можна толькі з вялікай доляй умоўнасці.

Абедамі, прыборкай, закупамі займаецца мілая мурыначка з Сенегала. Яе завуць Эсме, і яна жыве асобна, у невялічкай прыбудове, якая служыць ёй майстэрняй. Яна мастачка, і ў яе карцінах шмат дзяцей і аблокаў.

Што яна робіць тут, у Берліне, я разумею не да канца.

* * *

Раз на тыдзень я гарантавана выбіраюся са сваёй сядзібы: спяваю, а часам і танчу ў маленькім тэатрыку, які з усіх сілаў спрабуе быць наперадзе эпохі і ставіць тое, што тут называецца авангардам.

З класічнай кансерваторскай школай, я для іх відавочна *overeducated*, хаця і не *overqualified*. Бо тут лічыцца, што ўменне забыць у патрэбны момант пра ўсе магчымыя *бельканта* надзвычай важна для авангарда, робіць яго бліжэй да народа.

Я, зрэшты, забяспечваю сувязь з традыцыяй. Гэта значыць, што раз-пораз, пасярод скрыгату і тупату свету, уваходзіць маё падпсаванае часам мецца-сапрана і нагадвае пра забытую старую эпоху.

Мяне туды прыстроіла фраў Марта, якая ведае ў тутэйшым тэатральным бамондзе амаль усіх. На

поўную занятасць гэта не цягне, але мяне цалкам задавальняе.

* * *

Фраў Марта — былая акторка. Зрэшты, акторак былых не бывае, як не бывае былых паэтаў альбо былых алкаголікаў.

Пасля *дэмабілізацыі*, як яна гаворыць, яна адкрыла персанальны тэатр. І гуляе ў ім пяшчотна і апантана, выкладаючыся напоўніцу.

Яна ходзіць па доме і размаўляе сама з сабой. Маналогамі ці кароткімі рэплікамі. Са спектакляў.

Часам гэта класіка, і тады яна можа гадзіну рыдаць з нагоды смерці любага прынца. Іншым разам штосьці менш зразумелае: Стрындберг альбо Гаўптман, альбо нават нешта, што я не ў стане пакуль апазнаць.

У яе ёсць сапраўдная грымёрка, і яна дазваляе ёй карыстацца.

Ёсць таксама гардэробная, з касцюмамі і атрыбутамі эпохаў. Я часам пабойваюся, што там не толькі муляжы. Што шаблі і корцікі, якія так прыгожа вісяць на сцяне, загостраныя. А пісталет, які яна раз-пораз выцягвае ў некаторых мізансцэнах, сапраўды страляе. І могуць надысці часы, калі ён спатрэбіцца.

Яшчэ крыху пра атрыбуты. У сутарэннях размешчаны невялікі цір, і раз-пораз яна спускаецца туды *падтрымаць форму*. Аднойчы яна прапанавала мне далучыцца. Паспрабаваць. І я спусцілася разам з ёй.

Цір шыкоўны. Зроблены прафесійна, з гукаізаляцыяй і глядзельнымі прыстасаваннямі. І гэта яшчэ не тое, што здзіўляе найбольш. Здзіўляе насамрэч сама

фраў Марта. Яна кладзе ўсе кулі ў дзясятку, практычна не гледзячы. У яе гады!

Калі гэта не тэатральны фокус, не працяг спектакля, акторства — не адзіная яе прафесія. І штосьці мне падказвае, што галоўныя гісторыі — пра сябе і пра эпоху — яна мне яшчэ не расказала.

Пакуль жа мая задача досыць простая. Зрабіць так, каб у кожным са спектакляў у яе былі гледачы і суразмоўцы. І каб не было спакусы там застацца.

* * *

Дарэчы, я не працую ў фраў Марты: няма аніякага кантракту ці нават вуснай дамовы. Лічыцца, што я дапамагаю ў гаспадарцы, і гэта дазваляе ёй з чыстым сумленнем выдаткоўваць штотыдзень пэўную суму. У дадатак да тэатральных.

Калі гэтага не хапае ці хочацца набыць штосьці важнае — дарагі і прыгожы збор твораў альбо эксклюзіўныя запісы, — я званю старым прыяцелям і тыя арганізуюць выступ у клубе альбо арт-кавярні з аўтарскай праграмай. Якая разраслася неверагодна і працягвае расці і пашырацца. Я даўно ўжо не спрабую трымаць у памяці тое, што спяваю, і патрабую пюпітраў, з тэкстамі і нотамі.

Звычайна гэта класіка, з невялікім дадаткам уласных рэчаў. Хаця апошнім часам цягне на хуліганства.

Месяц таму я паклала на музыку *Дуінскія элегіі* і праспявала іх у паўпустой зале на ўскраіне Берліна. Можаш сабе ўявіць. Пра гэта нават пісалі мясцовыя газеты.

* * *

Раз-пораз фраў Марта прапаноўвае пайсці на канцэрт альбо ў кіно. Я прымаю запрашэнні з радасцю, бо сама хадзіць практычна перастала. Класічны рэпертуар я пераглядзела ў мінулым жыцці, а з сучаснасцю ў мяне праблемы. І гэта толькі частка праўды.

Другая частка — штосьці замінае мне карыстацца тут выгодамі культуры.

Я тут зусім не дзеля гэтага.

Адчуваю гэта ўсёй скурай, тактыльна.

Пры тым, што мая нямецкая ўжо зусім добрая. Яшчэ крыху — і я буду на ёй думаць.

* * *

Бываюць вечары, калі яна абяцае расказаць пра сваю маладосць.

Гэта здараецца рэдка. Звычайна пасля сумеснага паходу на старое кіно. Тады яна просіць мяне паспяваць даўняе — з той эпохі, танчыць, гарэзіць, губляе пры гэтым дваццаць ці нават пяцьдзясят год, а пасля мы ціха п’янствуем усю ноч, абмяркоўваючы кнігі і спектаклі, а таксама жыццё як такое.

У яе сутарэннях — радовішчы вінных пляшак. Я думаю, што магла б працаваць самелье ў якой-небудзь не самай лепшай менскай рэстарацыі. Здаецца, я ўжо адрозніваю гатункі і рэгіёны. Крыху болей практыкі — і буду апазнаваць гады ўраджаю.

* * *

Яшчэ я хаджу ў паркі. Пераважна ў Ціргартэн, але не толькі. Тут дзясяткі і сотні прыгожых маленькіх паркаў і сквераў, і кожны мае свае сакрэты.

Берлін у гэтым сэнсе проста знаходка — столькі зеляніны на вуліцах я не бачыла нідзе ў свеце. Ніводны горад не дазваляе дрэвам так вольна буяць і разрастацца, аплятаць вуліцы і дамкі.

Мне гэта чамусьці важна.

Можа, таму, што ў парках я самотная і шчаслівая, нягледзячы на ўсё. А магчыма, проста генетычная памяць. Мае далёкія продкі жылі ў сядзібе. Гэтага даўно няма і больш ніколі не будзе.

Але, калі я блукаю па сцежках, мне здаецца, часам на адзін толькі момант, што я вяртаюся дадому, што за гэтым паваротам будзе садовая альтанка, далей цэнтральная алея.

І вось я ўжо падыходжу да ганка, падымаюся па прыступках, стукаю ў дзверы, чакаю.

* * *

Ведаеш, у дзяцінстве я магла гадзінамі слухаць пра жыццё дрэваў і камянёў. Пра тое, як спакойна і засяроджана яны прысутныя ў гэтым свеце.

Я нават паабяцала бацькам, што калі-небудзь, калі ўжо ад усяго стамлюся, куплю сабе домік у вёсцы. І пражыву рэшту жыцця ціха і незаўважна, як садовая кветка.

Цяпер я разумею, што жыццё садовай кветкі не такое ціхае і незаўважнае, як здавалася калісьці.

Што ўвесь час наступае пустазелле. Што пасля цёплага і спакойнага дня прыходзіць трывожны надвячорак. А потым і халодная ноч.

Да таго ж, калі ёсць Сад з кветкамі, недзе мусіць быць Садоўнік.

Але нешта я адхілілася.

* * *

Самае істотнае: я тут складаю музыку. Многа працую, пішу. І яшчэ больш думаю.

Ёсць нават старонка ў мярэжы, куды ўсё гэта размяшчаецца, у чаканні слухачоў і крытыкаў.

Раз-пораз тое, што я накрэмзала ў цішыні, выконваюць на якім-небудзь забытым богам і прадзюсарамі фестывалі нефармату. І тады сябры і калегі пераконваюць мяне, што я ўжо абедзвюма нагамі ў першай лізе. Авангарда, вядома.

Яшчэ некалькі высілкаў, гавораць яны, і я патраплю ў вышэйшую. А можа быць, я ўжо там. Ніхто ніколі дакладна не ведае. Каб зразумець напэўна, варта выйсці за браму свайго творчага эга. Прыслухацца да таго, што адбываецца вакол. Зразумець, што эпоха хацела б пачуць.

Альбо нават скласці што-небудзь для яе, на яе густы.

У адказ я звычайна пытаюся, хто яна, эпоха, бландзінка ці брунетка? Ці бачыў хто-небудзь яе сапраўдны твар? І, дарэчы, *што ў яе за густы*?

* * *

Часам, калі адбываецца які-небудзь экзатычны фэст альбо проста мілае і бяспечнае змаганне за чыесьці

правы, прыгадваюць, што я адтуль, з Усходу, і просяць праспяваць штосьці сваё, дзёрзкае і этнаграфічнае.

Раней я крыўдзілася і спрабавала патлумачыць. Расказаць пра пакаленні музыкаў, традыцыю. Потым змірылася і сапраўды пачала спяваць сваё. Пераважна дзёрзкае. Але раз-пораз і этнаграфічнае.

Хаця ўсё менш і менш рэчаў я адчуваю сваімі. Гэта дзіўна і крыху нелагічна. Здавалася, з кожным годам іх мусіць быць усё больш. Але тое, праз што я цяпер праходжу, не затрымоўваецца, праплывае праз мяне, як выпадковы сон.

* * *

Крыху прэтэнцыёзна, падумала яна і закрэсліла апошні абзац.

Закрэсліла няўпэўнена, тонкай лініяй, якая хутчэй адцяняла сумнеў, чым выдаляла думку. Але, надзіва, стала лягчэй, і яна напісала гэты сказ збоку, як каментар: *крыху прэтэнцыёзна*.

І яшчэ далей, унізе, падрадковай заўвагай: *выпадковых сноў не бывае*.

* * *

Я нарэшце ўступіла ў пэўную паласу свайго жыцця, калі тое, што я адна, ужо не ўспрымаецца як абяцанне чагосьці цікавага ў будучыні.

Са мной усё яшчэ знаёмяцца, праўда, пераважна на вуліцах і ўсё нейкія *прапашчыя*.

Маладыя паэты, старыя наркаманы, бізнесмены-няўдачнікі за пяцьдзясят, нават бяздомныя. Адныя

шкадуюць, што жыццё праходзіць, і шукаюць штосьці важнае, што яны прапусцілі, іншыя баяцца, што яно так і не пачнецца.

І амаль усе яны штосьці пішуць, спрабуючы пакінуць на паперы сведчанні. Каб потым стрымгалоў пабегчы ў выдавецтва і прадаць гэта як мастацтва.

Гэта мяне больш за ўсё і дратуе.

Магчыма, я аматарка занадта складаных гісторый, але хочацца нарэшце натрапіць на тое, што не імкнецца адразу ўсплыць на паверхню. І абмяняць сябе на пэўны капітал альбо выгоды.

Тое, што ўмее ціха чакаць і ўглядацца. Расце, як дрэва, гадамі і стагоддзямі.

* * *

Першы год у фраў Марты я праплакала. Ад шчасця і роспачы. Гэта складана растлумачыць — як быццам я патрапіла ў забыты кляштар і там засталася, нарэшце, сам-насам з сабой.

Я заўсёды хацела мець месца, дзе можна было б адасобіцца. Да канца. Так, каб выпасці са свету і ўбачыць сябе з таго боку.

Тут мала простай самоты.

Патрэбная сустрэча. Калі раптам распушчаецца ўсё знешняе, падымаецца заслона і душа пачынае адчуваць сябе саму з сярэдзіны, нейкім унутраным пачуццём.

І пры гэтым, у шчаслівай адлюдненасці, ты амаль фізічна адчуваеш, як праходзіць час. Як ён паскарае сваю хаду, ляціць і амаль знікае ў сваёй магуце і ўсёпранікальнасці.

* * *

Так, спачатку адзінота, ціхая радасць.

А потым, мой мілы дэрвішу, стамляешся ад штохвіліннай прысутнасці ва ўласным ценю і гатовы кінуцца ў абдымкі да кожнага. Пачынаеш глядзець навокал. Бачыш дэкарацыю і задні план. Разумееш, як усё гэта працуе.

Бачыш, якія ўсе разумныя і псіхалагічна тонкія, і ўсё ведаюць, і здольныя ўсё пралічыць і выкарыстаць. Толькі з формай душы праблема, няма з кім пагаварыць пра самае важнае. Надыходзіць нязгода, нават абурэнне.

І ў гэты момант цябе канчаткова апазнаюць як другога. Не абавязкова ўсходнееўрапейца, дарэчы. Іншых тут многа, яны займаюць свае нішы, у кожнага свая зона прыватнасці, і яна амаль што святая. Яе нельга парушаць — ані фізікай, ані метафізікай.

* * *

І ты зноў вяртаешся да сябе. Яшчэ раз.

Пачынаеш цаніць малыя рэчы. Тое, што з табой адбываецца ў цішыні і адлюдненасці.

Стары гадзіннік, які тахкае аб прамінулым сярод пустога пакоя. Раптоўныя скавытанні ветру за вакном. Дзверы, што раз-пораз стукаюць унізе, упускаючы і выпускаючы чарговага наведвальніка.

Фраў Марта, якая блукае па доме, размаўляючы са сваімі прывідамі.

І ты, самотная і адасобленая, але ў цэнтры ўсяго. З усім звязаная і адначасова ўсяго пазбаўленая. *І госць, і гаспадар*.

Сярод шэптаў і скаргаў нашага прыўкраснага, не да канца зразумелага свету.

* * *

Так нараджаецца музыка. Альбо літаратура.

* * *

Нядаўна я сустрэла Х. Зусім старэнькага. І ён да мяне заляцаўся!

Патрапіла на ягоную вечарыну выпадкова.

Побач з намі літаратурная сядзіба, і раз-пораз я бачу іх абвесткі. Яны звычайна мне мала што гавораць. А тут раптам знаёмае прозвішча.

Калі я запыталася пра некаторыя рэчы, ён спужаўся і глядзеў на мяне, як на здань. А мне проста хацелася даведацца, што далей здарылася з гэтай жанчынай. Ляўшой. З яго ранняй аповесці.

Здаецца, у нас яна так ніколі й не выдавалася кнігай. Прынамсі я яе чытала ў самаробным пераплёце, з даўняга, яшчэ савецкага часопіса замежнай літаратуры.

Гісторыя простая. Можна было б сказаць, што гісторыі зусім і няма. Жанчына з дзіцём. Ходзіць на працу, у звычайны офіс. Вяртаецца дадому, гатуе, гуляецца з коткай. І чагосьці чакае.

Я памятаю, гэтае чаканне было галоўным зместам аповесці. Яно было выпісана тонка і дасканала. Мы ўсе гэта адчувалі.

Мо таму, што самі адно чакаць і маглі. У тыя часы. У халодным-халодным Менску. І былі ўзнагароджаныя, дарэчы.

Але яна, жанчына-ляўша, ці дачакалася яна хаця б чаго-небудзь?

Я так і запытала. Чаго яна дачакалася? Шчасця? Сэнсу жыцця? Таямнічых паведамленняў з космасу?

А можа, яна атрымала спадчыну і больш не было патрэбы хадзіць у офіс, увогуле трымацца за рэальнасць. І яна проста знікла. Распусцілася ўнутры самой сябе.

Х. сказаў, што пытанні надта сур'ёзныя. І ён бы з радасцю падумаў пра ўсё гэта ў суседняй піцэрыі, за кубачкам кавы.

Мы міла прагуляліся па сцежках і дарожках. Да суседняй піцэрыі ў нашым раёнчыку паўгадзіны хуткім крокам.

Х. быў ціхі і спакойны. Занадта спакойны, як на колішняга мадэрніста. Сказаў, што ўсе памерлі з таго часу. Разам з самой эпохай. Нават калі робяць выгляд, што жывыя. Так што цяпер ужо не даведаешся, чаго чакалі і ці дачакаліся.

Памерлі двойчы: першы раз, калі паверылі, што свет сапраўды на іх баку. Усе гэтыя прэміі, фестывалі, інтэрв'ю. Добрыя ганарары. Спецкурсы ва ўніверсітэтах. Палічылі ўсё гэта не пасткай, але ўзнагародай.

І другі, калі не сталі бунтаваць. Калі было канчаткова ясна, да чаго ўсё схіляецца.

Сам ён падняў бунт, але не пра тое. Падтрымаў, насуперак усім, чалавека, які аказаўся звычайным злачынцам. Потым пляваўся, канешне. Але было ўжо запозна.

Так здараецца, сказаў ён, і ў гэтым няма анічога страшнага альбо трагічнага. Цябе проста выкрэсліваюць са спісу. Хтосьці іншы будзе цяпер сціскаць тыя парэнчы.

* * *

Гэткім спосабам, мой мілы дэрвіш, і адбываецца тутэйшае жыццё. Хвіліны ціха перацякаюць у гадзіны, гадзіны стаюцца днямі, дні кладуцца цаглінкамі ў месяцы і сезоны. Тут, у Берліне, асабліва ясна і абгострана адчуваеш, што нікому з *нашых* ужо не выпадзе доля стаць Вядомым Еўрапейскім Паэтам. Альбо Мысляром. Ці Музыкам.

Не толькі таму, што вядомы, папулярны аўтар — гэта цяпер *работа машыны*. Не кон і не біяграфія, і зусім не тэксты, а надпіс на ўпакоўцы, дзе пасля коскі дбайна пералічаны ўсе ўзнагароды і фестывалі, пераклады і перавыданні. І зразумела, сістэма дыстрыбуцыі і продажу, лагістыка вядомасці, калі на паліцах у кожным мястэчку мусіць стаяць толькі *той, хто трэба*, і нікога болей.

Ёсць яшчэ адна прычына. Больш важная.

Вялікія бітвы ў мастацтве скончыліся. Да нашага нараджэння. У раннім новым часе, разам з тым, што калісьці называлася рамантызмам. Потым, у часы позняга мадэрну, кудысьці прапала і сама ідэя вялікасці — у дачыненні да мастацтва, і гэта было апошняй кропкай.

Сённяшняе мастацтва — гэта партызанскія групы, якія вядуць сваю вайну з рэальнасцю без спадзявання не толькі на славу і вядомасць, але нават на месца ў каноне.

Можа, таму нам так соладка думаць пра Джойса і Шонберга, пра Паўнда з Эліятам і Джона Кэйджа. Нават пра Оскара Мілаша.

Яны былі першымі, хто пайшоў у лясы і палі. Без спадзяванняў.

Першымі, хто зразумеў мастацкі імператыў новай эпохі. Закон пяшчотнай адасобленасці. Узвышанай непрысутнасці ў занадта часовым.

Іх саміх, дарэчы, спрабавалі прыручыць. Зрабіць часткай машыны.

* * *

А вось табе гэта давалася лёгка. Нават занадта лёгка. Ад самага пачатку. Маю наўвеце непрысутнасць.

Як быццам ты ішоў па скраі, каля самай мяжы. Зазіраючы раз-пораз на той бок. У вымярэнне, з якога ўсе нашыя жыццёвыя варушэнні выглядаюць па-іншаму. Дзіўна і крыху смешна.

Дарэчы, мяне заўсёды ўражваў твой давер да рэальнасці. Я б нават сказала, вясёлая згода на тутэйшую карму.

Я ніколі не чула ад цябе скаргаў альбо абвінавачанняў, што рэальнасць нас падманула. Што мы патрапілі не туды, доля лядашчая, краіна адсталая і нічога добрага з намі не здарыцца.

Колькі я памятаю нашыя размовы, ты, наадварот, расказваў, як усё цікава. Як многа ўсяго тут адкрываецца. І што тутэйшая доля даецца нам за асаблівыя заслугі ў мінулых жыццях.

Я была больш скептычная. І памылялася.

* * *

Тут, у Берліне, мне часам здаецца, што месца, дзе мы нарадзіліся, гэта як далёкі-далёкі склеп, дзе ў правільнай тэмпературы падыходзяць рэдкія віны.

У ім альбо заціхаеш разам з небам і працуеш з перспектывы стагоддзяў, для двух-трох сяброў, якім гэта сапраўды важна.

Альбо, і гэта таксама частка тамтэйшай долі, пачынаеш нервавацца, крыўдзіцца і ўрэшце ўцякаеш — у пошуках іншага, у больш шчаслівыя месцы.

Такіх, уцеклых, таксама многа, і яны ўсім расказваюць, як яны выйгралі ад таго, што ўсё нарэшце змянілі. І што хаця б іх дзеці змогуць гэтым пакарыстацца.

* * *

Калі ж надта хочацца славы і павагі, лепей за ўсё — як у Б. Атрымаць пропуск тады, калі сляпы і ўжо ні за што не трымаешся.

Тады гэта можна нават скарыстаць без асаблівай шкоды для душэўнага здароўя.

Я люблю пераглядаць яго ўспаміны.

Памятаеш, ты чытаў мне ягонае апавяданне, у адзін з першых вечароў. Пра Бібліятэку ў Бабілёне. Як касмічна тады гэта ўсё ўяўлялася.

Сусвет як Бібліятэка, апавядальнік, які падарожнічае ў пошуках Кнігі Кнігаў. Здавалася, аўтар — дэміург, які сядзіць на вяршыні гары, па правы бок Вечнасці. Гары, з якой бачна вельмі-вельмі далёка. І па-сапраўднаму.

А потым я прачытала, што Б. працаваў у той час у раённай бібліятэцы Буэнас-Айрэса. І *сусвет як бібліятэка* спісаны з гэтага жахлівага правінцыйнага кнігазбору, да якога трэба было гадзінамі дабірацца на трамваі, па пыльных вулках, праз падобныя адзін да аднаго кварталы.

Усё астатняе, усё, што мы тады соладка для сябе ўяўлялі: вялікі інтэлектуал, сусветная літаратура — усё гэта ўжо было пазнейшае. Цэтлікі, перадпродажная апрацоўка прадукту.

* * *

Зрэшты, тут усім ужо даўно не да Б. Усё скіравана на тое, каб забаўляць, бавіць і бавіцца. Калі штосьці й з'яўляецца ўзвышана-непрысутнае, абавязкова знойдзецца крытык, які напіша, як гэта было нудна і старамодна і што чытач гэтага не зразумее.

Баюся, у сённяшняй культуры "нудна" — гэта як вораг народа ў 30-я. Адразу прыходзяць канваіры і выводзяць — толькі не на расстрэл, а ў домік састарэлых, дзе такое ўсё яшчэ магчымае, але толькі як вінтаж і арт-хаўз і толькі ў тэрапеўтычных мэтах.

Усе астатнія даўно спяваюць і танчаць — пад хіжую і навязлівую музычку мізэрнага часу.

І гэта ў краіне, якая прыдумала Касталію!

* * *

Я ведаю, я несправядлівая і злая. І я нават ведаю чаму. Толькі ад гэтага не лягчэй ні мне, ні тым, хто поруч.

Зрэшты, я не імкнуся нікому аблягчаць іх задачу.

Я проста ціха і маніякальна нязгодная з тым *новым і прагрэсіўным*, што з'яўляецца тут на сталах і паліцах кнігарняў. І не збіраюся хаваць сваю нязгоду ад некаторых верных сяброў, якіх не бачыла занадта даўно.

І не скажаш жа, што народ не чытае. Выдавецтвы працуюць з перанапругай, кожны дзень на паліцы

паступаюць новыя і новыя вырабы. Гісторый безліч, і яны ніяк не сканчаюцца. Калі верыць выдавецкім анонсам, там можна знайсці ўсё: інтэлектуальны раман, скандальныя хронікі, рамантычную гісторыю кахання, авангардны комікс пра снежнага чалавека.

Праўда, гэтая разнастайнасць падазроным чынам укладаецца ўрэшце ў фармат — у добра пралічаныя выдавецкія лінейкі, з серыямі і калекцыямі, бюджэтнымі пэйпабэкамі, дарагімі зборамі твораў.

Самі аўтары, такое ўражанне, таксама добра пралічаныя. Прыдуманыя і выгадаваныя там, у кабінеце рэдактара. Потым, вядома, з'яўляюцца прыправы, адхіленні і дарагія віны ў дадатак, але гэтаму ўжо не верыш.

Рэч у тым, што ўсе яны безнадзейна нармальныя, і чым больш яны хочуць выглядаць *не-такімі-як-усе*, тым больш сумна і няёмка становіцца. Бо ўжо з трэцяй старонкі ты разумееш: аніякай прычыны быць нетакімі хлопчыкамі ў іх няма: і бацькі ў іх добрыя, і краіны, у якіх яны нарадзіліся, вызнаюць гуманізм і дэмакратыю, і жыццё яшчэ не падкінула ім пару падарунaчкаў, як прынцу Гаўтаму.

А яны ўсё расказваюць пра невыносныя пакуты маладой лесбіянкі ў прыгарадзе Джалалабада, потым кудысьці едуць па літаратурных стыпендыях... а потым развозяць кнігу па рэцэнзентах і далей ужо сядзяць на літаратурных сустрэчах, цярпліва распавядаючы хатнім гаспадыням, як многа яны перажылі.

Я баюся, што таксама патрапляю паводле іх класіфікацыі менавіта ў тэчку "перажытае": штосьці не так з маім тварам альбо з маёй вопраткай, што яны беспамылкова мяне туды размяшчаюць.

* * *

Зрэшты, большасць з іх заціхае пасля сарака, становіцца часткай машыны, займае свае месцы ў спісах выдавецтваў і на паліцах кнігарняў, і ўсе гэтыя распушванні пёркаў, паўлінавыя гульні, аказваюцца толькі спосабам расчысткі прасторы.

Некаторыя пачынаюць крыху бунтаваць, трапечуцца, як муха, якая патрапіла ў павуту і апошнім высілкам спрабуе зразумець, што адбываецца, але прыходзяць санітары, даюць дозу, і яе ўжо хапае надоўга.

Такое ўражанне, што меў рацыю А.: тут ніхто ніколі не перамагае, хаця і не прайграе да канца. Гэта для мяне самае загадкавае ў мясцовым ландшафце.

* * *

І ўсё ж ніхто не ў стане нас зразумець, акрамя немцаў. У нашых рэдкіх хваробах. І высокіх шаленствах.

Французы? і не гавары пра французаў.

Мілая падлеткавая нацыя. У стадыі невылечнай самазакаханасці. Адзіная магчымасць быць з імі — гэта стаць гэткім жа, прыняць, як свае, іх мілыя фішкі. Вывучыць мову, глытаць вустрыцы, бясконца паўтараць, што *Дэкарт — сэ ля франс*, і нават у гэта верыць.

Можа, калісьці даўно яны й жылі ў сталіцы свету і думалі пра чалавецтва. Але гэтая гісторыя скончылася. І здаецца, незваротна. Засталіся ўспаміны: *фратэрнітэ, эгалітэ, лібэртэ. Інтэртэкстуалітэ*. Культура, адным словам.

А немцы — не, яны дасюль у глыбіні душы пяшчотныя барбары, якім замала культуры. І замала рэальнасці.

А яшчэ трывога, непакой. Яны дасюль спрабуюць зразумець, што з імі *тады* адбылося. І хто насамрэч вінны, адкуль ішла спакуса.

Яны і цяпер, праз столькі год, баяцца люстэркаў.

* * *

Я думаю, Берлін са мной здарыўся як узнагарода. Альбо як апошні шанец. Ці нават як помста.

А можа быць, усё разам. І помста, і шанец, і ўзнагарода.

Пражытая ўтопія заўсёды меншая за самую сябе. Хаця ўсё ж такі большая, чым проста рэальнасць.

Я разумею, з Менска маё жыццё глядзіцца як казка. Пра якую мы маглі толькі марыць.

Я жыву ў Берліне, працую ў авангардным тэатры, пішу музыку.

Часам выязджаю на ўзбярэжжа. На некалькі дзён. Паблукаць, падумаць. Адчуць подых акіяна.

* * *

Раз-пораз, праўда, я выпадаю са сваёй мілай утопіі. І патрапляю на мяжу сну і явы, у незразумелае месца.

Як быццам я ўсё яшчэ ў сне, хаця ведаю, што даўно прачнулася. Хаджу па сцэне ў выпадковым спектаклі, свабодная, нікому не патрэбная. Без ролі.

І вось недзе падчас другога акта, калі я ўжо пачынаю нудзіцца — дзеяй і персанажамі, — адкрываецца бакавы калідор і адтуль пачынае цягнуць пройма.

Лёгкі цёплы ветрык. Прыемны, пяшчотны і ў той жа час крыху трывожны.

А далей з'яўляешся ты і пачынаеш нашэптваць. Словы з зусім іншае п'есы.

Пра загадкі і таямніцы.

Пра тое, што ў надвячорку ёсць яшчэ адзін надвячорак.

Што ўсе матылі ў дзяцінстве былі хуліганамі.

І шмат вартавых каля брамы.

* * *

Зрэшты, я не ўпэўнена, што нашэптваеш менавіта ты.

Што ўсё засталося ў памяці так, як было насамрэч, і што я не прыдумала ўсё гэта сама. “Хвілінку”, вершы, нашыя блуканні. Тваю ўзвышаную непрысутнасць на ўскрайку рэальнасці.

І што я пішу гэты ліст, як і ўсе астатнія, уласна табе.

* * *

Яна крыху затрымалася на гэтай фразе.

Падышла да вакна, пастаяла некалькі хвілінаў, углядаючыся ўдалеч.

З вакна было бачна возера: дрэвы расступаліся, утвараючы алею, сцяжынка ішла ўніз да вады і так натуральна ў яе ўваходзіла, што, здавалася, можна было ісці па сінім люстэрку на той бераг.

Раз-пораз у яснае надвор’е выплывалі яхты і пачыналі рабіць складаныя піруэты пад кіраўніцтвам нябачнага лідара.

Часам недзе далёка з’яўляўся абрыс парахода, які праплываў ціха, амаль без гукаў.

2.

Я яшчэ не расказала табе, як апынулася ў фраў Марты. І чаму.

Гэта доўгая гісторыя. З некалькімі пачаткамі, адхіленнямі і пакуль з адкрытым канцом. Цяпер я разумею, што ўсё ішло да таго. І нават больш, я гатовая прамовіць, што ўсё было непазбежна.

Хаця слова “непазбежна” не з нашага лексікону. Лепш было б сказаць, што ўсё здарылася магічна.

Усё важнае і нечаканае адбываецца магічна. Пераход логікі ў магію — гэтым жыве музыка, і раней ці пазней ён цябе знаходзіць.

Асабліва калі жыццё з гатовасцю ўкладаецца ў прапанаваныя формы. *Занадта часовыя, каб быць праўдай*. І тады пачынаеш чакаць цуду, альбо цудаў, у залежнасці ад ступені нахабства.

Чакаць альбо крыху прыспешваць. Ці нават ствараць іх, чаму б і не?

* * *

Гэта было напрыканцы *слаўнай эпохі*. У Менску мяне пазнавалі на вуліцах, графік канцэртаў быў распісаны наперад на тыдні і месяцы.

Крыху падточваў сумнеў, але, папраўдзе, усё выглядала не так ужо і страшна. Здавалася, гэта і ёсць

свабода. Калі ты разумееш, чаго свет ад цябе прагне, і можаш на гэта пагадзіцца без асаблівай шкоды для душэўнага здароўя.

Шмат што было праспяванае, і за большасць рэчаў было не сорамна.

Але ўжо ішлі размовы, што трэба быць менш складанай, звярнуць увагу на знешні вобраз, даваць больш інтэрв'ю і канцэртаў.

І гэта пачынала напружваць.

* * *

Аднойчы мы сядзелі за столікам у кавярні пасля выступу ў адным не самым вядомым варшаўскім клубе. І добры знаёмы, журналіст *выборчай*, пачаў задаваць пытанні. Для газеты.

Напачатку — уражанні ад польскай публікі. Крыху біяграфіі, крыху асабістых гісторый. Потым перайшлі да асноўнай часткі. І ён пачаў пытацца ў мяне пра дыктатуру, адсталасць, пра тое, як можна выжываць там, у вас, сярод бяды і нястачы. І ці не было ў мяне думкі пераехаць у больш цывілізаванае месца. Адным словам, пачаў выстройваць тую банальную карцінку пра нешчаслівых суседзяў з усходу, якая, пры праўдзівасці асобных дэталяў, правальваецца ў самай важнай, сутнаснай частцы.

Мне не хацелася спрачацца, і я вырашыла перавесці стрэлкі. Слухай, Войтэк, сказала я, наліваючы чарговы кілішак тэкілы. А ці не хацеў бы ты запытаць у мяне штосьці пра музыку?

Я была светлай і пазітыўнай, гатовай абмінуць гэтае балотца.

Повем праўду, майму чытачу до дупы, цо ты мыслеш пра музыку, сказаў Войтэк. Ён ведае, што на ўсходзе страшна, і прагне падрабязнасцяў. Здагадваецца таксама, што там ёсць і добрыя людзі. Гэта ты. Вось табе нашая гісторыя. Гісторыя прагрэсіўнага артыста ў цёмнай і адсталай краіне са страшным і неадукаваным дыктатарам.

Ён не хацеў мяне пакрыўдзіць, ён проста рабіў сваю работу.

І шчыра хацеў мне растлумачыць маё рэальнае месца ў карціне свету. Каб я не блыталася. І не выглядала смешнай са сваімі прэтэнзіямі на іншую ролю.

Потым я шмат разоў вярталася да гэтага здарэння. Спрабавала ўсё зразумець і ўсё яму патлумачыць. Знайсці патрэбныя словы. Расказаць пра эпоху комікса, пра змяншэнне маштабу і закрыццё далягляду. Патлумачыць, як працуе арыенталізм і што такое барбары з усходу. (Не паверыш, я нават прачытала Саіда!) Але ўсё гэта прыдумалася значна пазней, пасля ўцёкаў, у маім берлінскім ашраме.

Тады ж у маёй свядомасці проста склалася карцінка, і я ўбачыла Машыну. Якая стварае месцы свету і заганяе нас туды, як шарыкі ў лункі. І калі ты не супрацоўнічаеш, будзеш сядзець да канца жыцця ў цёплым вільготным загончыку.

* * *

Мяне такія рэчы кідаюць у халоднае вар'яцтва. Я раблю нечаканае, перш за ўсё для самой сябе.

Памятаеш, у Матрыцы Нэа ў пэўны момант выбірае між ілюзіяй і пустэчай рэальнасці. Трыніці пры-

возіць яго да Морфіуса, і той прапаноўвае выбар між дзвюма пігулкамі.

Я была тады дакладна ў падобнай сітуацыі. Ветліва ўсміхнулася, дапіла кілішак тэкілы. Прыняла чырвоную пігулку. Расплюшчыла трэцяе вока.

Перасела да століка мясцовага гурта, які граў у кавярні штосьці неабавязкова-бразільскае: басанову ці самбу, я ўжо не памятаю.

Праз пару хвілінаў я выйшла на сцэну і пачала спяваць.

Я ніколі так не спявала. Ува мне штосьці прачнулася, дзёрзкае і небяспечнае. Я адчувала магію, і натхненне, і свабоду. За свой столік я тады не вярнулася.

Хаця лепей было б сказаць, што я тады нікуды не вярнулася.

Я зразумела, што рэшту жыцця буду размаўляць з тымі, каму важна, што я думаю пра музыку.

* * *

Так пачалася мая асабістая лінія фронту. Вайна з рэальнасцю. Я б нават сказала, *вайна за рэальнасць*. Было ясна, што толькі мастацтва здольнае вярнуць свету сэнс, а нам — разуменне.

Сапраўднае мастацтва. Але ў яго не так проста патрапіць.

Усе думаюць, што яно вельмі-вельмі далёка, і ў гэтым галоўная праблема. Ла скала, Алберт хол, Метраполітан Опера. Высокае і гарантаванае месца, адкуль на цябе важна глядзяць Бах, Моцарт ды іншыя *несмяротныя*.

І калі ты таго варты, а да таго ж табе пашанцуе і ты патрапіш у поле ўвагі — эпохі, публікі, дырыжора, — яно будзе ўзнагародай.

А ўсё астатняе, гэта толькі папярэдняя падрыхтоўка, трамплін. Прамежкавае і дапаможнае.

І я так лічыла, у пэўныя моманты свайго жыцця.

Цяпер я разумею, што гэта могілкі. Прыўкрасныя могілкі, убраныя ў мармур, з кветкамі і званочкамі.

І што лінія фронту зусім у іншым месцы. Сапраўдная лінія фронту. З героямі і бітвамі. Над якой лётаюць валькірыі.

Але тады, у Варшаве, я толькі пачала сваё падарожжа. Свой уласны пошук.

Пачынала разумець некаторыя істотныя рэчы.

* * *

Напрыклад, тое, што музыка — не проста гармонія лічбаў, як думаў Піфагор. Ці ўдалыя спалучэнні гукаў, як думае паспалітая большасць. І нават не толькі эмоцыя, якой нагружаюць аднойчы знойдзеную гармонію таленавітыя выканаўцы.

Музыка патрабуе прасторы, яна ёсць у прасторы, надае ёй рытм і суладнасць.

Скрыпачка ў забытай карчме, стары даос, які грае на цы, седзячы ў гарах, сляпы бандурыст сярод полымя, які пяе *славу Дарашэнку*, а вакол усе пасечаныя ляжаць.

Гэта важна, а не толькі канцэртныя залы і віртуозы.

Важна мець і адчуваць свае месцы, як унутры музыкі, так і звонку. Шукаць іх і ствараць.

Цяпер я разумею ўсю незвычайнасць залы філармоніі ў нашыя васьмідзясятыя. Усю яе ўнікальнасць. Адзінкавасць.

Жыццё разлінаванае і пралічанае, але ёсць прастора, дзе адбываецца цуд музыкі.

Бо музыка не толькі лічба, але і шурпатасць гуку, і краявід, унутры і звонку, і сэрцы, якія звіняць ад болю.

* * *

Старыя кітайцы лічылі, што існуюць тоны і сугуччы, на якіх трымаецца космас. Ёсць і іншыя, што вядуць да пагібелі, катастрофы. Гукі, якія руйнуюць не гарады і будынкі, але сам свет.

Яны сыходзілі ў горы і лясы, гралі сваю музыку ветру і дрэвам, спрабуючы патрапіць у тон.

Знайсці гармонію, падтрымаць раўнавагу.

Для іх музыка была *падарожжам у сады тайны*.

* * *

Яна крыху павагалася з “садамі тайны”.

Гэта магло быць занадта сентыментальна. Альбо прэтэнцыёзна.

Ці проста незразумела. Прынамсі патрабавала расшыфроўкі, тлумачэнняў.

Яна паставіла зорачку і напісала больш дробным почыркам унізе старонкі:

Сады тайны — суфійскі (?) тэрмін, сапраўднае значэнне якога адкрываецца адэпту на вышэйшых ступенях узыходжання. У якасці паэтычнай метафары

з'явіўся ў зборніку "Лісты з паўночнай затокі" беларускага паэта Францішка Рамулевіча.

Другі раз паўстаў у адным з лістоў спявачкі і кампазітара Эвы Дамінікі Вайтовіч у яе "берлінскі" перыяд. Абазначае разрыў з тэхнічным майстэрствам і ўвогуле з тэхнічным бокам музыкі ў той момант, калі само майстэрства і тэхнічны бок дасягаюць свайго піку.

* * *

Вяртаючыся да ўцёкаў.

Я нічога не сказала. Але штосьці ўва мне незваротна змянілася. І зусім не так, як звычайна думаеш пра жыццёвыя павароты — якія мусяць адбывацца трагічна і запамінальна, з фанфарамі і духавым аркестрам.

А тут проста перагарнулася старонка і распачаўся другі раздзел кнігі. Зранку я выкінула ў сметніцу каляндар з планамі і праектамі. Унутры было цёпла. Я зноў адчувала сябе сямнаццацігадовай, для якой свет толькі адкрывае свае лабірынты.

Я блукала па Варшаве як быццам упершыню. Кожнае раздарожжа было святам і музыкай. Вабіла і запрашала ў дарогу.

На адным з іх я пабачыла Алехандра.

І вось тады ўсё сапраўды пачало мяняцца.

З фанфарамі і духавым аркестрам.

* * *

Ён стаяў на ціхай вулачцы, непадалёк ад *Трох крыжоў*, і граў на гітары.

Ведаеш, за сваё жыццё я нагледзелася на розных музыкаў. У тым ліку й на тых, якія лічаць важным

і амаль абавязковым у пэўны момант выйсці навонкі і падзяліцца з народам сваімі дзесяццю акордамі. Я нават навучылася ставіцца да іх без паблажлівага скепсісу, з любоўю.

Але тут была зусім іншая гісторыя. Гэта было ясна без тлумачэнняў.

Гітара была канцэртная. Надзвычай дарагая. І было бачна, што ён грае для сябе. А можа, для космасу.

Тыя, хто жывуць унутры музыкі, адчуваюць такія рэчы адразу. Як чалавек трымае інструмент, як ён бярэ гук, як чуе тое, што на выхадзе.

Пры гэтым ён не граў штосьці тэхнічна складанае, прызначанае для віртуозаў. Звонку можна было нават падумаць, што ён рыхтуецца, настройвае гітару. Так, асобныя гукі і сугуччы, з паўзамі і чаканнем.

Але ўсё гэта складалася ў цэлае!

Ён ствараў цуд музыкі на роўным месцы.

Раз-пораз спыняўся, як быццам яму самому хацелася паслухаць рэха альбо водгулле.

Я падышла і стала побач. Спачатку проста слухала і глядзела.

Потым пачала напяваць. Для сябе. Паралельна. Спраўджвала некаторыя гіпотэзы.

Ён усміхнуўся і даў мне далучыцца.

* * *

Мне стала цікава — у чыста прафесійным, музычным сэнсе. Мы стаялі ў цэнтры Варшавы, сярод сумятні і бяссэнсіцы гэтага свету, і імправізавалі. Ці, лепш сказаць, эксперыментавалі. Як быццам на рэпетыцыі альбо на музычным семінары ў кансерваторыі. І зусім забылі пра публіку.

Мы былі ўсярэдзіне, напэўна, гадзіну.

А калі выбраліся нарэшце з гэтага лабірынту, вакол стаяў натоўп, як на невялікім канцэрце.

І не проста мамы з дзеткамі альбо лянівыя турысты.

Гэта былі сапраўдныя слухачы! Было бачна, што музыка іх заспела знянацку, што яны паддаліся спакусе, хаця ў кожнага купа справаў і абавязкаў. Яны былі разам з намі ўнутры, а некаторыя яшчэ й разумелі, што адбывалася.

Я тады адразу адчула — павінен быць працяг. Мы былі на пачатку ўсяго, шмат што мусіла яшчэ адбыцца. Размовы, дыскусіі, сумесныя канцэрты.

І не памылілася.

* * *

Я пакінула яму свой нумар тэлефона і сказала, што з радасцю працягну размову ў іншым месцы. Ён перазваніў праз гадзіну.

Мы дамовіліся сустрэцца на летняй пляцоўцы ў Лазэнках.

Зайшлі ў кавярню, пазнаёміліся яшчэ раз.

Увечары ў яго было выступленне непадалёк, у невялікай камернай зале. Ён даў мне прагледзець асноўныя тэмы. І прапанаваў выступіць разам. Так, як тады на вуліцы. Быць музычным альтэр эга, двайніком. Рэагаваць і працягваць, і ў той жа час шукаць штосьці асобнае, весці сваю лінію.

Няма аніякіх правілаў альбо абавязкаў, сказаў ён. Канцэрт камерны і прыватны. Пра нас не напішуць штодзённыя газеты, і нам не давядзецца ганяцца за музычнымі крытыкамі, расказваючы, як нечакана і арыгінальна было тое, што яны толькі што паслухалі.

Важна, каб нам самім было цікава. Каб музыка паўставала не з інструмента альбо голасу, а з самой прасторы. І заставалася ў прасторы, калі гукі ўжо заціхнуць.

Усё гэта ён расказваў мне ўжо па-гішпанску.

Было крыху смешна — мы пачыналі размову па-ангельску, але ў пэўны момант ён — незаўважна для сябе самога — перайшоў на гішпанскую. Надзіва, я разумела амаль усё. Мая рудыментарная французская ў адказ была сустрэтая з энтузіязмам. І далей мы міла абмяркавалі — на ёй — некаторыя дэталі.

* * *

Усё было зусім па-іншаму, чым гэта ўяўлялася напачатку.

Алехандра быў майстра. І ў яго была самая дасканалая каманда, якую я бачыла ў сваім жыцці.

Гэта не былі вулічныя музыкі, якія збіраюць касу на перапоўненых турысцкіх скрыжаваннях. І не прафесійныя гастралёры, што шчасліваць правінцыйныя залы класічным рэпертуарам, даючы ілюзію далучанасці да вечнага.

Яны відавочна былі нечым большым — і іншым. Жылі разам, невялікай творчай камунай, пераязджаючы з горада ў горад, з краіны ў краіну.

У іх быў план.

І яны былі ў падарожжы.

* * *

Знаёмцеся, гэта Хорхе. Кухар, шаман і крыху адміністратар па сумяшчальніцтве. А гэта Эва Дамініка. Наша новая спявачка.

Так сказаў Алехандра, калі ў пакойчык зайшоў чалавечак, падобны адначасова да Карлсана, Віні-Пыха і ўсіх астатніх персанажаў дзіцячых мульцікаў.

Хорхе здабывае для нас жытло і ежу, а ў перапынках вучыць мудрасці й апякуецца нашым душэўным здароўем, дадаў ён, і абодва зайшліся дзіцячым смехам.

Потым, праз некалькі хвілінаў, зусім у іншым тоне — галантным і крыху трывожным:

Герміна, гэта Эва Дамініка. Эва Дамініка, гэта Герміна. Спадзяюся, вы пасябруеце.

А што, маем выбар? — сказала Герміна і першая падала руку для знаёмства.

Тонкія рысы твару. Мяккі, упэўнены голас. Арыстакратызм у пятым ці шостым пакаленні.

Ясна, мы не мелі выбару.

Хаця і крыніцы трывогі былі зразумелыя. Дзве жанчыны ў адной камандзе — гэта амаль заўсёды суперніцы. Нават калі яны да гэтага не імкнуцца. Альбо гэтага не ўсведамляюць.

Герміна прынесла праграму выступу — "Каментары й імправізацыі". З ангельскім тэкстам ды якаснымі фотаздымкамі, аддрукаваную на добрай паперы. І відавочна не тут, у Варшаве.

***

Хорхе адказваў за інфраструктуру. Дамаўляўся, арганізоўваў пераезды, друкаваў афішы. Быў сапраўды крыху шаманам.

Ён скончыў філасофію і літаратуру ў Буйнас-Айрэсе, прыехаў у Еўропу рабіць дактарат, але нечакана для сябе адкрыў паспяховы рэстаран аргентынскай кухні.

Проста ўсе ведалі, што такое мексіканская кухня, сказаў ён мне, калі мы пасябравалі. Але ніхто не меў аніякага ўяўлення пра аргентынскую. Можна было рабіць што заўгодна.

Назва мусіла быць традыцыйная. Што-небудзь кшталту La Parrilla. Argentinisches Steak-Restaurant. А вось далей, калі заходзіш усярэдзіну, пачыналіся цуды.

Салат Хорхе, напрыклад. Пайшлі чуткі, што гэта ўлюбёны салат Борхеса.

Рэстаран квітнеў, наведвальнікаў станавілася больш і больш.

Там яны ўсе і сустрэліся, дарэчы.

* * *

Што рабіла Герміна, праяснілася не адразу. Яна паходзіла з вядомай прафесарскай сям'і. І ўсё ж такі раўнавала, хаця падставаў не было аніякіх.

Урэшце мы зразумелі адна адну. Нават пасябравалі. Асабліва калі я расказала ёй пра радавое дрэва, некаторых сваякоў з васямнаццатага і дзевятнаццатага стагоддзяў.

У часы нашай маладосці гэта назвалі б класавай салідарнасцю.

Потым я даведалася, што яна скончыла гісторыю музыкі. І што некаторыя музычныя ідэі і павароты — яе заслуга.

Да таго ж яна тут была адзіная з правільным еўрапейскім пашпартам. І калі паўставалі пытанні, заўсёды была на вышыні.

Аднойчы ў французскай правінцыі асабліва пільныя суседзі палічылі нас падазронымі.

Хорхе знайшоў жытло, досыць танна, у ціхім, спакойным месцы. Былы замак. Лепей сказаць замачак. Ідэальнае месца для рэпетыцый. Тыдзень мы адтуль практычна не выходзілі. Наперадзе былі важныя канцэрты ў Ліёне, і мы рыхтаваліся.

Але суседзі пра гэта не ведалі і пазванілі ў паліцыю.

Тыя прыехалі хутка і з поўным наборам: жандары, эксперты, фатографы.

Герміна зрабіла толькі адзін званок. І потым перадала слухаўку камісару — ці як ён там называецца.

Трэба было бачыць ягоны твар, як ён мяняўся цягам хвіліны.

Ад насцярожанасці і пагарды да галантнасці, ветлівай увагі і амаль шчасця напрыканцы, калі ўсё праяснілася.

* * *

Вяртаючыся на пачатак.

Ім сапраўды была патрэбная спявачка. Алехандра ўмеў шмат што, але не адначасова. Да таго ж два чалавекі — гэта зусім іншы музычны матэрыял і зусім іншыя магчымасці.

І тое, што я раптоўна матэрыялізавалася, падышла да іх і засталася, выглядала як цуд і як падарунак. Божай Маці, лёсу ці проста выпадку.

Так сказаў Алехандра, і я зразумела, што прынятая ў каманду.

Я не адразу ўсвядоміла, што ўсё сур’ёзна. Напачатку здавалася, што гэта проста нечаканая прыгода. На тыдзень-другі. Яшчэ адна гастроль. Цікавая, экзатычная.

Я так і думала, праўду кажучы, калі забірала рэчы з гатэля і пераязджала да іх на кватэрку.

Калі б мне тады сказалі, што я завісну на гады і ўрэшце застануся ў Берліне, я проста б не паверыла. Усміхнулася, сцепанула плячыма.

І ўсё адно пераехала.

* * *

Мы гралі ў камерных залах і прыватных апартаментах, на рынкавых пляцах і вулічных скрыжаваннях, начавалі ў сквотах, замках і пяцізоркавых гатэлях.

Можна было б назваць гэта эпохай бяздомнасці. Але бяздомнасці глыбокай. Насычанай музыкай. І сустрэчамі.

Хацелася абтрэсці з сябе ўсё неўласцівае. Усё, што нам навязвае час. Усе прывязанасці. У тым ліку і да сябе. Да сваёй асобнасці.

Пакінуць толькі музыку.

І сябе саму, канешне, таксама. Але не тую, выпадковую, злепленую з падзеяў, якіх магло б не быць. А сябе іншую. Сутнасную. Адважную. І крыху трагічную.

Зрэшты, сустрэцца з сабой можна толькі тады, калі сябе губляеш. Ахвяруеш. Забываеш і забываешся.

Трэба было падысці да мяжы. Зазірнуць у люстэрка. Зразумець, што за гэтым адбіткам. За моракам надта чалавечага, які засціць і замінае бачыць.

* * *

Я не ўяўляла, колькі людзей кідае ўсё, каб проста блукаць па свеце. І якое гэта братэрства насамрэч. Мы сустракаліся, як астранаўты ў глыбокім космасе, радасна і пяшчотна. Раз-пораз я пераглядаю ў памяці твары ўсіх, нібы ў фотаальбоме.

Сівы кітаец, які граў на цыні, мы спаткалі яго непадалёк ад Порта, зусім аднаго, як яго туды занесла, ён так і не змог нам растлумачыць.

Бандурыст Олэкса з-пад Золачыва, які быў зусім не сляпым, а вельмі нават і відушчым, з маладзенькім павадыром-анархістам, яны пераходзілі ад аднаго сквота да іншага, як ад вёскі да вёскі.

Старэнькія музыкі з-пад Андаў, што ўцяклі яшчэ ў маладосці, у часы Пінахэта, і цяпер проста не маглі спыніцца. А можа, не хацелі, бо тыя, каго яны памяталі, каго любілі і пра каго спявалі, былі цяпер на другім беразе.

Усе яны былі невыпадковымі вандроўнікамі, па-за мармуровай халадэчай вялікіх залаў, з важнай адукаванай публікай і гарантаванай увагай.

* * *

Аднойчы мы месяц жылі ў старым кляштары ў Італіі, амаль без манахаў. Разбіралі музычныя рукапісы.

Прыехалі на тыдзень, падрыхтавацца. На трэці дзень нас завялі ў скрыпторый і паказалі архіў.

Мы вярнуліся пасля канцэрта. І засталіся на месяц.

Герміна пазваніла дадому, да нас далучыліся яе сябры, гісторыкі музыкі.

Штораніцы мы збіраліся на сустрэчы — як быццам бы вярталіся ў дзяцінства. Да крыніцаў. У момант, калі ўсё пачыналася, усё было магчыма і ўсё было магчымасцю.

Зрэшты, мы вывучалі ўсё гэта ў кансерваторыі, у курсе гісторыі музыкі. Больш ці менш падрабязна. Але тады гэта выглядала чыстай абстракцыяй. Здавалася, усё гэта прыдумала Аліна Янаўна — цётачка, якая

выкладала ў нас гэты прадмет і даўно пагадзілася, што *нікомугэтанецікава*.

Менавіта там я зноў пачала пісаць. Зусім па-іншаму, чым у Менску. Нават пачала складаць оперу. І ясны пень, яна называлася “Сымон-музыка”. Хаця самога тэксту пад рукой не было, а са школьных часоў у памяці засталіся толькі ўрыўкі.

* * *

Якой была мэта нашага падарожжа? Хто складае маршрут і вызначае пункты прыпынку? і ці мы збіраемся кудысьці даехаць?

Я не задавала сабе гэтых пытанняў. Напачатку.

Але ў пэўны момант некаторыя рэчы пачалі звяртаць на сябе ўвагу. Напрыклад, тое, што ў нас не было доўгага плана. Мы ніколі не абмяркоўвалі, дзе будзе наступны канцэрт.

У пэўны момант нешта здаралася. Як быццам у паралельнай рэальнасці. І мы зрываліся ды йшлі наперад. Часам выглядала, што мы некага шукаем альбо пераследуем, так хутка ўсё адбывалася. Ці, наадварот, уцякаем ад пераследу.

Пад канец я навучылася адчуваць гэта. Нават прадчуваць. Хаця растлумачыць уцямна, што менавіта, было складана.

За некалькі дзён да пераезду ў калідорах амаль заўсёды стаяў пах. Дзіўны пах. Аднойчы я запыталася ў Герміны, ці не чуецца ёй у паветры чагосьці асаблівага.

Нічога асаблівага, адказала яна. Звычайны *Cannabis indica*. З пакоя Алехандра. Там, дзе ён нарадзіўся, каля Рыа-Гранда, гэта практыкуюць стагоддзямі. Называюць расліну *mariguan*. Лічаць яе падарункам святой

Марыі і святога Хуана. Адзіны добры падарунак белага чалавека.

* * *

Сам Алехандра называў гэта сеансам магіі.

Аднойчы мы з Гермінай зайшлі да яго падчас падрыхтоўкі.

Ён раскладаў прыставанні. Адмысловыя спадачкі для палення, файкі. Прапанаваў далучыцца. Герміна незадаволена прабуркатала, але ёй было відавочна цікава.

Зрэшты, бачна было, што для яе гэта не ўпершыню. Што яна ўжо была тут, і не адзін раз.

Ён сам усё падрыхтаваў, на трох.

Запавесіў фіранкі, паставіў дзіўную музыку — нейкія рытмічныя мармытанні пад бубен — і ўсё пачалося.

* * *

Тое, што я памятаю, было прыўкрасна.

Свядомасць застаецца. Абгастраюцца ўсе пачуцці. І з'яўляюцца новыя. Рэальнасць пераўтвараецца ў кнігу, старонкі якой можна перагортваць у якім хочаш кірунку, назад і наперад.

Алехандра з кімсьці спрачаўся. У далёкім куце. З кімсьці важным, адказным за ўсіх. *З таго боку*.

Мы размаўлялі з Гермінай. Я расказала ёй пра цябе, пра Багдана. Пра нашую сустрэчу ў інтэрнаце, з якой усё пачалося. Пра дзевяностыя, славу і ўцёкі.

Яна слухала з пяшчотнай увагай. Прызналася, што ўсё ж такі раўнавала. Хаця разумела ўсю неабходнасць.

Потым сказала, што хоча пабыць крыху са мной. Увайсці ў маё ментальнае цела.

Сказала, што такое магчыма, калі чалавек спіць, недзе недалёка. Але не толькі. Галоўнае — не баяцца сябе згубіць, адкрыцца другому напоўніцу.

Гэта было дзіўнае адчуванне. Як быццам мы крыху пераблыталіся. Я не магу гэта растлумачыць. Я гаварыла з Гермінай, але дакладна пры гэтым ведала, што размаўляю сама з сабой.

Я нават крыху помню, пра што была размова.

Прачнуліся мы ўдзвюх, без вопраткі, у ложку Александра.

Сам ён сядзеў у тым жа куту, цягнуў матэ і хітра на нас пазіраў.

Сказаў, што мы былі цудоўныя. Добра сябе паводзілі. І што яму было надзвычай цікава нас слухаць. Ён нават адарваўся ад сваіх звыклых спрэчак з тым бокам.

Я ўжо тады адчувала: усё занадта прыгожа, каб доўжыцца вечна.

* * *

Гэта адбылося пад вокнамі нашага дамочка. Непадалёк ад Парыжа. Мы жылі тут ужо месяц, у зацішшы. Як быццам некага, ці нечага, чакалі.

Герміна ўсё бачыла. Яна расказвала, што ўсё было як на запаволенай кінастужцы.

Звычайны вераснёўскі надвячорак. Кіроўца «Audi» цвярозы і няшчасны — яго, напэўна, не павысілі ў якім-небудзь аддзеле па продажах. А Александра крыху п’яны і шчаслівы — ён толькі што пагаварыў з духамі і ведаў, дзе будзе наступны прыпынак нашага падарожжа.

Яны сустрэлі адзін аднаго на пустым пераходзе, як інь і ян.

Вось Алехандра спускаецца да брамкі, выходзіць на вуліцу.

Ідзе праз дарогу. Даходзіць да сярэдзіны. Спыняецца, пра штосьці думае. Потым абарочваецца, глядзіць у вакно і махае рукой, як быццам развітваецца альбо перадае ад кагосьці прывітанне. Ужо адтуль.

Далей агні машыны, што вылятае з-за павароту, скрыгат тармазоў і гук удару.

І потым цішыня. Як быццам канец спектакля і апускаецца запавеса, глухая, пыльная, з чорнага аксаміту.

* * *

Мы не маглі везці цела ў Мексіку. Зрэшты, не было да каго. У яго не было сваякоў, маёмасць ён прадаў перад тым, як адправіцца ў падарожжа.

Хорхе арганізаваў месца на старых могілках, у правінцыі. З відам на мора. Герміна тыдзень піла і плакала. Я паклала на музыку Валеры і спявала на пахаванні.

Алехандра быў ціхі і прасветлены, як быццам нарэшце ўсё зразумеў і з усім пагадзіўся.

Падарожжа завершанае, сказаў Хорхе. Ён знайшоў самае важнае месца для сябе і для сваёй музыкі.

Там, у нябачным.

* * *

Застаўся архіў. Фрагменты, музычныя п’есы, нататкі.

Дзень у дзень я прасоўваюся далей і далей. Разбіраю паперы, чытаю і расшыфроўваю, класіфікую. Гэта цяпер мая работа.

Прыйшлося вучыць гішпанскую. Распачаць некаторыя амаль дэтэктыўныя *investigations*, што тычыцца яго мексіканскага перыяду.

Яго постаць вымалёўваецца ўсё больш і больш дзіўнай. І сам ягоны праект для мяне прасвятліўся — я нарэшце пачала разумець, куды патрапіла.

* * *

Ён не быў вулічным музыкам, як гэта падавалася звонку. У яго былі трагічная біяграфія і бліскучая кар'ера.

Нарадзіўся ў сям'і тубыльцаў. Быў аддадзены ў кляштар, у прытулак. Ужо там выявіліся яго здольнасці да музыкі.

Далей усё было як у казцы. Ён пераходзіў ад настаўніка да настаўніка, ад майстра да майстра. Кампазітар, выканаўца, дырыжор — усё давалася яму лёгка.

Ён сам становіцца майстрам. А потым раптоўна ўсё кідае — і адпраўляецца ў падарожжа.

Ці была ў яго мэта? Куды ён скіроўваўся і чаго шукаў?

Ён пісаў пра сутнасную бяздомнасць музыкі ў нашую эпоху. Для якой у свеце больш няма месца. Канешне, ёсць кансерваторыі і філармоніі, музычныя залы, зоркі і зорачкі, усяго гэтага многа. Квіткі вельмі дарагія, раскуплены на месяцы і гады наперад.

Але ўсё гэта *прамінулае музыкі*.

Каб зразумець, возьмем аналогію з літаратурай. Уяві сабе, што большасць выдавецтваў займалася б тым, што бясконца перавыдавала даўна напісанае. І ў кніжных крамах стаялі б толькі розныя выданні Сервантэса й Гётэ, Бальзака і Гамера, Дантэ і Вергілія.

Была б і сучасная літаратура, канешне, але толькі як невялічкая палічка, недзе ззаду, у куце. Як дадатак, цікавы толькі вузкаму колу аматараў.

Лепш ужо бяздомнасць, беспрытульнасць. Лепей падарожжа, чым такі закуточак. Такі лёс.

* * *

У кансерваторыі ў нас была асобная спецыяльнасць — музыказнаўства. Да тых, хто там вучыўся, ставіліся з павагай, але і з дыстанцыяй. Ну, можа, не ўсе, але большасць дакладна. Лічылася чамусьці, што плата за веданне непамерна высокая. Што яны не ў стане патрапіць усярэдзіну, стаць уласна музыкай. Можа, гэта й так.

Але пытанні пра сутнасць, пра істоту можна задаваць па-рознаму. Могуць быць розныя сцежкі.

Адна рэч — прагнуць улады, імкнуцца да веды, каб панаваць, валодаць. І зусім іншая — тыкацца пысачкай у гаючае разуменне, шукаючы паратунку ад наяўных формаў. Ад часовага.

У пэўны момант мне пачало здавацца, што я валодаю музыкай, што гэта майстэрства, прафесія. Пасля музычнай вучэльні і пяці год кансерваторыі ў пэўным сэнсе так і было.

А потым стала ясна, што гэта тупік.

Я зразумела, што мне мала проста ўмець. Я зусім не хачу займацца музыкай — я хачу жыць музыкай. Адчуваць яе ў сабе як магчымасць. Як лёт над безданню. Як сон, што імкнецца навонкі.

* * *

Хорхе вярнуўся да сваёй рэстарацыі.

Герміна — ва ўніверсітэт.

А я засталася ў пустэлі рэальнасці. Завісла.

Зразумела, што яшчэ не час для вяртання. Што мне патрэбна, каб усё ўклалася, стала больш ясным.

У мяне на рахунку былі грошы. Дастаткова сур'ёзныя. Хорхе сказаў, што гэта мая частка агульнай долі, таго, што мы зараблялі альбо нам пералічвалі дабрадзеі.

Гэтага хапала на два-тры гады спакойнага жыцця ў не надта дарагім месцы.

Але спакою якраз і не хацелася. І я выбрала дарагое.

Знайшла кватэрку ў самым цэнтры Берліна, з фартэпіяна ў гасцёўні і шырокім вакном на Шпрэе.

Раз-пораз выходзіла на вуліцу паспяваць — проста каб яшчэ крыху пабыць там, сярод людзей. Адчуць сябе часткай гэтага свету. І забыцца, канешне, — больш за ўсё хацелася забыцца, перастаць сябе шкадаваць. А што можа быць лепшым для забыцця, чым музыка?

Там мяне й пабачыла фраў Марта.

* * *

Я стаяла на вуліцы.

Спявала трагічна, для сябе. Зусім не так, як спяваеш, калі хочаш спадабацца. Няўтульнасць, відавочна, была на маім твары, каліўца бяздомнасці, а яшчэ, напэўна, крыху агіды да гэтага свету, які аніяк не ў стане прыняць узвышанае і знайсці яму месца.

Мяне пачалі асцярожна абыходзіць.

Ведаеш, як гэта бывае. Калі перастаеш быць *nice*. Мілай і прыязнай. Калі нікому няўцям, што здарыцца з табой у наступную хвіліну.

Можа, ты проста схаваеш гітару і вернешся дадому. А можа, дастанеш бомбу і паспрабуеш узарваць гэты дурацкі свет разам з сабой.

Я зразумела, што сёння не мой дзень, што трэба вярнуцца, адпачыць, нарэшце падумаць, што рабіць далей, і пачала адну старую песню, на развітанне — пра тое, як за дахамі места памеркла пазалота нябёсаў і на вуліцы пацiху сыходзіць змрок, на словы Багдановіча.

Я спявала і плакала, бо было ясна, што змрок сапраўды пацiху апускаецца на горад, і нічога з гэтым не зробіш, можна толькі прыняць гэта і ўсім дараваць.

* * *

Яна была падобная да Лені Рыфеншталь. Надзвычай падобная. Першыя некалькі секундаў я была нават упэўненая, што гэта яна. Высокая, з тварам, нібы высечаным з каменя скульптарам старой школы.

Падышла і сказала дзякуй, вы вельмі добра спяваеце. Сказала па-ангельску, вельмі выразна, так, як гавораць дыктары на тэлевізіі альбо акторы. І адразу прапанавала паехаць да яе, папіць добрай кавы і паразмаўляць. Гэта было ўжо дзіўна, такога яшчэ не здаралася. Я вагалася толькі хвіліну.

Мы селі ў таксоўку, заехалі ў невялікі прыгожы домік каля возера, на ўскраіне.

У гасцёўні стаяў стары раяль, ідэальна настроены.

Я выбрала некалькі нямецкіх песень, крыху габрэйскіх, потым перайшла на беларускія. Спявала Жылку,

ягоныя *вершы спадзявання*. Памятаеш, я іх паклала на музыку яшчэ ў тыя, нашыя часы, але спявала рэдка. Яны патрабуюць асаблівай атмасферы, душэўнай і трагічнай адначасова.

А тут нешта склалася і пайшло само сабой.

І тут яна гаворыць, між іншым: "Дзякуй, я добра ведала аўтара гэтых вершаў".

Гаворыць па-беларуску і зусім без акцэнту. Хіба што з вымаўленнем крыху старасвецкім і таксама пастаўлена-акторскім.

І далей прапануе пажыць у яе. Год ці два, альбо нават тры, як атрымаецца.

* * *

Так я засталася ў фраў Марты.

Яна нарадзілася ў Менску і маленькай дзяўчынкай сядзела ў Купалы на каленях. Купала і Колас прыходзілі ў госці да яе бацькі. Той быў лекарам і кансультаваў палову адукаванага Менска.

Гэта ўсё, што я пакуль пра яе ведаю.

Хаця расказвала яна шмат, асабліва на пачатку. Але пераважна пра тэатры. Берлінскія і не толькі. Многа гаварыла пра Вільню, пра тамтэйшы тэатр, перадваенны. Пра паэтаў і актораў, якіх ведала і з якімі сябравала.

Я, праўда, не зусім разумею, як можна было быць адначасова ў Менску і Вільні. Сябраваць з К. і з М.

Калі я спрабую ўдакладніць штосьці, пытаюся, што яна там рабіла і як туды патрапіла, яна проста ўсміхаецца і працягвае расповед.

Часам мне здаецца, што яна пачне загаворвацца і расказваць пра сваіх даўніх сяброў Скарыну і Сямёна

Полацкага. Альбо пра Багушэвіча і Кіркора. Пра тое, як яна фліртавала з панам Адамам у Пецярбургу і як ён дапамог ёй у Парыжы.

* * *

Час тут цячэ зусім па-іншаму, не так, як звонку. Здаецца, што можа быць іншага, звычайны дамочак на ўскраіне Берліна.

Хаця ўскраіна тут — панятак вельмі ўмоўны. Сам Берлін злеплены з ускраінаў, кожная з якіх калісьці хацела быць, і была, цэнтрам.

Тут сняцца "калекцыйныя сны". Я іх так для сябе назвала.

Гэта як калекцыйныя віны. Не проста глыбокія і не проста невыпадковыя. Як быццам бы хтосьці, не ведаю хто, залазіць у свядомасць, дбайна і адказна вывучае біяграфію, падбірае сюжэты.

У маім выпадку ўжо смела можна складаць анталогію. Табе б яна спадабалася.

* * *

Аднойчы мне прыйшло запрашэнне на дзіўную сустрэчу.

Па пошце. У капэрце з вензелямі, на гербавай паперы.

Такой паперы я не бачыла ніколі ў сваім жыцці: шурпата-неахайная, як быццам з васямнаццатага стагоддзя.

Маёнтак быў на другім баку возера, стары, чымсьці падобны да паперы з запрашэння. Унутры ўсё было проста, хаця рэчы, відавочна, былі старасвецкія.

Дзверы адчыніў сівы хударлявы мужчына год шасцідзесяці, запрасіў у гасцёўню. Там сядзела некалькі чалавек.

Сапега, сказаў адзін з іх, працягваючы руку для знаёмства. Князь Чартарыйскі. Ежы Радзівіл.

Першая мая думка была пра клуб вар’ятаў, у які я нарэшце патрапіла.

Мы памятаем вашую прабабку, цудоўная была жанчына, сказаў Чартарыйскі.

Напэўна, я ўсё ж такі змянілася ў твары, таму што ён адразу дадаў: “Не, вы не падумайце. Я не вар’ят. І гэта не жартачкі. Мой прадзед пакінуў дзённікі. У сямейным архіве. У Швайцарыі”.

Сапега падышоў да раяля і прайграў фрагмент з маёй п’есы. Сказаў, што тут просіцца штосьці іншае. Пачаў працягваць тэму, імправізаваць. Было лёгка і цудоўна.

Але тут я ўсё сапсавала. Калі можна так сказаць.

Мне падалося, што ў рэальнасці так не бывае. Што гэта ўсё мне сніцца і што варта ўшчыкнуць сябе — і я прачнуся.

Урэшце я гэта зрабіла, проста сярод размовы. Паднялася, прабачылася перад шаноўнымі гаспадарамі і нахабна ўшчыкнула сябе за сцягно.

І сапраўды прачнулася.

* * *

Ёсць яшчэ адзін сон. Які, у адрозненне ад усіх астатніх, паўтараецца. Ён сніцца мне рэдка, і я яго звычайна не памятаю.

Нейкія ўрыўкі. Пасля абуджэння.

Так бывае, прачынаешся адразу ў рэальнасць, а потым раптоўна нешта праяўляецца, выплывае з ніадкуль, як далёкі ўспамін.

Нёман, недзе калі твайго мястэчка, я хачу перайсці на той бераг, да цябе. І не магу знайсці кладку. Спрабую ў розных месцах, заходжу па калена і разумею, што далей глыбіня.

Я нават бачу тваю хатку. Аднекуль ведаю, што гэта менавіта яна. Я не была там ніводнага разу і не ўяўляю, як яна выглядае. Але пры гэтым там, у сне, я ведаю, што мы жывем разам, што гэта і мая хатка.

Ведаю, што ты там, і мяне чакаеш.

Мы шмат пра што не дагаварылі.

І шмат што праявілася толькі цяпер. Наўздагон.

* * *

Яна адышла ад вакна, спусцілася ўніз на кухню.

Перабрала посуд, памыла кубачкі.

Трэба было збірацца ў горад. Заехаць у тэатр, паблукаць па парку, пасядзець у кавярні. Але штосьці было не так у сённяшняй раніцы. І яна вырашыла затрымацца.

Згатавала яшчэ кавы. Вярнулася назад, у пакойчык, зноў дастала паперы, расклала на стале. І працягнула чытанне.

3.

Як міла мы тады цалаваліся! У нашую першую сустрэчу. Цяпер гэта не выглядае ўжо так смела і непрыстойна. Але тады, пасля дзвюх-трох гадзін размовы, знайсці сябе ў ленінскім пакоі гістфакаўскага інтэрната, п’яной і шчаслівай, у абдымках з амаль незнаёмым маладым хлопцам, імя якога раз-пораз забываецца сярод выпарэнняў крымскай мадэры, гэта было як праваліцца ў прадонне.

Са мной такое здарылася ўпершыню. Не тое каб я была ўжо занадта абачлівая, наадварот. Хацелася, каб прадонні былі сапраўды глыбокімі — толькі ў гэтым выпадку мела сэнс у іх правальвацца.

Штосьці адбылося тады з намі ўсімі. Штосьці асаблівае. І нечаканае. Як быццам сярод цёмных катакомбаў эпохі, у якой мы ўсе былі замураваныя, адчыніліся дзверы. Старыя, іржавыя, на месцы, дзе яшчэ хвіліну таму быў бетонны мур.

Праўду кажучы, я была гатовая на большае.

Я тады адчула *выйсце*, для ўсіх разам і для кожнага паасобку.

* * *

Памятаеш сваю гісторыю пра Вялікага Павука?

Мы стаялі ў Хвілінцы, утрох, праз некалькі дзён пасля інтэрната.

Ты нас сустрэў на ўваходзе, папярэдзіў, каб не пужаліся, і правёў праз доўгую-доўгую чаргу. У самы канец піцэрыі, да барнай стойкі. Самога бармэна яшчэ не было, да пачатку работы заставалася хвілін пятнаццаць.

Ты сказаў, што жыццё — гэта месца, куды мы прыходзім папіць кавы. І не паспяваем агледзецца, як выпаўзае Вялікі Павук і пачынае плесці сваё павуцінне. Аплятаць не столькі цела, колькі свядомасць, нашыя думкі і памкненні.

Мы змагаемся, шукаем выйсця, ірвемся на свабоду. Пакуль не становіцца зразумела, што гэта аніякі і не павук. А сам свет бярэ нас у палон, захоплівае і захапляе.

Ты распавядаў пра клешы і пра гуны, усё было складана, Багдан крыху засумаваў, я таксама, хаця не падала выгляду, нават штосьці ўдакладняла. Але потым…

Я стаяла між вамі, на нас пачалі аглядацца, ты перайшоў амаль на шэпт і далікатна паклаў рукі нам на плечы.

Я, па шчырасці, мала разумела, пра што насамрэч ты гаворыш. Пасля таго, што паміж намі адбылося ў інтэрнаце, твой шэпт уводзіў мяне ў медытацыю асаблівага кшталту.

Мне нават няёмка прыгадваць, пра што я тады думала.

* * *

Гэта была неверагодная восень. Мы сустракаліся амаль штодня. Утрох. Я прапусціла больш заняткаў, чым за ўсе папярэднія гады.

Бацькі хваляваліся й ушчувалі, ім пазванілі з дэканата і паведамілі, што яшчэ адзін месяц лайдацтва — і мая кар'ера скончыцца, нават не пачаўшыся…

А мы тады зусім не лайдачылі. Мы проста былі самадастатковыя. Незалежныя ад часу. Былі космасам, замкнёным і дасканалым.

Цяпер я разумею, што гэта з-за маладосці. Яна п'яніла значна мацней, чым мадэра ў інтэрнаце.

Адкрытая будучыня, якая свеціцца на твары, як ліхтар. Магчымасці. Сцежкі.

* * *

Ад мяне чакалі выбару, а я не хацела выбіраць. Гэта складана растлумачыць. Мы ніколі пра гэта не казалі, але я ўсё бачыла і разумела.

Мы былі блізкія, максімальна блізкія. Адно да аднаго. У той месяц. Было соладка і прыгожа блукаць па менскіх завулках, сядзець у кавярнях. Адчуваць вашыя погляды. Дрыжанне голасу, выпадковыя і невыпадковыя датыкненні. Словы, паўзы, густое маўчанне.

Пяшчотная, прыўкрасная няпэўнасць. Якую немагчыма было доўжыць вечна, бо нічога вечнага не бывае.

Трэба было на штосьці наважыцца. Ісці далей.

Прызнаюся, я тады думала пра вар'яцкія рэчы. Забыцца на ўсё, заплюшчыць вочы, спаліць масты. Дазволіць сабе каханне. Утрох.

* * *

Гэта адчувалася вельмі моцна. Вісела ў паветры.

Вы спрачаліся. Вы ўвесь час спрачаліся. Напачатку ціха і разважліва, але потым раз за разам з мацнейшымі эмоцыямі, падвышаючы стаўкі.

І ўжо напружанасць пачынала завісаць у паветры, густая, падслепаватая, без аніякага выйсця.

А потым я стамілася. Лавіраваць між вамі двума. Здымаць напругу. Не даводзіць да канца некаторыя рэчы. Недагаворваць і недадумваць.

Зразумела, што давядзецца ўсё мяняць. Хаця ведала, усялякі выбар руйнуе сітуацыю. І не факт, што мы застанемся сябрамі.

Я тады чакала, хто першы прапануе разысціся. Узяць паўзу. Пачаць сустракацца ўдваіх, паасобку.

Але не думала, што гэта будзеш ты.

* * *

Ты пазваніў у апошні момант і сказаў, што захварэў, каб сустракаліся без цябе.

Я прапанавала адкласці, але ты запратэставаў, досыць рашуча, — і сапраўды, да сустрэчы заставалася пару гадзінаў, мы не паспявалі папярэдзіць Багдана.

Ён здзівіўся. Нават разгубіўся на момант. Потым пачаў гарэзіць і заляцацца. Быў вельмі мілы. Зусім па-іншаму, чым калі мы былі ўтрох. Неяк па-дзіцячы няўпэўнена. Раз-пораз прыгадваў цябе, як быццам хацеў чамусьці запярэчыць, — але цябе не было, і пярэчанне завісала ў паветры.

Мы падышлі надзвычай блізка адно да аднаго, у тую сустрэчу. Але далей не пайшлі. Потым, праз шмат год, ён прызнаўся, што менавіта тады адчуў: сяброўства для яго больш каштоўнае.

Сяброўская блізкасць, ясная ад пачатку. Калі не трэба гуляць у гульні. Можна проста быць сабой, не думаючы пра наступствы.

Ён зразумеў гэта і адразу неяк супакоіўся, пацяплеў. Вярнуўся да самога сябе. Стаў тым Багданам, якога мы ўбачылі ў інтэрнаце: вартым, надзейным, тым, хто трымае сцяг.

* * *

Вядома, я паехала цябе праведаць. І ясна, ты быў аніякі не хворы. Проста вырашыў разарваць заганнае кола, вызваліць — сябе і ўсіх нас.

Мы размаўлялі пяць гадзінаў запар, з перапынкамі на каву і супчык. Гэта аказалася неверагодная раскоша, размаўляць сам-насам. І я падумала, што распасціся ў асобнасць — гэта таксама працяг, адкрывае зусім новыя краявіды.

А потым надышоў вечар, у цябе была бутэлька каньяку, і я засталася.

* * *

Мне тады падалося, што было больш пяшчоты, чым жарсці. Для першага разу. Як быццам старыя добрыя сябры дазволілі сабе больш, чым звычайна.

Цяпер я разумею, што магла застацца назаўсёды. І была б шчаслівая. Па-свойму. Па-іншаму, не так, як цяпер.

Але ты сказаў, што гэтая гісторыя з намі ўжо адбылася, мы яе аднойчы пражылі. У другіх жыццях. І цяпер на коне стаіць іншае. І большае.

Трэба шукаць сваю каравэлу. Ісці наперад, за небакрай.

Паабяцаў, што я буду з табой заўсёды, формай душы, а можа, нават і яе сутнасцю. Мы былі зусім п’яныя, і чамусьці хацелася апельсінаў.

Я тады амаль пакрыўдзілася, думаючы, што ты мяне адштурхоўваеш. Потым зразумела. Не адразу.

* * *

Я была закаханая, Францішак, ты пра гэта ведаў. У абодвух. І ў цябе, і ў Багдана.

І ў тое, што адбылося між намі ў інтэрнаце.

Можа, я й цяпер закаханая, але гэта ўжо зусім іншае пачуццё. Дваццацігадовай вытрымкі, яго вымаюць вельмі рэдка і дазваляюць крыху ап’янення ў асабліва важныя моманты жыцця.

Што з намі тады здарылася, у гэтым няшчасным пакойчыку? Як гэта назваць? Прарыў на вышыні? Выпадковы катарсіс? Сустрэча з конам?

Часам мне здаецца, што рэшта нашых жыццяў — гэта толькі постскрыптум да таго спаткання.

* * *

Самым складаным было пераадолець інстынкт уласніка. Жаданне затрымаць імгненне. Зразумець, што жыццё працягваецца. І ўжо падрыхтаваныя наступныя серыі: людзі, краіны, сны.

Я атрымала дыплом і, нечакана для ўсіх, адмовілася ад кар’еры. Потым гэта стала легендай: казалі, што мяне чакала слава, грошы і месца ў Оперным. А я з’е-

хала ў мястэчка С., у музычную школу, выкладаць беларускі фальклор.

Усё было не так. Больш проста, але і больш складана.

Перш за ўсё я стамілася. Дзевяць год вучобы — гэта занадта.

Да таго ж я не была самай лепшай. Самай працавітай. І месца ў Оперным мяне зусім не чакала. Хіба што ў хоры.

Не, я зусім не расчаравалася. Мне хацелася застацца ў музыцы, але па-іншаму. Хацелася рабіць іншыя рэчы. Думаць, чытаць. Заняцца кампазіцыяй.

Я не ведаю, колькі прыйшлося зрабіць бацькам, колькі знаёмых і знаёмых знаёмых абзваніць, пакуль яны знайшлі для мяне сціплую пасаду *выкладчыка ўсяго*. У мястэчку С., у музычнай школе.

* * *

Памятаеш, калісьці даўно, на гістарычным клубе ў Багдана я праспявала песню пра *ясну панну*, якая выходзіць да свайго рыцара. Страшна прыгожую і не маю. Яе ўсе тады спявалі. Там былі радочкі, якія закранулі мяне асабліва. Пра нашыя маёнткі ў пушчах, якія засталіся і якія ўсіх нас чакаюць.

Тады яшчэ выскачыла нейкая цёця і пачала гістэрычна крычаць, што яны хочуць вярнуць сабе маёнткі, а як жа народ, пра яго трэба думаць.

Я разгубілася і прамаўчала. Праспявала наступную, пра вядзьмарку.

А пасля выйшаў ты і адказаў цёці па поўнай праграме. Спакойна і ў той жа час жорстка, па сутнасці.

Тут ёсць адна дадатковая асаблівасць, сказаў ты тады. Якая ўсё мяняе. Трэба браць пад увагу, што гэтыя радочкі напісаў беспрытульны паэт. А калі такое піша паэт, дык яны маюць зусім іншы сэнс, чым калі б іх прамовіў старшыня калгаса, дырэктар банка альбо нават нашчадак старажытнага магнацкага роду.

Гутарка ідзе не пра прыватную маёмасць.

А пра тое, каб пэўныя месцы сталіся важнымі для духу.

Таму, калі мы сёння гаворым пра маёнткі і фальваркі сярод пушчы, дык перадусім як пра месцы, дзе дух мае радзіму.

Трэба вярнуць іх ім самім. Вярнуць іх уласнай традыцыі.

* * *

Калі я патрапіла ў мястэчка, я была перакананая, што далучуся да гэтай традыцыі.

Там, у местачковым палоне, было многа цішыні. Мне гэта падабалася, але і палохала. Тыдні і месяцы пацяклі скрозь пальцы, як вада, хутка і незаўважна. Казка расказалася, і ўсё стала па-даросламу. Сур'ёзна — і неяк крохка.

Я не пратрымалася й года. Хаця побач былі дзеткі, з якімі забываеш пра час. Сябры на адлегласці гадзіны электрычкі. Бацькі, для якіх я цяпер стала дарагой госцяй.

А яшчэ ўнутры, як немаўлятка, жыла мая музыка, і трэба было яе вынасіць, дачакацца.

І ўсё ж я з'ехала. Не змагла глядзець ім у вочы. Мне здавалася, што я зноў іх у чымсьці падманваю, як гэта рабілі мае продкі.

Цяпер я разумею, што спрабавала падмануць не іх, а сябе. Само жыццё, якому хацелася буяць ды ісці наперад, каласіць і разліваца.

Жыццё, якое мусіла быць пражыта.

* * *

Першая песня, якую я склала, была несур'ёзнай, для дзіцячага ранішніка. Мы павесяліліся на славу разам з дзеткамі.

Але гэта быў толькі пачатак. За першай адразу пайшлі другая і трэцяя, зусім не дзіцячыя. Я проста мусіла гэтым падзяліцца, пабегла на электрычку і, ужо пад'язджаючы да Менска, зразумела, што час цішыні скончаны.

Штосьці ўва мне патрабавала тады іншых абставінаў. Падзеяў, сцэны, новых сяброў і знаёмых.

Я зразумела твае словы пра ветразь і небакрай.

Вярнулася ў Менск. І села на сваю каравэлу.

* * *

І самае галоўнае — усё пачало ламацца, як быццам рэальнасць скранулася са свайго месца і паплыла. Сядзець унутры сябе далей было немагчыма.

Прыйшоў час карнавалаў. Радасць была паўсюль.

Старая эпоха была выстаўлена на распродаж.

Жыццё відавочна брала другі старт, мы былі перапоўненыя будучыняй як чыстай магчымасцю.

На нашых вачох нараджаліся новыя формы, крохкія і далікатныя. Кожная рэч, што паўставала, нібы гаварыла: прабачце, я магла быць іншай.

Мяне вынесла навонкі. Я стала вядомай.

Ёсць у гэтым пэўны наркотык. Калі ты выходзіш на сцэну і адчуваеш, як перад табой хвалюецца акіян. Чалавечых душаў. Альбо возера, ці нават маленькі ставок, не так істотна.

Галоўнае, што кожная нота, кожная інтанацыя — адгукаецца. І ты можаш рабіць цуды.

***

Дзе я толькі тады ні спявала! Конкурсы і фестывалі, дамы культуры і злёты палітактываў, кавярні і сціплыя вогнішчы сярод лесу. Усё гэта вабіла, спакушала, мусіла быць пражыта.

А нашыя вечаровыя сустрэчы на ганку, ля дома Ваньковічаў!

Раскладаўся абрус, кроіліся хлеб, сыр і цыбуля, выстаўлялася пітво, і ў свядомасці пачыналі граць жалейкі і скрыпачкі.

Далучаліся ўсе: сябры, прыяцелі, выпадковыя мінакі. Журналісты з бліжэйшай рэдакцыі. Студэнты кансерваторыі з валторнамі і кантрабасамі. Паэты і празаікі. Проста добрыя людзі.

Кожны з іх прыносіў свой настрой, сваю музыку.

Потым, у сутонні, пачыналі падцягвацца й духі месца. Цені і цені ценяў, апярэзаныя восеньскай павутай. Яны стаялі на варце, адганялі міліцэйскія патрулі. Усіх тых, хто быў недарэчы, хто мог бы парушыць святочную атмасферу.

Урэшце і самі далучаліся да карнавалу, пад раніцу, недзе каля чацвёртай гадзіны. Калі адчыняліся дзюры ў часе.

Для мяне гэта было больш чым проста багема.

Па гэтых вулках хадзіла мая прабабка.

* * *

А потым усё асцярожна здзьмулася.

Цяпер я ведаю, як прамінаюць эпохі: ціха здзьмуваюцца, нібы паветраны шарык пасля свята.

І тут адбылося менавіта так. Павольна і падступна. Яшчэ ўчора поўніца, а сёння ўжо чагосьці не стае. Напачатку гэта ўспрымаецца як паўза, перапынак. Здаецца, усё неўзабаве вернецца.

Але не вяртаецца. Месяц, другі, трэці.

Пакуль не становіцца ясна: час незваротны.

* * *

Ты даслаў ліст. Пра тое, што ў свеце стала зусім пуста. І бессэнсоўна.

Я прыехала да цябе. Ты быў далёкі і халодны. Прадаваў хатку ў Крыжоўцы, шукаючы іншае месца і зусім іншую дыстанцыю да эпохі.

Я, па шчырасці, пералякалася. Сказала, што ад мяне ўсё адно не схаваешся, можаш нават і не спрабаваць. І адразу зразумела, як недарэчна гэта гучыць.

Мы рагаталі амаль гадзіну. Зноў пачалі цалавацца.

Гэтым разам усё было інакш. Тонка і жарсна, як быццам перад канцом свету.

* * *

Мне здавалася, што я ўжо ведаю пра цябе і сябе ўсё ці амаль усё, а тут аказалася, што нашая гісторыя толькі пачынаецца. Што мы сярод прэлюдыі, першага акта.

Усё стала няпростым. На пачатку, калі мы знаёміліся, гэтыя маскі — паэт, спявачка — здаваліся мі-

лай гульнёй, якую заўсёды можна спыніць. Альбо перагуляць.

А тут стала ясна, што ўсё гэта сур'ёзна.

Ты распаліў вогнішча, адкаркаваў віно, выцягнуў на паветра стол і фатэлі.

Мы ўголас чыталі Рыльке, і даосаў, і позні Малер, канешне, быў прыўкрасны ў выкананні пабітай пераездамі і беларускай доляй *Мелодыі-103б стэрэа*.

* * *

Ты сказаў, што прыйшла новая эпоха. І цяпер трэба навучыцца гаварыць у цішыні. Сутнасна. Без сведкаў.

Запытаўся, чаму я так і не праспявала твае вершы. Тады я дакладна ведала адказ: каб спяваць, патрэбная ясная эмоцыя, якую можна пракрычаць уголас. Узмацніць яе яшчэ больш. Эмоцыя, якую можна перадаць людзям.

А ўсё, што ты пішаш, трэба прамаўляць трагічным шэптам у цішыні старога саду, без гледачоў.

Я паабяцала, што калісьці абавязкова патраплю ў тваю прастору. У тваю эмоцыю. І не проста патраплю. А ўляпаюся па самыя вушы. Буду спяваць, як быццам я і ёсць гэты стары сад і ў той жа час песня, музыка.

І вось я патрапіла. У стары сад з домам і возерам.

Я тут жыву, блукаю па ягоных сцежках.

І мне зусім не хочацца выходзіць навонкі.

* * *

Быць свабодным: жыць і думаць унутры дазволеных формаў эпохі. Перамяшчацца, мяняць маскі.

Гэта магчыма. Калі сама эпоха стомленая ад самой сябе. Калі цвікі, якімі мы прыбітыя да рэальнасці, іржавыя, ломкія.

Можна ісці ўбок, перпендыкулярна. Ці паралельна. Гэта таксама свабода, хаця й іншага кшталту.

А яшчэ кожны мае права на вар'яцтва і на цішыню ўнутры.

На адасобленасць як форму аскезы і ачысткі.

Магчыма, надыдуць часы, калі ўсё будзе распадацца. І мы будзем абагаўляць простыя і цёплыя формы чалавечага свету.

Але не сёння. Не цяпер.

* * *

Ты застаўся за фіранкай.

Не пагадзіўся на занадта простае.

Мяне ж, наадварот, скарысталі напоўніцу. Утылізавалі так, што прыйшлося збегчы. Выпасці ў нікуды.

* * *

Было адчуванне адчаю. І бязлітаснасці.

Як быццам я ўжо тады разумела, што ўсё завяршаецца, і абрывала апошнія нітачкі.

Перад самым ад'ездам я сустрэла Багдана. На праспекце.

Тады я была вычарпаная, спявала, як музычны аўтамат. Амаль заўсёды на замову, у гучную пустату натоўпу. Не магла сустрэцца сама з сабой тыднямі, а часам і месяцамі.

Аднойчы выйшла прагуляцца. У надвячорак.

Мы сутыкнуліся твар у твар на рагу Энгельса і праспекта, усміхнуліся без усмешак, памахалі рукамі і пайшлі далей. І я, і ён, відавочна, былі настроены на самоту. Потым спыніліся. Зразумелі, што не бачыліся некалькі год. І што нельга, пасля ўсяго, проста памахаць рукамі і пайсці далей.

Павярнуліся, амаль аднначасова. Абняліся, зайшлі ў кавярню. На тое самае месца. Там было штосьці італьянскае, здаецца, *Пацыя-піца*.

Ён выглядаў сумным і нешчаслівым. Ды й я была не нашмат лепшая. Але потым пачалі прыгадваць інтэрнат, нашыя сустрэчы, блуканні. І ўрэшце развесяліліся.

Ён прызнаўся, што праходзіў аднойчы паўз нас на Ваньковічах. Запаволіўся, чакаў, што яго паклічуць. Але самому падысці было няёмка. Быў нейкі прыём у амбасадзе непадалёк, яны абмяркоўвалі планы і праекты.

Пад канец мы напіліся. Чакалі, што адчыняцца дзверы і зойдзеш ты. Як заўсёды, важна, весела, з ніадкуль.

Раскажаш, куды мы патрапілі і як адсюль выбірацца.

* * *

Тут, на адлегласці, я нарэшце зразумела Менск, у яго прасторавых і часавых несупадзеннях. Адчула ягонае сэрца.

Як ён разгортваецца і мяняецца. За тысячу год.

Вось ён зусім невялікі, прытуліўся вакол замчышча, на сутыкненні рэчак.

Вось ён аздоблены касцёламі і камяніцамі, караскаецца ўверх, на гару, каб *далёка бачыць*. Ратуша на

пляцы, кляштары, кірмашы, шляхецкія соймікі. Студэнты мясцовага калегіума няспешна шпацыруюць, абмяркоўваючы Томаша з Аквіна ды Францішка Суарэса.

Вось ён зусім іншы. Імкнецца ў сучаснасць. Ліхтары на вуліцах, тэлефон, электрастанцыя, гарадскі тэатр.

Вайна, хаос, гарадская брахалка, па якой ходзіць Мікіта Зносак з Герам Спічыні. Потым рэвалюцыя, чатыры мовы на шыльдах і танцы на вогнішчах. Прымерваецца да ролі сталіцы, асцярожна вырастае, увышыню і ўшыркі.

Потым — яшчэ раз вайна, руіны, павольнае загойванне ранаў.

І нарэшце — той Мінск, у якім мы нарадзіліся.

Спакойны, упэўнены, горад фізікаў і інжынераў.

Тры пляцы. Доўгі менскі праспект.

Камароўка і Зялёны Луг. Уручча і Чыжоўка. Шабаны і Захад. Усё гэта адсюль, з Берліна, гучыць як далёкая казка.

* * *

Гэта мой горад. Насамрэч ён вельмі маленькі і тонкі.

Чысты, дагледжаны і зноў халодны, як у тыя, далёкія часы.

І мы ў яго яшчэ вернемся. У ленінскі пакой на Свярдлова, 34. У той жнівеньскі дзень, калі мы ўсе пазнаёміліся. Альбо ў Хвілінку — гэта не так істотна.

Сагрэем яго, насыцім сэнсамі. Застанемся.

Мілымі ценямі на ягоных вулках.

Абавязкова застанемся.

***

Яна падкрэсліла гэтыя словы тлустай падвойнай лініяй.

Дзіўна, але ў іх не было ані роспачы, ані расчаравання.

Толькі засяроджаная гатоўнасць працягваць падарожжа. Даведацца, нарэшце, пра свае вышыні, як калісьці напісала самотніца Эмілі. Яна прыгадвала сёння яе радкі. Зранку, за кавай. Гледзячы праз вакно на азёрныя хвалі. У якіх адбівалася неба.

***

Перачытала апошнія абзацы.

Было крыху страшна. Напісала рэчы, ад якіх ужо не адмовішся. Маглі яшчэ быць гаючыя спасылкі і падрадковыя заўвагі, але асноўны тэкст скончаны. Усе кропкі пастаўлены, як і шматкроп'і.

Зразумела, што не можа адаслаць ліст па пошце. Яна мусіла перадаць яго асабіста, з рук у рукі, як падарунак.

4.

Калі яна сказала, што *едзе дадому*, фраў Марта заплакала. А потым прынесла з сутарэнняў бутэльку віна і пачала расказваць.

Гісторыя была прыгожая сумнай і жахлівай прыгажосцю, як і сама эпоха.

Яна нарадзілася напярэдадні першай вайны. У Менску.

Тады яе звалі Эма Малковіч, і ў яе крыві былі перамяшаныя ўсе тутэйшыя нацыі.

У бацьку цякла габрэйская, у маці — беларуска-польская з каліўцам татарскай. Яна пайшла ў маці: бландзінка з блакітнымі вачыма і высокай ладнай паставай.

Бацька быў з заможнай габрэйскай сям'і, з камянічкай у цэнтры, на Захараўскай, і дамком на ўскраіне. У камяніцы была крамка, дзе прадавалі ўсялякую драбязу, а таксама кватэры, якія здавалі багатым сваякам.

З дзяцінства яна ведала, як складаць пацеры, што такое шабэс і чаму ў суботу нічога нельга рабіць.

Чула тры мовы. Потым да іх дадалася чацвёртая. Нямецкая. На яе пераходзілі, калі хацелі сказаць штосьці важнае, не для ўсіх.

* * *

У Берлін ездзілі вучыцца. У кожным пакаленні мусіў быць хтосьці, хто меў прафесію адтуль.

Гэта пачалося здаўна. З самага дзяцінства ёй расказвалі гісторыю: яе прадзед паехаў у Берлін і вярнуўся дадому з жонкай, якая не разумела ні на адной з тутэйшых моў. Гэта была легенда, але сам Берлін быў рэальнасцю.

Бацька таксама паехаў. Вывучыўся на лекара. Работы хапала пры ўсіх уладах, асабліва калі пачалася вайна, а потым рэвалюцыя.

Зрэшты, былі і нязгодныя. З заходнім кірункам. Брат бацькі выбраў Маскву. Пра яго доўга нічога не было чуваць.

Вярнуўся ў дзевятнаццатым, камісарам палка. Прафесію ён так і не атрымаў, але навучыўся лаяцца як шавец і піць гарэлку з матросамі.

Ад яго заўсёды дзіўна пахла. Бацька смяяўся і казаў — Азіяй.

* * *

Камяніцу рэквізавалі на патрэбы гарадской беднаты. Цяпер там жылі члены рэўкама з сем’ямі.

Дамочак застаўся. Потым яна зразумела, што іх выратавалі адлегласці. Дом стаяў не проста на ўскраіне. Ён быў схаваны ў тупічку, далей пачыналіся пагоркі і невялікае балотца.

Большасць сваякоў бацькі выехала ў Палестыну, шукаць новае месца. Сам бацька затрымаўся. Не змог кінуць пацыентаў, тлумачыў ён, але гэта было не да канца праўдай.

Сваякі маці засталіся на тым баку мяжы. Маці гадавала дзяцей і трымала гаспадарку. Яе гародзік і запасы ўсіх выратавалі, калі ўсё, што можна было прадаць з мінулай эпохі, было прададзена.

А яшчэ сад, вялікі, які разросся. У дзяцінстве ён быў для яе сусветам, у якім можна было жыць, блукаць, хавацца. І бібліятэка бацькі. З кнігамі на розных мовах.

* * *

Ад самага дзяцінства яна марыла стаць акторкай, працаваць у тэатры. Але паступіла на лекарскі. Гэта не было прымусам, яна сама так вырашыла. Важна было працягваць сямейную справу, дапамагаць бацьку.

Затое вольны час карыстала напоўніцу. Грала ў студэнцкім гуртку, хадзіла ў студыю народнага танца, знаёмілася з акторамі і літаратарамі.

Адзін з іх нават прапанаваў ёй руку і сэрца. Ён ёй таксама падабаўся, яна сур'ёзна думала, каб пагадзіцца.

Але жыццё зрабіла ёй іншую прапанову. Якую не было магчымасці адхіліць.

* * *

Бацьку забралі як польскага шпіёна. Яны былі ўпэўненыя, што гэта памылка. Бацьку ведалі ў горадзе, любілі і цанілі, да таго ж добрыя лекары патрэбныя ўсім, ён сам так казаў і быў заўсёды спакойны.

Спачатку забралі брата, за нейкі *ўклон*. Што гэта такое, яны так і не зразумелі, хаця ім тлумачылі, і не адзін раз.

Потым, калі нарэшце зразумелі, стала яшчэ горш.

Пасля прысуду маці зацялася. А потым патухла, як быццам жыццё скончылася.

Яна была ўпэўненая, што мусілі забраць яе, бо менавіта яна чытала польскімі літарамі і хадзіла ў касцёл.

За маці таксама прыйшлі.

* * *

Яна засталася з бабуляй і дзвюма сястрычкамі. Трэба было думаць, што рабіць далей. Як выжываць. Цяпер яна, адказная за ўсіх, мусіла шукаць варыянты.

Знайшла кватарантаў, здала два пакойчыкі ў доме. Уладкавалася ў шпіталь санітаркай. Вучобу кінула, і не толькі таму, што не было часу.

Галоўнае цяпер навучыцца быць непрыкметнай. Такой, як усе. А на лекарскім яе ведалі, ведалі бацьку і ведалі, што адбылося.

Кінула таксама тэатральны гурток. Больш не было патрэбы ў адмысловай сцэне. Страшны тэатр быў паўсюль, спектакль ішоў дзень і ноч, бесперапынна.

Запісалася на курсы варашылаўскіх стралкоў. Была там самай лепшай.

* * *

Калі да яе падышлі двое, у цывільным, з пазнавальнымі тварамі, яна была спакойная. Ліхаманкава пралічвала, хто мог напісаць данос і з якімі наступствамі.

Яна не верыла нікому. Ведала, што прыйшла яе чарга і трэба адыграць ролю годна і прыгожа.

Яе пасадзілі ў машыну і завезлі на ўскраіну горада.

Па дарозе падбірала лінію абароны.

Напачатку хацела сыграць *ціхую*. Потым падумала пра альтэрнатыву. Гістэрыку ці эпілепсію. Альбо нават вар'яцтва.

Яе завялі ў кабінет і папрасілі напісаць аўтабіяграфію. Максімальна падрабязна. З усімі сваякамі і знаёмымі. З успамінамі дзяцінства, сямейнымі гісторыямі. Апісаць, што стаяла ў пакойчыках, што расказваў бацька пра Берлін, як выглядала хатка звонку.

У арышт усё гэта ніяк не складалася.

* * *

Яе сапраўды заўважылі. Чатыры мовы, тэатр. Але прапанова была іншая. Школа выведкі.

Яна не адразу паверыла. А потым падумала пра сястрычак. І бабулю. Яны былі ідэальнымі закладнікамі. І ў іх цяпер былі ўсе шанцы выжыць і памерці спакойна, сярод сваіх. Сваёй смерцю.

Урэшце пагадзілася. Павагалася крыху, папрасіла час на роздум, але ўнутры ўжо ўсё вырашыла.

Паставіла толькі адну ўмову. Каб можна было клапаціцца пра сям'ю. Яе запэўнілі, што з гэтым праблемы не будзе, сваякамі займаецца асобная служба, забеспячэнне па вышэйшым разрадзе.

Бабуля і сястрычкі сапраўды выжылі ў тое лета. І памерлі сярод сваіх. Ад голаду. У Менскім гета, у 1943.

* * *

Іх вучылі вельмі старанна. Не шкадуючы часу. Карыстацца зброяй. Забіваць. Але толькі як дадатак. Асноўнай работай было іншае. Супадаць з асяроддзем. Слухаць. Выклікаць давер. Мяняць маскі.

Напачатку Берлін. Сціплая пасада сакратаркі ў амбасадзе. Яна прыглядалася, шліфавала акцэнт і манеры. Вучылася не выдзяляцца, быць як усе. Потым Варшава, з такой жа місіяй. Раз-пораз яе выпускалі з дробнымі даручэннямі. Потым Кракаў, паўгода заняткаў у прыватнай акторскай студыі. І адтуль ужо Вільня. Барбара Кавальска, маладая акторка з Крэсаў. У пошуках працы.

На месцы яна зразумела, якія крэтыны рыхтавалі ёй легенду. Жыць у Вільні з імём Басі Кавальскай — гэта тое самае, што хадзіць па Дубліне з пашпартам Джона Сміта, сказаў ёй стары караім з Антокаля, які рабіў фальшывыя дакументы для ўсіх і пры ўсіх уладах. І на ўсялякі выпадак выдаў ёй дадатковыя паперы — на імя Ядвігі Граматовіч з-пад Ліды.

Яна ўпершыню адчула свабоду, дазволіла сабе крыху супасці з новым жыццём.

Іх, зрэшты, у яе было ўжо тры.

Яна магла ў любы момант прыдумаць чацвёртае, знікнуць і нарадзіцца наноў — напрыклад, у Аргентыне альбо ў Бостане. Яна цяпер гэта ўмела.

Але ў Менску заставалася бабуля і дзве маленькія сястрычкі, і раз-пораз ёй пра гэта нагадвалі.

* * *

Ролі ў мясцовым тэатры былі толькі другога плана, а сам тэатр — пасля Берліна і Кракава — больш нагадваў драматычны гурток з жарсцямі, чым храм мастацтва.

Усё было па-свойску, па-тутэйшаму, амаль як у Менску. Усё тая ж гамана на вуліцах.

Толькі вуліцы былі іншыя. Вузкія і крывыя, яны, здавалася, вялі ў іншы час, а можа, і ў іншую рэальнасць.

Яна закахалася ў гэты горад. Многа чытала. Запісалася ва ўніверсітэт. Гэта было важна, там можна было знаёміцца, і сябраваць, і слухаць.

У тэатры ёй прыйшлося *недагульваць*. Нельга было звяртаць на сябе ўвагу. Быць геніяльнай, нават таленавітай.

Хаця часам хацелася паказаць усё, на што здатная.

Але іншым разам.

* * *

Прадчуванне вайны было паўсюль. Разліта ў паветры. Самыя неразумныя радаваліся. Афіцыйная прапаганда расказвала пра зухаватых уланаў, якія скачуць на конях да самага Берліна, праганяючы ворагаў.

Насамрэч было шкада. І ўланаў, і коней.

Яна ведала: з усіх бакоў мяжы стаяць жалезныя *чолгі*. Хіжыя, бязлітасныя, гатовыя разадраць на часткі.

Было ясна, што гэтая правінцыйная ідылія хутка скончыцца.

І яна скончылася. Уланы ўцяклі ў Румынію, разам з коньмі і залатым запасам. Тыя, хто ім паверыў, адстрэльваліся ў дотах і камяніцах. Да канца.

* * *

Калі ў горад увайшлі літоўскія войскі, яна нават не паклапацілася пра новыя дакументы. Згубіла пільнасць, бо было ясна, што *Вільнюс мусу, Літва русу*, як пісалі ў ковенскіх газетах. Гэта было справай месяцаў, а можа і тыдняў.

Зрэшты, усё адбылося *добраахвотна*. І тыя, хто быў не згодны альбо проста не паспеў уцячы, цяпер

сядзелі ў Лукішках. Ці ўжо ехалі ў Сібір у шчыльна набітых вагонах. Да свайго здзіўлення, яна таксама была затрыманая і адпраўленая ў камеру як класава чужы элемент.

Яна правільна ўсё зразумела. Менавіта там, у камеры, адбыліся яе самыя важныя знаёмствы.

Яны спатрэбіліся, калі прыйшлі немцы, пачаўся хаос, і яна засталася адна, без кантактаў. Хадзілі чуткі пра разгром, сотні тысяч у палоне. На дарогах стаялі падбітыя танкі, раскурочаныя і спаленыя машыны.

Месяц яна пражыла ў здранцвенні.

А яшчэ праз месяц яе адшукалі людзі Судаплатава.

* * *

Яна крычала. Пра бабулю і сястрычак. Пра хлусню і закідванне шапкамі. Пра тое, што іх пакінулі ворагу без аніякай дапамогі.

Яе запэўнілі, што сем'і супрацоўнікаў эвакуяваныя, жывуць разам, ні ў чым не маюць патрэбы. Спеццягнік выйшаў з Менска на другі дзень.

Патрабавалася інфармацыя. Многа інфармацыі. Колькасць эшалонаў, нумары частак, прозвішчы і пасады вайскоўцаў.

Пра тэатральную кар'еру можна было забыць.

Яна знайшла працу ў кавярні для афіцэраў. Афіцыянткай. Гэта было ідэальнае месца. Каб чуць і бачыць.

* * *

Паступова пачалі вяртацца знаёмыя. Адчыняліся крамкі, кавярні. Пачалі выходзіць газеты, нават кнігі.

Ёй здавалася, што ўсе гуляюць супраць немцаў. Але ўсё было больш складана. Так, большасць гуляла супраць немцаў, але пры гэтым — усе супраць усіх.

Палякі, бо *ту завшэ была польска*. Літоўцы, бо Міндаўгас, і Гедымінас, і здраднік Ягайла. Беларусы, бо калі ўсе толькі за сябе, адзінае выйсце — схавацца, пераседзець, у лесе ці ў камендатуры, не так важна.

Немцы былі джокерам, той, хто быў здольны выцягнуць яго ў правільны момант, амаль заўсёды браў касу. Быў яшчэ адзін джокер, які пакуль быў у ценю. За ўсім назіраў. Але ўжо было ясна, што раней ці пазней ён вернецца.

Па-за гульнёй былі толькі габрэі. Ім заставаліся равы і ямы.

* * *

Яна больш не магла на гэта глядзець.

Калючы дрот, зоркі на вопратцы. І твары, твары. На іх была пакута, і згода, і заклапочанасць. Самыя адчайныя раз-пораз уцякалі. Але большасць выбірала смерць сярод сваіх. На вулках, намоленых стагоддзямі.

Яна была ўпэўненая, што аніякага спеццягніка не было. Усе тады былі ў паніцы, думалі толькі пра сваё. Бабуля і сястрычкі, хутчэй за ўсё, засталіся. Адзінае спадзяванне было на адлегласці: дамочак быў далёка, на ўскраіне.

За суседнім столікам малады афіцэр расказваў прыяцелям пра падарожжа. Ён толькі вярнуўся з Менска, дзе дапамагаў *канчатковаму вырашэнню*. Скардзіўся, што ніхто не хоча гэтым займацца. Расстрэльныя каманды прыходзіцца везці здалёк, з Коўна альбо нават з Рыгі. Боепрыпасаў трэба ўдвая больш,

страляюць заплюшчыўшы вочы, абы-як. Прыходзіцца хадзіць самому і дастрэльваць. Альбо засыпаць яшчэ жывых. І тады зямля яшчэ суткі варушыцца і стогне.

Яна ледзьве стрымалася, каб не ўсадзіць яму відэлец у шыю адразу.

Дачакалася, пакуль ён выйдзе ў прыбіральню. Там ён і застаўся, з нажом у спіне. Яна нават не праўдзіла, ці ён мёртвы. Павесіла шыльдачку "не турбаваць", вярнулася, разнесла некалькі замоваў, каб не быць першай у спісе.

І знікла.

* * *

Гэта была брудная работа. І месца ў гэтым горадзе для яе ўжо не будзе. Перадала праз сувязнога, што патрэбна эвакуацыя, тэрмінова.

У Менск ехаць было нельга. І праз Менск таксама. Там можна было толькі памерці. Разам з усімі.

Заставаўся адзіны маршрут — далей на поўнач.

Яна ўладкавалася ў шпіталь для афіцэраў. Пад Рыгай. Марта Шварц, з Брэслаў. Бацька немец, маці мясцовая. Так, вучылася ў Берліне. Медыцына. На жаль, не скончыла. Захацела быць акторкай, але пачалася вайна.

Лёгкі берлінскі акцэнт, пастава, манеры лэдзі.

А яшчэ падабенства. Яна была зусім як Лені Рыфеншталь, хіба што больш зграбная. Гэта дапамагала — аніякіх намёкаў і прапановаў.

З Рыгі было блізка да Швецыі.

* * *

У шпіталі яна сустрэла Франца.

Ён быў надзейны і зусім не ваяўнічы.

Прапанаваў руку і сэрца. Паўжартам, і ў той жа час сур'ёзна. Сказаў, што не прэтэндуе на большае, чым сяброўства. Што ў яе будзе асобны пакой і час яшчэ раз падумаць — калі ўсё скончыцца.

Яму было сорак пяць, і да вайны ён вёў сямейны бізнес. У трыццатыя сям'я паспела большасць справаў перавесці ў Швайцарыю. Але не ўсё. Застаўся дамок у Берліне і радавое гняздо ў Баварыі.

У войску працаваў у тылавых службах. Забеспячэнне. Пераважна правіянт. Сам ужо не ездзіў, шукаць станавілася ўсё цяжэй. Знайшоў людзей, арганізаваў сетку. З яго боку грошы і паперы. Усё астатняе рабілі яны: паездкі, дамовы, закупы, нават рэквізіцыі. За невялікі працэнт ад угоды.

Ёй таксама патрэбны былі паперы. Для сябе.

* * *

Яны ўзялі шлюб за тыдзень да таго, як яго расстралялі.

Ягонай сеткай зацікавілася гестапа і адсачыла яе аж да Стакгольма. На тым канцы была брытанская амбасада. Гэта яна дапамагала Францу з правіянтам у абмен на дакументы.

Яго арыштавалі на працы. За ёй прыйшлі дадому.

Лені Рыфеншталь зноў яе выратавала. Следчы ледзьве не падскочыў з крэсла, калі яе прывялі ў кабінет.

Яна была падобная. Дакладная копія.

Так, вучылася ў Берліне. Медыцына. Але не скончыла.

Захацела стаць акторкай. Як Лені.

Усё гэта было праўдай. Ці амаль праўдай.

* * *

Следчы прапанаваў падпісаць сведчанні і дамову пра супрацоўніцтва. Яна зрабіла гэта не чытаючы. Крыху хвалявалася — там магло быць што заўгодна. І ўсё ж падпісала.

Ёй параілі ехаць на радзіму. Далі суправаджальныя дакументы. Яна цягнула час, як магла, але заставацца ў Рызе было небяспечна.

І Стакгольм быў закрыты.

Адзінае месца, якое яна добра ведала, — гэта Берлін. Але там яе маглі памятаць як супрацоўніцу амбасады. Заставалася Баварыя. Альбо нават Швайцарыя, дзе жылі бацькі Франца.

Берлін не падыходзіў яшчэ па адной прычыне. Было ясна, што неўзабаве ўсё скончыцца. Нямеччына прайграла, фронт грымеў бліжэй і бліжэй. І менавіта ў Берліне мусіла быць апошняя бітва.

Яна паехала проста на захад, надалей ад лініі сутыкнення.

На захадзе, зрэшты, была свая лінія, свой фронт. Альянты прарвалі абарону й імкліва наступалі. Урэшце яна патрапіла ў лагер уцекачоў у Рэгензбургу. Запісалася як Ядвіга Граматовіч з-пад Ліды.

Але праз месяц пайшлі чуткі, што ўцекачоў вяртаюць назад. І яна пацягнулася ў Баварыю, шукаць сваякоў Франца.

* * *

Была толькі сястра. Яна трымалася насцярожана, недаверліва распытвала падрабязнасці. Потым прыехалі бацькі, якія адразу ўсё зразумелі.

Франц быў герой, расстраляны нацыстамі. І сведкай была яна, Марта, ягоная жонка.

Ёй прапанавалі ўгоду. Дом у Берліне і працэнт з сямейнага капіталу, калі атрымаецца штосьці захаваць. Узамен да канца жыцця яна мусіла заставацца фраў Мартай, удавой нямецкага героя. Сведчыць і пацвярджаць у выпадку неабходнасці.

І яшчэ. Яна была свабодная ў сваім асабістым жыцці. Сябры, каханкі, нават дзеці — усё гэта яе справы. Але калі б яна захацела ўзяць шлюб, маёмасць адыходзіла б назад да сям'і.

Яна пагадзілася. Потым зразумела, што тыя анічога не гублялі.

Дом быў у Берліне, у заходняй зоне. І там размяшчаўся шпіталь амерыканскага акупацыйнага корпуса.

Ёй далі пакойчык у прыбудове. Пайшла працаваць у шпіталь, так было больш спакойна.

* * *

А потым на яе зноў выйшла выведка. Амерыканская.

Яны захапілі архіў гестапа і натрапілі на справу Франца. Справа была ясная, але там было яе прозвішча і подпіс. Лейтэнант хваліў яе за дапамогу. Выходзіла, што менавіта з ейным саўдзелам атрымалася абясшкодзіць цэлую сетку брытанскіх шпіёнаў.

Яна ўсё расказала. Пра Менск і пра Вільню. Пра Франца, пра ўмову. Яна стамілася ўвесь час быць кімсьці іншым. Хацелася ўрэшце стаць сабой, хаця б для кагосьці.

Следчы быў здзіўлены. Паўгода цягнулася паўза. Яе правяралі.

Прыязджалі ўсё новыя і новыя людзі. Даводзілася прыгадваць дэталі: як выглядала разведшкола, як іх рыхтавалі, як звалі настаўнікаў і навучэнцаў.

Пакуль аднойчы не прагучала прапанова, якую ў сваім жыцці яна ўжо чула не адзін раз.

І яе зноў адхіліць было немагчыма.

* * *

Легенду не прыйшлося шукаць доўга. Ясна, акторка. Гэтым разам — таленавітая і ўжо не маладзенькая. З трагічнай біяграфіяй.

І дамочак прыдаўся. Была патрэбная база ў Заходнім Берліне для падрыхтоўкі і пераходу. Дом быў ідэальным месцам. Шпіталь вярнуўся на радзіму, і яна засталася адна, у дзесяці пакоях і прыбудове.

Пераафармілі дамову. Ужо персанальна на яе. Цяпер яна была адзіным уласнікам, не залежала ні ад кога.

Грала ў тэатрах. На адным месцы доўга не затрымоўвалася, прымала кожную новую прапанову.

Урэшце адкрыла персанальную студыю з адмысловай праграмай. Нават прыдумала ёй назву: Марта і Магдалена.

* * *

У студыі вучылі на шпіёнаў.

Акторскае майстэрства з элементамі краязнаўства і адаптацыі на мясцовасці. Адмысловы курс. Яна сама яго распрацавала. У школе, якую яна скончыла, былі заняткі па тэхніках распазнавання чужых, спосабах праверкі. Трэба было прыдумаць контртэхнікі, магчымасці абыходу.

Курсантаў прывозілі невялікімі групамі, па пяцьшэсць чалавек. Сялілі ў пакойчыках на першым паверсе.

Заняткі адбываліся ў гасцёўні.

Яна расказвала, як пераўвасабляцца, быць незаўважным. Выклікаць давер і сімпатыю.

З адной з курсантак яна пасябравала. Хаця якраз гэта было забаронена. Магдалена Вярбіцкая. Магдачка. Гэта ў яе гонар была названая студыя.

Назад ніхто не вярнуўся.

* * *

Пабудавалі сцяну. Курсантаў станавілася ўсё меней. Яны цяпер прыязджалі не групамі, а па адным. І не на падрыхтоўку, а на кансультацыю. Перад амбасадай альбо афіцыйным візітам.

Акторская кар'ера таксама прайшла кульмінацыю і цяпер паціху ішла ўніз. Гэта яе задавальняла, стала больш вольнага часу, для роздумаў і чытання. Зрэшты, яна ведала ўсіх у гэтым горадзе і пры жаданні магла прэтэндаваць на любую ролю.

Галеча і разруха канчаткова адышлі, забыліся. Жыццё ішло далей, краіна станавілася заможнай і ўпэўненай. Яна пачала падарожнічаць: жыла ў Парыжы і Амстэрдаме, лётала ў Сінгапур і Буэнас-Айрэс.

Паўгода правяла ў Амерыцы, на перападрыхтоўцы. Дамочак за гэты час таксама перападрыхтавалі: нашпігавалі тэхнікай, антэнамі і прыёмнікамі. Пад іншую задачу: сачыць за эфірам, слухаць размовы, чужыя галасы. Слухаць і расшыфроўваць.

* * *

Але ў прыватным жыцці нічога не мянялася. І аднойчы яна зразумела: усё застанецца як ёсць. Да самага канца.

Клёны і платаны вакол дома. Сцежка да возера.

Раніцы, што поўніліся здзіўленнем і мілымі клопатамі. Дні, падобныя адзін да аднаго, як быццам іх запаўнялі пад капірку. І самотныя вечары з кнігай альбо музыкай.

Кнігі гаілі, лекавалі. Сэрца адпускала, яно зноў мела здольнасць звінець і адгукацца.

А яшчэ келіх добрага віна пад вечар. Пасля яго немагчымасць паразмаўляць, камусьці адкрыцца ці паскардзіцца ўжо не здавалася непапраўнай.

Яна пачала вучыць на памяць ролі з улюбёных п’есаў. Тыя, з якімі ўжо ніколі не патрапіць выйсці на сцэну.

І ўспаміны. Яна пачала іх паціху запісваць.

* * *

Калі ўпала сцяна, базу закансервавалі.

Яна хацела паехаць у Менск. Альбо ў Вільню. Сачыла за навінамі. Нават набыла квіток да Варшавы, каб вырашыць ужо там, на месцы.

А потым штосьці здарылася, унутры яе. Яна здала квіток і перастала пра гэта думаць.

Што менавіта, яна зразумела потым, праз некаторы час.

* * *

Не было да каго вяртацца. Усе, каго яна памятала з таго жыцця, ляжалі ў ямах і кар’ерах. І яна таксама. Дзяўчына, якая хадзіла калісьці па менскіх вулках і адгукалася на імя Эма, цяпер ляжала разам з усімі ў безыменнай магіле.

Яна памерла ў той момант, калі адмовілася паміраць, калі апранула маску, а маска прырасла і стала тварам, і адзіная магчымасць жыць — гэта працягваць быць Мартай, спявачкай з Брэслаў, удавой нямецкага героя.

Кола замкнулася. Яна была заўсёды чужая. І ў агульнай віне, і ў агульнай смерці.

* * *

Але і гэта не ўсё. Не самае важнае.

Пытанне было не ў тым, што там нікога няма. І не ў тым, што няма каму вяртацца.

Яна баялася, што духі яе не прымуць.

5.

За берлінскія часы назбіралася так многа рэчаў, што фраў Марта прапанавала везці багаж асобна. Цягнуць гэта самой было нерэальна.

Кнігі, дыскі, вопратка, сувеніры. Паперы Александра, жалейкі і свірысцёлачкі з розных кантынентаў. А яшчэ падарункі. У тэатры, калі даведаліся, што яна вяртаецца дадому, зладзілі развітальны канцэрт. Сабраліся сябры і калегі, усё было нечакана душэўна. І амаль кожны лічыў патрэбным падарыць штосьці запамінальнае.

У выніку дырэктар паабяцаў дапамагчы адправіць рэчы асобным кантэйнерам, як рэквізіт.

Эва Дамініка пазваніла ў Менск, дамовілася, што яго там сустрэнуць, калі яна раптам затрымаецца па дарозе.

А яна акурат планавала затрымацца.

* * *

Гэта як выходзіць з глыбіні на паверхню: калі занадта спяшаешся, можаш атрымаць кесонную хваробу.

Хуткасць у такой справе супрацьпаказаная.

Лепш набліжацца ціха і павольна: два дні ў Варшаве, дзень у Беластоку, крыху паблукаць па Гародні. І да-

лей аўтобус, які павязе яе праз палі й узгоркі, з прыпынкамі ў невядомых вёсачках і вядомых мястэчках, прыпынкамі, на якіх можна будзе надыхацца паветрам, вярнуцца ў гэтыя краявіды, сапраўды адчуць сябе дома.

Чамусьці менавіта гэты аўтобус быў найбольш жаданым, хаця яна ніколі не вярталася з Гародні аўтобусам. Не была нават упэўнена, што такі існуе. З вёсачкамі і мястэчкамі.

Яна ўяўляла яго пустым, старэнькім, крыху разбітым. Але вельмі ўтульным.

* * *

Апошні раз выехала ў горад, па звыклым маршруце. Даехала да Фрыдрыхштрасэ, спусцілася ўніз, у вір і тлум вуліцы, прайшла праз галерэі крамак, без шкадавання мінула ліпавы бульварчык. Потым рашуча налева, і вось, нарэшце, французская царква, скверык з яе ўлюбёнымі клёнамі, у якім яна правяла столькі часу.

Гэта было магічнае месца, пляц цішыні, так яна калісьці яго для сябе назвала.

Пасядзела на лаўцы, на развітанне.

Вярнулася на станцыю. Недзе побач, на Альбертштрасэ, мусіла быць рэстарацыя Хорхе. Перайшла масточак, знайшла рэстарацыю.

Самога Хорхе не было. Замовіла хатняга аргентынскага, пасядзела.

Урэшце пакінула паштоўку. Падпісала яе па-гішпанску.

Пасля работы з архівам Александра гэта было нескладана.

* * *

Яна не блукала па Варшаве з часоў сваіх уцёкаў. Гатэльчык месціўся за два крокі ад Кракаўскага, цалкам неблагі, нягледзячы на дзве зоркі.

У гатэлі праверыла мэйл. Лістоў было ажно пяць. Звычайна ніхто не пісаў тыднямі, а тут выстраілася чарга па яе ўвагу.

Два запрашэнні на фестывалі. Ліст ад агента, з прапановай паўдзельнічаць у конкурсе на музычную стыпендыю ў Зальцбургу, для "маладых кампазітараў".

Ліст ад Хорхе. Ён дзякаваў за паштоўку.

Ліст ад фраў Марты. Гэта было самае дзіўнае.

Яна ніколі не бачыла фраў Марту з камп'ютарам. Тым болей не ўяўляла, што тая карыстаецца электроннай поштай. І ўжо ясна не давала ёй сваю адрэсу.

Фраў Марта пісала, што дасылае копію тастамента, але спадзяецца на сустрэчу ўжывую.

* * *

Зайшла ў кнігарню. Пашукаць добрую чытанку для *палёў і ўзгоркаў*. Карцінка ўсё яшчэ стаяла перад вачыма: старэнькі аўтобус, вёсачкі і мястэчкі, кніга на каленях.

А вось і яна, ляжыць на самым бачным месцы.

Фэрнанда Пэсоа, Кніга непакою.

Імя аўтара ёй анічога не гаварыла. Але метафара была дакладная: сады тайны, сады непакою. Яна ўзяла кнігу і скіравалася да касы.

Выйшла на вуліцу і пайшла няспешна, у пошуках утульнага месца. Раптам зусім па-іншаму адкрыўся Новы свет, з яго маленькімі крамкамі і пяшчотнай гаманой звонку. Тут схавацца было прасцей, чым на

Кракаўскім. Сапраўды, усё адразу знайшлося: кавяранька, столік каля сцяны, падушка. Усё, што трэба, каб на гадзінку заціхнуць, забыцца на знешнія формы.

Разгарнула кнігу. Зразумела, што не памылілася: непакой быў сапраўдным, без імітацый. Стала ўзнёсла і радасна, як быццам у вязніцы сярод цёмнай, глухой ночы пачуліся гукі з суседняй камеры, *ад незнаёмага сябра*.

Яна правалілася ў чытанне і зусім забыла пра далейшыя планы.

Непадалёк, на рэцэпцыі, яе ўжо чакалі арганізатары.

* * *

Канцэрт быў у камернай зале, той самай, у якой яны выступалі з Алехандра, і гэта здзівіла. Яны дамаўляліся пра клуб альбо кавярню, з утульнай сцэнай і неабавязковай праграмай. Але ўсё было больш сур'ёзна.

Вядучы прадставіў яе як вядомую спявачку і кампазітара з Берліна. Расказаў пра жыццё, адзначыў, што яна спявае на пяці мовах. Падкрэсліў, што яе творы выконваюцца на трох кантынентах і сталі ўжо класікай новага музычнага авангарда.

Гэта было падобна на праўду, але праўду не пра яе, а пра нейкую іншую Эву Дамініку.

Яна спявала Рыльке, элегіі. Потым фрагменты з *Сымона-музыкі*. І нечакана для сябе *Le cimetière marin* напрыканцы. Памяці Алехандра.

Калі скончыла, некалькі секундаў у зале была цішыня.

Потым апладысменты. Шквал апладысментаў.

* * *

Беласток быў спакойны. Тут не было канцэрта, ніхто не ведаў аб прыездзе *вядомай спявачкі*. Сабраліся вузкім колам, старыя сябры, з часоў першых Басовішчаў.

Было цёпла і душэўна. Заехалі ў леснічоўку ў глыбіні пушчы. Пагулялі па лесе, пасядзелі каля вогнішча. Было адчуванне, што яны патрапілі на дзесяцігоддзі назад, у часы, калі ўсё толькі пачыналася.

Спявалі ўсе разам. Вярнуліся пад раніцу.

Маршрутка да Горадні адыходзіла ў 13.30. Там яе чакаў прыемны сюрпрыз, як напісалі арганізатары. Яны абяцалі замовіць гатэль і прасілі не хвалявацца. Пагуляць сваім звычайным маршрутам. Сустрэча каля Новага Замка а 18.30.

Крыху бянтэжыла, што не мела іх тэлефонаў, толькі электронную пошту. Але ведала час і месца, і гэтага мусіла быць дастаткова.

* * *

Мяжу праляцелі хутка, без недарэчных пытанняў — *навошта*, і з *якой мэтай*, і чаму *так доўга адсутнічалі*.

Маршрутка збочыла з трасы, няспешна праехала праз горад і спынілася на пляцы перад чыгуначным вакзалам.

Яна сама папрасіла яе не сустракаць. Хацелася ўвайсці ў горад ціха і незаўважна, як цень, прывід з мінулага. Але выйшла з маршруткі і раптам зразумела, што не ведае, куды ісці засяляцца. Яна не перапісала адрэсу гатэля. Не памятала нават назву.

Пацягнулася на вакзал, паглядзець расклад, на ўсялякі выпадак. Усё той жа начны цягнік. Стольні разоў яна вярталася ім з Гародні, і амаль заўсёды з сябрамі.

Можна было набыць квіток, здаць торбу ў камеру захоўвання. Потым прагуляцца па горадзе, паспяваць і спакойна загрузіцца ў купэ. Яна стала ў чаргу да касы. Але ў апошні момант вырашыла ўключыць роўмінг і праверыць інфармацыю.

Прыйшло смс на яе берлінскі нумар. Арганізатары віталі на радзіме і нагадвалі адрас гатэля. Ён быў зусім блізка, за пару кварталаў.

* * *

Часу да сустрэчы было якраз, каб прайсціся па вулках, прыгледзецца, падыхаць паветрам.

Яна пайшла пешкі, старым маршрутам. Уніз па Ажэшкі, далей на Савецкую. Спусцілася да сінагогі.

Потым да Каложы. Села на лаўку пад сцяной.

Калісьці ў яе быў цэлы рытуал: абысці вакол, дакрануцца да сценаў, пасядзець побач. Тут заўсёды было спакойна і ціха.

Выцягнула тэчку з лістом Францішку, расклала аркушы. Перачытала некаторыя фрагменты.

Адразу за ракой быў бачны пералесак, з соснамі і прыгожым пясочкам. Там вельмі добра дыхалася б, падумала яна і ледзьве не пацягнулася назад да моста. На той бераг.

Глянула на гадзіннік. Да сустрэчы заставалася зусім мала.

* * *

Публіка была дзіўная. Яна чакала свядомую моладзь, а таксама тых, хто *памятае*, людзей свайго пакалення. Нават прыдумала адмысловую праграму, каб было цікава ўсім, кожны мог знайсці штосьці для сябе.

Але ўсё было не так, як яна сабе ўяўляла.

Купкі моладзі кружлялі вакол, неяк насцярожана. Непадалёк стаялі бабулі, са значкамі і сцяжкамі. А яшчэ нейкая група людзей сярэдняга ўзросту, яны таксама падыходзілі й адыходзілі, як быццам не былі ў чымсьці да канца ўпэўненымі і хацелі нешта праўдзіць.

Адсутнічалі толькі арганізатары.

Яна расчахліла гітару, узяла некалькі акордаў. Потым ціха, для сябе, пачала спяваць *пра жахлівых анёлаў*.

Народ пачаў падыходзіць бліжэй, збірацца колам, услухоўвацца.

* * *

Тры хлопцы злева пачалі пляскаць у далоні, вельмі гучна, і Эва Дамініка зрабіла эфектную паўзу, чакаючы канца авацыі.

Але апладысменты не заканчваліся. Больш за тое, у яе было цьмянае адчуванне, што пляскалі зусім не ёй.

Ці, больш дакладна, гэта значыла яшчэ штосьці.

Да таго ж у хлопцаў былі нейкія самотныя засяроджаныя твары, зусім не як пасля сустрэчы з прыгажосцю. Як быццам праз хвіліну яны збіраліся скокнуць у прорву альбо ўзысці на шыбеніцу.

Бабулечка справа выцягнула нейкую газету, пачала крычаць пра зніклых і махаць рукамі.

Гэта, напэўна, было нейкім тайным знакам, таму што ўсё раптам заварушылася. Хлопцы сталі ў карэ і выцягнулі расцяжку *за нашу і вашу свабоду*. Невялічкая група пачала спяваць *Магутны Божа*.

Аднекуль прыбег тоўсты і смешны чалавек у міліцэйскай форме. З аховы. Прасіў разысціся, не парушаць грамадскі парадак. Потым камусьці званіў, крычаў у тэлефон пра несанкцыянаванае мерапрыемства, патрабаваў дапамогі.

Было адчуванне, што яна патрапіла ў іншае месца, а можа, нават у іншы час. У якім усе адзін аднаго ведалі і разумелі, што адбываецца.

А яшчэ здавалася, што яна штосьці наблытала, і яе канцэрт запланаваны зусім не тут.

* * *

З'явілася легкавая машына. Хутчэй за ўсё, дапамога, якую выклікаў міліцыянт. Наперадзе былі аддзяленне, пратакол, магчыма штраф.

Цудоўнае вяртанне. Яна ўжо забыла, што такое бывае.

Было адчуванне абсурду, як быццам яе ўставілі ў даўнюю гісторыю. З якой яна калісьці ўцякла і ў якую яе гвалтоўна і нечакана вярнулі.

Усё было знаёмае аж занадта.

Яна столькі разоў уяўляла сабе свой прыезд, першае выступленне на радзіме, але да такога дадумацца не магла.

Раптоўна ёй стала весела. І ўтульна. Захацелася абняць усіх — хлопцаў, бабулек, міліцыянта, — сказаць ім, каб не хваляваліся. Усё ўрэшце будзе добра, і з імі, і з краінай.

Яна ўжо ведала, што напіша ў пратаколе. Магчыма, нават паспявае, там, у аддзяленні. Гэта будзе фантастычны канцэрт, лепшы ў яе жыцці!

Машына падкаціла бліжэй. З яе выскачылі два дужыя хлопцы і пабеглі да яе. Абдымацца.

Гэта былі арганізатары.

* * *

Яны выбачыліся за спазненне, пасадзілі яе ў машыну, перакінуліся словамі з дзецюкамі і бабулькамі, штосьці шапнулі міліцыянту на развітанне і няспешна ад'ехалі.

Ужо ў салоне яшчэ раз прабачыліся. Сказалі, што баяліся размінуцца, таму й прызначылі сустрэчу ў самым вядомым месцы. Сам канцэрт будзе ў Батлейцы, без публічнай рэкламы. Але няхай яна не хвалюецца, публіка збярэцца, і не самая горшая.

Хлопцы відавочна былі знаёмыя. З ранейшага жыцця. Але з якога? Яна ніяк не магла прыгадаць, хаця памяць на твары ў яе была амаль ідэальнай, акторскай.

І яшчэ адна рэч крыху муляла.

Яна дакладна памятала, што Батлейка знаходзілася ў іншым баку горада.

Там другая зала, камерная, пра яе мала хто ведае, сказаў кіроўца, быццам прачытаўшы яе думкі.

6.

Павярнулі ў вузенькі завулак, спыніліся. Зайшлі ў кавярню. Прайшлі яе наскрозь — барная стойка і тры невялічкія столікі каля вакна, — спусціліся па калідоры ўніз, у сутарэнні.

Надзіва, сутарэнні былі значна больш прасторныя. Раней тут месцілася таварыства сляпых, патлумачыў кіроўца. Потым начны клуб, першы ў горадзе. Зусім нядоўга. Гаспадары ўцяклі праз месяц, памяшканне выставілі на аўкцыён. Сённяшні ўласнік перадаў нам яго ў карыстанне за сімвалічную плату.

Раз-пораз мы ставім тут спектаклі. Ведаеце, асабістыя запрашальнікі, магічны тэатр, усё такое. Гэта дзейнічае нават лепш, чым рэклама.

Вось тут злева грымёрка з усім неабходным. Зала — далей па калідоры. Цяпер там ідзе падрыхтоўка, можаце схадзіць паглядзець. Кава ці гарбата? Я папрашу Ядзю, яна згатуе.

Калі патрэбная дапамога, звяртайцеся.

І яшчэ. Спадар Леа просіць прабачэння, што не сустрэў Вас асабіста. Гэта ўласнік кавярні. Ён сказаў, што вы калісьці былі знаёмыя. Ваш выступ тут — ягоная ідэя.

Так-так. Спадар Леа. Ён просіць сябе так называць.

* * *

Усе грымёркі, у якіх яна рыхтавалася, былі падобныя адна на адну. Але гэтая была іншай. Большай, чым звычайна. Як быццам разлічанай на цэлую трупу. Зрэшты, калі раней тут быў начны клуб, гэта не дзіва.

Вялікае люстэрка на ўсю сцяну, як у балетнай школе.

Афішы спектакляў — відавочна чыясьці старая калекцыя. Варшава, Прага, Парыж. І маскі, паўсюль маскі.

Прадчуванне было добрае. Надзвычай добрае. Як дваццаць год таму, калі яна толькі пачала выступленні. Яна даўно так сябе не адчувала перад пачаткам.

Пахла морам і дарагой парфумай.

На момант ёй падалося, што яна ў Берліне, у грымёрцы фраў Марты. І што фраў Марта недзе побач. У зале альбо ў суседнім пакоі.

* * *

Яна пачала разглядаць маскі. Некаторыя пазнавала. П’еро і Мальвіна. Японскія маскі з тэатра Но. Грэцкія, кітайскія, персідскія багі.

З адваротнага боку на масках былі подпісы, быццам хтосьці баяўся, што акторы могуць усё пераблытаць.

Яна падумала, што й яе твар, яе сапраўдная роля можа быць недзе тут, сярод усяго. Тая, што прызначана толькі ёй. На сённяшняе выступленне. А можа, і на ўсё жыццё.

* * *

Адна маска забрала яе ўвагу. Яна вісела асобна, крыху ўбаку, як быццам яе павесілі спецыяльна перад яе

прыходам. Прыгожы жаночы твар са стылізаванымі кітайскімі рысамі. Альбо персідскімі. Яна падышла бліжэй.

На адвароце па-ангельску была напісана: танцорка Гай Сунь. І далей дробным шрыфтам тлумачэнне: яе танец з мячом натхняў паэтычных шаленцаў дзесяці эпохаў.

Што за эпохаў — незразумела. Але з паэтычнымі шаленцамі было прыгожа. Заставалася даведацца, што значыць танец з мячом. Калі ён падабаўся паэтычным шаленцам, наўрад ці гэта было штосьці вайсковае. Ён мусіў быць нейкі іншы, не такі, як звычайна.

Але які іншы?

Побач, на сцяне, была намаляваная кітайская сцэнка: танцорка з чырвонай стужкай танчыць у невялікім пакоі. Вакол сядзяць людзі. Напэўна, тыя самыя паэтычныя шаленцы.

Самае дзіўнае — у сцэнцы была перспектыва. Карціна была выцягнутая ў глыбіню, як быццам хтосьці зазіраў праз вялікае вакно ўглыб, у іншую эпоху.

Побач былі намаляваныя дзверы. Занадта вялікія, як для карціны. Дыспрапарцыйна вялікія. Яна магла б увайсці ў іх, крыху прыгнуўшыся. Калі б захацела.

Няясна, праўда, куды: у карціну ці ў суседні пакой.

Яна прымерыла маску: тая легла на яе ідэальна, другім тварам.

* * *

А можа, дзверы зусім не маляваныя?

Яна чытала пра такое: у старых тэатрах абавязкова мусілі быць патаемныя калідорчыкі. Якія дазвалялі

акторам з’яўляцца ў зале раптоўна, быццам з ніадкуль. Добра, калі б тут было нешта падобнае.

Яна падышла бліжэй. Дзвярная клямка была сапраўднай.

Яна пастаяла крыху, а потым асцярожна пацягнула за клямку.

За дзвярыма быў кароткі, метраў на пяць, праход. Далей фіранка, за якой, хутчэй за ўсё, выхад на сцэну. Ці ў залу, у які-небудзь незаўважны кут.

Яна ціха, на дыбачках падышла да фіранкі і праз шчылінку паглядзела навонкі.

* * *

Зала была невялікая, але вельмі ўтульная. І ў ёй відавочна ішлі апошнія падрыхтаванні.

У цэнтры размяшчаўся подыум з пілонам. Вакол подыуму стаялі столікі, крэслы і канапкі. Сцэна была крыху ўбаку, да яе вяла аксамітная дарожка.

Рыхтаваліся да падзеі. Расстаўлялі крэслы, праціралі столікі.

Было адчуванне свята, амаль як у дзяцінстве.

Адміністратарка павярнулася тварам і стала ясна: гэта фраў Марта, толькі вельмі-вельмі маладая, з тых далёкіх часоў, пра якія яна расказвала. Вільня, Рыга, мо нават Менск. Той Менск, у які яна так і не вярнулася.

На сцэне стаяў Алехандра са скрыпачкай і штосьці распавядаў Герміне. Хорхе сядзеў за пультам, рэгуляваў асвятленне. За цэнтральным столікам сядзеў чалавек, вельмі падобны да Леа. Таго Леа, дваццацігадовай даўніны, які стаяў за стойкай бара ў Хвілінцы.

Было такое ўражанне, што яе тут даўна чакалі.

* * *

Яшчэ гадзіну таму яна блукала па Горадні, а перад тым ехала ў маршрутцы, сядзела з даўнімі сябрамі ў лясной хатцы пад Беластокам. Не было аніякага месца, якое б яна не памятала ясна і дакладна.

І ўсё ж зараз было адчуванне, што з рэальнасцю штосьці не так. Як быццам яна незаўважна для сябе недзе збочыла са сцежкі і цяпер патрапіла ў адзін са сваіх берлінскіх сноў. Пасля якіх так дзіўна было прачынацца.

Зрэшты, прачынацца зусім не хацелася. Наадварот, было страшна цікава, што будзе далей. Калісьці яна ўшчыкнула сябе зарана ды так і не даведалася, чаго хацелі ад яе Сапегі з Радзівіламі.

Гэтым разам яна не зробіць такую памылку. Будзе ісці наперад, сніць свой сон да самага канца, як бы дзіўна ці нават страшна ўсё ні выглядала.

Яна вырашыла гэта і адразу супакоілася.

Вярнулася ў грымёрку, расчахліла гітару. Дастала тэксты. Узяла некалькі акордаў, паспрабавала распецца.

* * *

Была яшчэ адна версія. Зусім фантастычная.

Магчыма, нейкі дэміург, невядомы Аўтар, недзе побач творыць сваю рэальнасць. І там, у гэтай рэальнасці, яна толькі адзін з персанажаў, інструмент аўтарскай волі.

Яна паспрабавала сабе гэта ўявіць. Падумала, што *быць інструментам* зусім не проста. Іншае самаадчуванне, іншая эмоцыя.

Уявіла, што ў адной з паралельных рэальнасцяў, калі б аўтару не хапіла фантазіі, магла не сустрэць Алехандра, а паехаць у Менск. Альбо яшчэ раней застацца ў драўлянай хатцы, у Францішка. Нарадзіць дзетак. Выкладаць музыку ў музычнай школе. У суседнім мястэчку.

І ўсё было б па-іншаму, і яна была б іншай.

Падумала пра лабірынт і пра нітку. Штосьці вяло яе ў лабірынце свету. Але што? Раней яна думала, што музыка была такой ніткай. Яна трымалася за яе, ішла ад гуку да гуку, ад гармоніі да гармоніі.

* * *

У дзверы пастукалі. Увайшоў кіроўца — ён пераапрануўся і быў падобны на канферансье, з мятлікам і куточкам насоўкі. Публіка сабралася, сказаў ён. Час пачынаць выступ.

Яны выйшлі з грымёркі, прайшлі па калідоры да залы. І далей, па аксамітным праходзе, на сцэну. Пад шэпты і воплескі.

Зала была запоўненая. Яна паспрабавала знайсці сярод гледачоў фраў Марту, але твары ў прыцемках было не разгледзець.

Вядучы ўжо штосьці гаварыў пра яе творчасць. Пра стылі і перыяды, вялікі сыход і вялікае вяртанне. Пра тое, што на яе песнях выгадавана цэлае пакаленне і яно з ёй будзе заўсёды.

Першыя секунды яна слухала і ўглядалася, але потым звыкла адышла ўнутр сябе, настройвацца і канцэнтравацца.

* * *

Пачынаўся канцэрт, галоўны ў яе жыцці. З самымі дарагімі, самымі чаканымі, самымі важнымі слухачамі.

Гэта да яго яна ішла па сваім лабірынце, трымаючыся за нітку.

Яго мроіла і сніла, рыхтавала і прыспешвала.

Не істотна, у якіх абставінах мы заўтра прачнемся, падумала яна раптоўна. Сніць нас хтосьці ці прыдумвае. Неістотна, ці мае ён план і які менавіта.

Важна, што ўва ўсіх нашых снах, усіх лабірынтах, усіх магчымых рэальнасцях у нас ёсць для каго быць музыкай.

* * *

І яшчэ адно, што канчаткова прымусіла яе *паверыць у цуды*.

У далёкім куце сядзеў Францішак і ўсміхаўся.

ЛЕА ЗГАТАВАЎ КАВУ

1.

Напэўна, гэта ўсё ж такі была Хвілінка.

Мы стаялі за стойкай, Фэн піў свой улюбёны напой: язмінавую гарбату.

Я быў пусты і спакойны.

Я амаль выканаў абяцанне, што калісьці даў самому сабе, — распавесці гэтую гісторыю. Пра кавярню, у якую патрапіў у часы маладосці і якая засталася са мной на ўсё жыццё. Дарагім успамінам, як звычайна гавораць у такіх выпадках.

Але ўсё атрымалася звыкла складана: у пэўны момант гісторыя пачала расказваць сябе сама — і мяне таксама — і вось я ўжо ўнутры, паміж радкамі і крыху наўзбоч, у словах, паўзах, разрывах, у аблоках, што плывуць на гэтых старонках. Разам са сваімі персанажамі.

Фэн быў адным з іх і ў той жа час маім старым сябрам, што жыве ў Шанхаі і якога я не бачыў з тых часоў, калі гісторыя толькі задумвалася.

Ён піў язмінавую гарбату, і я разумеў, што мы маем шанец стаяць і размаўляць адно тут, у Хвілінцы.

Толькі тут я магу расказаць яму пра сваё жыццё, якое адбывалася ўжо без яго, і пра гэты раман, і пра тое, як усё гэта пераблытана.

* * *

На старонках маёй кнігі жывуць тры героі, казаў я яму.

Яны ідуць сваімі сцежкамі, часам насуперак логіцы падзеяў, а ў пэўныя моманты нават насуперак аўтарскаму жаданню.

Напаўзвар'яцелы паэт, які ўглядаецца ў аблокі, шукаючы там знакаў, што дазволілі б зразумець сваё з'яўленне на сцэне.

Стомлены самурай, што пражывае не сваё жыццё, прадчуваючы бессэнсоўнасць змагання.

І, канешне, фатальная кабета, як без яе. Але кабета, што нарадзілася ў часы без фатуму і без кону. І якая імкнецца ўцячы, схавацца — ад мізэрнасці таго, што прапануе ёй эпоха.

У даўнія часы за яе, магчыма, вяліся б войны і руйнаваліся гарады, сёння ж яна праходзіць праз свет як цень Эўрыдыкі, тонка і незаўважна, з адчуваннем лёгкага жалю, што *так атрымалася*.

* * *

Усе тры — уцекачы, блуканцы. Яны сустрэліся, калі жыццё толькі пачыналася. Буяла і красавала, пазвоньвала мілымі бубенчыкамі, абяцала так многа...

І нават цяпер, калі ўсё зайшло надта далёка, яно не толькі не згубіла сваёй загадкавай прыцягальнасці — наадварот, усё яшчэ вабіць і спакушае.

Яны сустракаюцца ў адзін жнівеньскі дзень на калідоры гістфакаўскага інтэрната на Свярдлова, 34. Знаёмяцца. І адразу пераплятаюць свае лёсы. На ўсё жыццё.

Першы — мядовы — месяц свайго сяброўства яны праводзяць разам. Практычна не разлучаюцца.

Але далей раз'ядноўваюцца й ідуць паасобку.

Разумееш, Фэн, яны ўгрызаюцца ў эпоху напоўніцу, выпрабоўваюць яе на трываласць, але ў пэўны момант сыходзяць з цягніка — на сваіх, толькі ім адным бачных прыпынках.

* * *

Францішак так і не з'яўляецца на авансцэне. Ухіляецца. Дазваляе часу аплятаць яго рознымі заняткамі. Блукае, як дэрвіш, у пошуках таго, што магло б здарыцца.

Шукае сваю залатую маску.

Імкнецца падысці да скраю рэальнага.

* * *

Эва Дамініка. Мілая Эва. Яна становіцца зоркай, яе песні гучаць не толькі на канцэртах — яны гучаць *у сэрцах*.

І раптам яна ўсё кідае — і застаецца ў Берліне.

Да яе здзіўлення, там, на адлегласці, з ёй здараецца музыка. Яна піша самае лепшае, самае тонкае і свабоднае з усяго.

І самае неверагоднае — яна ўрэшце вяртаецца.

* * *

Але больш за ўсё мяне хвалюе Багдан.

З усіх трох ён найменш гатовы да выпрабаванняў эпохі. І я тут анічога не магу зрабіць. Не ведаю, як дапамагчы.

Напрыканцы гісторыі ён выпраўляецца ў падарожжа. У небяспечнае падарожжа, з якога няма добрага выйсця. Праўду кажучы, яму і не вельмі хочацца вяртацца.

Ён аплецены часам, як тапелец мокрай травой, пражытае вісіць на ім кайданамі.

* * *

Ён быў самы малады, самы тонкі і выйшаў на бой за праўду, як Давід на бой з Галіяфам. *Гераічна*.

І ўсё ж штосьці было не так, непакоіла. Нават тады, калі да сапраўднага непакою было вельмі і вельмі далёка.

Ягоная залішняя гатоўнасць прымаць наяўныя формы, супадаць з імі? Ён давяраў свету аж занадта, і свет з гатоўнасцю яго… не тое што падманваў, не. Прапаноўваў самае простае. Тое, што ляжыць на паверхні.

Таму ад самага пачатку было прадчуванне: ён можа зламацца. Не праз тое, што слабы, унутры ці навонкі. А таму, што матэрыял эпохі занадта хісткі, ненадзейны.

* * *

Што з намі адбываецца, калі мы ідзем праз час? Прымаем ягоныя формы?

Бязважкі і бязлітасны, ён карыстаецца намі, як матэрыялам, *гіпотэзай*. І тое, што нам здаецца асабістымі траекторыямі, лёсам, наканаваннем, — для яго проста чарнавыя накіды, зробленыя алоўкам невядомага майстра. Мілыя ўзоры на крылах матылька, выпадкова падгледжаныя восеньскім надвячоркам.

* * *

Паўсюль толькі пытанні, я так і не прыдумаў анічога, чым усё гэта можа завяршыцца. Анічога праўдападобнага.

Прывёў іх у Хвілінку пакручастымі сцежкамі, каб яны нарэшце сустрэліся. Пасля ўсяго. І крыху перачакалі.

Багдана — расчараванага прамінулым, але знайшоўшага самога сябе, як яму здаецца.

Эву Дамініку — што вяртаецца на радзіму, поўная музыкай.

І Францішка. Вядома, Францішка. Я не ведаю, якімі маршрутамі ён сюды дабіраецца са сваіх віленскіх узвышэнняў.

* * *

Фэн слухаў уважліва.

Так шмат аблокаў і лабірынтаў, сказаў ён.

Пастак, у якія патрапляеш і не ведаеш, як і куды выбірацца. І ці выбірацца ўвогуле.

Не разважай так многа *пра сэнс усяго*.

Проста любі і шануй сваіх персанажаў. Прыдумвай для іх добрыя сцежкі і вартыя перашкоды. І тады ўсё складзецца. І ў цябе, і ў іх.

2.

Такое ўражанне, што я толькі-толькі прачнулася, Эва Дамініка сказала гэта паўшэптам, сама сабе. Ці заснула, чаму не, гэта таксама было магчыма.

Яе келіх з сухім чырвоным мэрло быў напалову пусты. Яна не памятала, што было перад гэтым, хвіліну таму, але гэта было не так істотна.

Больш істотным было тое, што вакол: ціхая музыка з даўна забытага часу, двое старых сяброў, восень за вокнамі.

Божа, як гэта цудоўна — знайсці сябе п'яной і шчаслівай, у піцэрыі, якой ужо даўна няма ў рэальнасці, падумала яна.

І яшчэ: уяўляць гэтую сустрэчу гадамі, а калі ўсё адбываецца, разумець, што табе проста хочацца памаўчаць.

* * *

Францішак стаяў на сваім звыклым мейсцы, каля вакна.

Я часта думаю пра нашае знаёмства ў інтэрнаце, сказаў ён. Усё, што тады адбылося. Ноч. Паветраны шар. Зоркі над галавой, якія шмат абяцалі, хаця былі так далёка.

Як мы потым стаялі ў Хвілінцы, утрох. Як узвышаліся, набіралі вышыню. Нам здавалася, што дарога ўверх — бясконцая. Мы хацелі ўзнесціся, быць вышэй за часовыя формы.

А столь эпохі аказалася вельмі нізкай. Зорнае неба было проста намаляванае — для такіх дурняў, як мы.

Калі я цяпер думаю пра наш сумесны палёт на паветраным шары *праз часовае, занадта часовае*, мне хочацца смяяцца ціхім вар'яцкім смехам.

* * *

Багдан глядзеў кудысьці ўдалеч і крыху ў сябе, як быццам не да канца верыў, што гэта наяве.

Яму хацелася расказаць многа, занадта многа.

* * *

Я ўсё ж такі знайшоў выйсце. Там, у лесе.

Не адразу. Прыйшлося пахваляваціца.

Дзякуй за кнігу, дарэчы. Можна сказаць, яна мяне і выратавала.

Усю апошнюю ноч я размаўляў з каралём малпаў. А калі прачнуўся, у галаве заставалася адна фраза. Пра гаючыя глыбіні. І я дакладна ведаў, што яна значыць.

Зразумеў, у чым была памылка. Я шукаў кладку. Сцежку праз багну, па якой можна было б вярнуцца. А трэба было шукаць глыбіню. Там, дзе можна было б не толькі праплыць самому, але й перавезці на плыце на той бераг усе дзесяць тысяч рэчаў гэтага свету.

Калі я вярнуўся ў Мінск, адразу пайшоў на сядзібу. Чакаў няпростай размовы. Папрокаў. Абвінавачванняў. Але нічога не было. Пшык.

Ім было няёмка. Яны нават не шукалі. Ці шукалі, але вельмі-вельмі ціха. Думалі, што я сяджу ў *амерыканцы* і даю паказанні. Што я немедыйная персона. Сказалі, што ім было нявыгадна мяне раскручваць, ішла кампанія і я адабраў бы ўвагу ад іншых.

А яшчэ яны думалі, што я гэтак сябе піяру. Спрабую іх адсунуць.

Калі я выйшаў на вуліцу, раптам зразумеў, што больш за дваццаць год жыцця проста зніклі. Апынуліся ў кошыку для смецця.

Было адчуванне паразы. Асабістай і непапраўнай.

Я ішоў уздоўж Свіслачы і плакаў. Я ніколі ў жыцці не плакаў. Заўсёды трымаў удар, гэта было важна. А тут слёзы самі паліліся, і я анічога не мог зрабіць.

* * *

А потым усё змянілася. Я зразумеў, што ўсё ж такі вярнуўся. А мог застацца там, на выспе. З жахам усведаміў, што ёсць купа рэчаў, якія ўсе гэтыя гады ціха чакалі і спадзяваліся. Што я нарэшце звярну на іх увагу.

Усё, пра што я думаў апошнім часам, раптам стала лёгкім, амаль нерэальным. Я адчуў сябе шчаслівым. І свабодным. Штосьці адкрывалася наперадзе, з-за лініі далягляду. Будучыня зноў была невядомай. Непрадказальнай.

* * *

Я абавязкова напішу кнігу. Пра апошняе паўстанне. Раман.

Караткевіч не працягнуў свой аповед у *Каласах*. Не захацеў забіваць герояў. Я раскажу пра тое, што з намі адбываецца, калі гісторыя скончана. Пастаўлены апошнія кропкі.

Часам я дастаю са скрыні для смецця ўспаміны пра пражытае і разумею, што не ўсё так страшна. І безнадзейна.

Прыгадваю нашую размову. Тады, у інтэрнаце.

Штосьці ў гэтым ёсць нават прыгожае — ісці супраць часу. Насуперак.

Дарэчы, дзе вы былі ўсе гэтыя гады?

* * *

Усе гэтыя гады мы былі поруч, сказаў Францішак. Поруч з табой.

Мы і цяпер поруч з табой. І размова працягваецца.

Ведаеш, сутнасную размову не так проста скончыць.

Часам ты робіш перапынак, замаўкаеш, але пры гэтым разумееш, што размова ідзе сама сабой.

Што гэта яна намі размаўляе.

І яна проста не можа, не мае права перапыніцца, пакуль не дагаворацца да канца пэўныя рэчы.

* * *

За вакном пачынала брацца на вечар. Пэўны час яны стаялі моўчкі, у чаканні ліхтароў, якія мусілі запаліцца і асвятліць усё на свеце. І сапраўды, ліхтары запаліліся і ўсё стала па іншаму.

Іншыя твары, што раптам праступілі з сутоння. Новыя эмоцыі, галасы.

Лётаў прыгожы матылёк.

Ён сядаў на кубачкі з кавай, завісаў у паветры, падлятаў да наведнікаў, як быццам хацеў пазнаёміцца і пра штосьці расказаць. На крылцах можна было разгледзець дзіўны ўзор, які нагадваў гіерогліф. Але не той, які калісьці накрэсліў Францішак на дошцы. Больш складаны і незвычайны.

Ты ведаеш, зазвычай матылькі жывуць адзін дзень. А гэты, здаецца, лётае ўжо не першае стагоддзе, сказала Эва Дамініка і ўсміхнулася.

Адкуль ён патрапіў сюды, у Хвілінку?

І што ён тут робіць?

Гэта Леа гарэзіць, сказаў Францішак.

Часам ён, зусім як дзіця, творыць свет са сваіх і чужых сноў.

Думаю, ён дае нам знак, што ўсё падыходзіць да свайго скраю.

* * *

Я стаяў у сваім куце і дапісваў апошнія сказы. Францішак меў рацыю, усё сапраўды падышло да свайго скраю.

Гісторыя амаль расказаная, час развітвацца, ставіць апошнія кропкі. Праз хвілінку Леа прынясе каву і наш маленькі хатні спектакль завершыцца.

Запавеса павольна папаўзе па сцэне, хаваючы прыдуманыя і непрыдуманыя дэкарацыі. Вуліцы і пляцы, метафары і знакі прыпынку. Сны, фрагменты ўспамінаў.

Акторы ўсё яшчэ стаяць перад намі, але ўжо без масак. Дзякуюць за ўвагу. Раскланьваюцца. Прымаюць кветкі і падарункі.

Яшчэ крыху — і яны нарэшце будуць вольнымі: ад аўтарскай фантазіі, прапанаваных дэкарацыяў, навязлівых жаданняў эпохі.

Будуць самі пражываць уласныя жыцці. Блытаць ніткі лёсу, блытацца ў іх. Адхіляцца.

3.

За вакном пайшоў дождж. Звычайны, восеньскі.

Спачатку няўпэўнена, асобнымі кроплямі, амаль нябачнымі ў вечаровым сутонні.

А потым адразу моцна — як быццам на штосьці адважыўся і цяпер не было сэнсу хавацца.

Кроплі касымі лініямі рассякалі прастору, імклівa, неўстрымана, патраплялі на дрэвы, на людзей — хацелі да ўсяго дакрануцца, усё зразумець ці проста вымыць усё дарэшты.

І я падумаў, як многа можа значыць гэты просты восеньскі дождж і як многа ён можа хаваць за сабой.

Падумаў пра кроплі вады, што жывуць толькі імгненне, — пра тое, як ім там, у небе, перад тым як адарвацца і паляцець уніз, як яны набрыньваюць, выцягваюцца, набываюць форму.

Калі штосьці неверагоднае, вышэйшае, штосьці, што яны не ведаюць і не разумеюць (бог?! сіла прыцягнення?! час?!), імкнецца вырваць іх з цёплай дасканаласці аблокаў — і скіраваць сюды, да нас, у пранізлівы, халодны, зблытаны з ветрам гарадскі надвячорак.

Падумаў пра пачуццё бяздомнасці і халоднай безразважнасці, калі выпадаеш і ляціш уніз, і адзінае, што можна зрабіць, — пагадзіцца на лёт, на куламесу,

у якой усё зблытана з усім, і ўсё толькі на момант, на імгненне.

У такі восеньскі дождж добра сядзець у старой сядзібе, каля вагню, піць падагрэтае хатняе віно і чакаць старога сябра, які павінен заблукаць на размову.

Альбо стаяць за стойкай кавярні і глядзець навонкі, праз шкло, на мокрыя бліскучыя тратуары, на нешматлікія парасоны, якія праплываюць праз свядомасць і знікаюць недзе там, за яе скраем.

* * *

Матылёк падляцеў і сеў на мой кубачак, ён быў прыгожы незвычайнай прыгажосцю, вельмі старой і ўжо крыху пабляклай, але ў гэтым і было самае важнае.

Ён быў як з казкі і лётаў зусім па-іншаму, не так, як звычайныя матылі.

Было неістотна, ці гэта Леа, які сніць сябе матылём, ці проста матылёк, без аніякіх сноў, падваенняў і лабірынтаў.

Трэба любіць і шанаваць сваіх персанажаў, я прыгадаў словы Фэна і зразумеў, што ён меў на ўвазе і чаму.

* * *

Раптоўна падумалася, што, пражываючы нашыя жыцці, падлеглыя часу, мы не адхіляемся ад Быцця, ад Цэлага — а наадварот, ідзем яму насустрач.

Так, насустрач!

Быццё прыцягвае нас.

Мы прымаем форму, напачатку павольна, потым хутчэй і хутчэй.

Мы падаем насустрач быццю, імкліва і незваротна.

Адзіны момант, расцягнуты ў нашай свядомасці. Усяго толькі момант. Імгненне.

Невыпадковая кавярня, куды мы зайшлі на хвілінку.

Пастаяць у чарзе, з сябрамі і мілымі спадарожнікамі.

Пагаварыць з Леа. Пра маршруты і пра тое, да чаго ўсё імкнецца. Заснуць і абудзіцца.

Убачыць гэты свет нібыта ўпершыню, як цуд і магчымасць.

Выпіць кавы з каньяком. Ці тэкілай — каму як выпадае.

4.

Быць як струна, — запісаў Францішак у новым нататніку зялёнай асадкай.

Гатовым гучаць ва ўсялякі момант, калі *Яно* дакранаецца.

Быць як залаты яблык, што, нягледзячы на законы прыцягнення, узлятае ў нябёсы. Без дазволу і запрашэння, проста таму, што менавіта туды цягне.

* * *

І яшчэ.

Чым бліжэй да скраю, тым больш таямніцаў.

Змест

Літаратурна-мастацкае выданне

Ігар Бабкоў
ХВІЛІНКА
другая кніга

Дызайн вокладкі: Артур Вакараў

Выдавец “Logvino literatūros namai”
J. Savickio g. 4, LT-01108 Vilnius
Надрукавана ў ПВУП «Логвінаў»
пр-т Незалежнасці, 37а, 220030 Мінск